WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

27 СНЕЖНЯ 2011 г.
АЎТОРАК
№ 247
(27111)

Кошт 800 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

БЕЛАРУСЬ У НОВЫМ ГОДЗЕ ПАВІННА ВЫЙСЦІ НА БОЛЬШ ВЫСОКІЯ РУБЯЖЫ

БЕЛАРУСЬ у новым годзе павінна выйсці на больш высокія рубяжы, каб выканаць узятыя на IV Усебеларускім народным сходзе абавязацельствы. Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на цырымоніі ўручэння дзяржаўных узнагарод 26 снежня.

Сярод узнагароджаных — рабочыя розных спецыяльнасцяў, кіраўнікі прадпрыемстваў, дзеячы культуры і мастацтва, сферы адукацыі, ваеннаслужачыя, спартсмены, спецыялісты сферы абслугоўвання.

Кіраўнік дзяржавы сказаў, што прыемна завяршаць гэты вельмі нялёгкі год на такой аптымістычнай ноце, як урачыстае ўручэнне лепшым людзям краіны дзяржаўных узнагарод. «Вы заслужылі іх сваёй паспяховай працай, значнымі дасягненнямі ў розных сферах дзейнасці, талентам і шчырай любоўю да Айчыны», — сказаў Прэзідэнт, звяртаючыся да ўзнагароджаных. Пры гэтым кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што іх прыклад пераканаўча даказвае: чалавечая воля мацнейшая за акалічнасці, і любыя цяжкасці пераадольныя дзякуючы энергіі, мэтанакіраванасці і настойлівасці ў дасягненні намечанага.

Аляксандр Лукашэнка пазітыўна ацаніў дзейнасць дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў, група якіх таксама ўдастоена ўзнагарод. Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў: «З'яўляючыся прадстаўнікамі розных рэгіёнаў краіны, вы дзейнічалі зладжана і адказна, імкнуліся да канструктыўнага супрацоўніцтва і адыходзілі ад любых палітычных сварак. Поспех вашай работы шмат у чым быў звязаны менавіта з імкненнем да згоды і кансалідацыі сіл».

На думку Прэзідэнта, дэпутаты многае зрабілі для ўдасканалення прававой сістэмы, сацыяльнай палітыкі і абараназдольнасці краіны. Іх намаганні таксама садзейнічалі інтэграцыйным працэсам на постсавецкай прасторы і росту прэстыжу Беларусі на сусветнай арэне. «Няхай гэтыя высокія ўзнагароды стануць яшчэ адным пацвярджэннем вашага значнага ўкладу ў развіццё і ўмацаванне нашай дзяржавы», — пажадаў Аляксандр Лукашэнка.

Узнагароджваючы кіраўнікоў прадпрыемстваў, Прэзідэнт заявіў, што адыходзячы год быў для іх вельмі адказным. «Вашымі намаганнямі было дасягнута павышэнне якасных параметраў нашай эканомікі і яе эфектыўнасці», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

У ліку ўзнагароджаных таксама рабочыя і спецыялісты. У прыватнасці, гэта работнікі Баранавіцкага станкабудаўнічага завода (філіяла ЗАТ «Атлант») і ААТ «Агат — сістэмы кіравання».

Аляксандр Лукашэнка адзначыў важнасць не толькі вытворчых поспехаў, але і дасягненняў прадстаўнікоў сфер культуры, адукацыі і спорту.

Уручаючы дзяржузнагароды артыстам, дзеячам мастацтва, педагогам у знак глыбокай павагі і прызнання заслуг у справе творчасці і духоўнага развіцця, кіраўнік дзяржавы сказаў: «Да вас прыкавана грамадская ўвага, і вынікі вашай работы заўсёды бачны. Стварайце на карысць Радзімы, і няхай натхненне не пакіне вас».

Аляксандр Лукашэнка ўзнагародзіў таксама спартсменаў, прызёраў прэстыжных міжнародных спаборніцтваў па веласпорце.

Падзякі Прэзідэнта ўдастоены ваеннаслужачыя, члены зборнай каманды Службы бяспекі кіраўніка дзяржавы, якія паспяхова выступілі на чэмпіянаце свету сярод целаахоўнікаў у 2011 годзе.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў: «Вашы перамогі — перамогі Беларусі. Вы заслужылі прызнанне і ў нашай краіне, і далёка за межамі Беларусі. Дзякую вам за адданасць справе і ўменне ніколі не здавацца».

Прэзідэнт заўважыў, што сучаснае жыццё выстаўляе ўсё больш жорсткія патрабаванні да дальнабачнасці заканадаўцаў, прафесіяналізму кіраўнікоў, майстэрства работнікаў вытворчасці, духоўнага патэнцыялу дзеячаў культуры і мэтанакіраванасці спартсменаў. «Ваш вопыт паказвае, што ў кожнай прафесіі, у любой сферы можна дасягнуць поспехаў, калі падыходзіць да справы адказна і з душой», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка пажадаў усім новых дасягненняў, шчасця і дабрабыту.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Гаспадары

На зямлі фермера Рынга

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

УЛАДЗІМІР Рынг пачынаў сваю дарогу ў фермерства з 13 гектараў зямлі. Выхадныя праводзіў у полі каля вёскі Шастакі: не столькі сам вучыўся, колькі сыноў загартоўваў да цяжкай зямлеробчай працы. А праца прыносіла плён і радавала ўраджаямі.

Сёлета з плошчы амаль у 700 гектараў яны заклалі ў сховішча болей за 600 тон бульбы, каля 300 тон капусты і 120 тон буракоў. Засалілі 20 тон агуркоў. Па выніках мінулага года Рынгі атрымалі самы высокі ў раёне выхад валавой прадукцыі з аднаго гектара сельгасугодняў. Але тэмпы росту і за 11 месяцаў бягучага года ўражваюць яшчэ больш — яны складаюць болей за 190%. Напрыклад, сёлетні ўраджай бульбы — 300 цэнтнераў з гектара. За высокія ўраджаі гародніны ў адкрытым грунце фермерская гаспадарка Рынгаў выйшла пераможцам па Магілёўскай вобласці, пакінуўшы пасля сябе нават вядомыя калгасы і саўгасы.

НОРМЫ НА ЭЛЕКТРАЭНЕРГІЮ: ШТО НАМ СВЕЦІЦЬ?

ЯК стала вядома на мінулым тыдні, урад Беларусі ў 2012 годзе плануе ўвесці для насельніцтва дыферэнцаваныя тарыфы на аплату электраэнергіі ў залежнасці ад аб'ёму спажывання. Тым не менш, канчатковае рашэнне па гэтым пытанні яшчэ не прынята. Па падрабязнасці мы звярнуліся да начальніка ўпраўлення збыту энергіі ДВА «Белэнерга» Сяргея ШАБЕКІ.

Нарматыўныя дакументы яшчэ не прыняты, заявіў нам прадстаўнік «Белэнерга». Ён адзначыў, што на сёння насельніцтва спажывае каля 20% ад усяго электраспажывання ў нашай краіне. Тарыф для насельніцтва пакрывае толькі каля 40% сабекошту, што патрабуе перакрыжаванага субсідавання і ўскладнення дадатковых выдаткаў на прамысловыя прадпрыемствы, якія плацяць за сябе і часткова за насельніцтва. Тым самым мы зніжаем канкурэнтаздольнасць нашай прамысловай прадукцыі. Да таго ж цяпер, дзякуючы перакрыжаванаму субсідаванню, усе — і сем'і з нізкімі даходамі, і людзі з высокім узроўнем жыцця — атрымліваюць, па сутнасці, датацыі на электраэнергію. Гэта няправільна. Таму трэба прымаць захады, каб жылы сектар паступова выходзіў на аплату рэальнага кошту паслуг. Але, натуральна, гэта павінна адбывацца паралельна з ростам рэальных даходаў людзей. А сем'і, якія маюць патрэбу ў дзяржпадтрымцы, павінны атрымліваць адрасную сацыяльную дапамогу.

Урад у сувязі з гэтым разглядае розныя варыянты скарачэння датавання насельніцтва. У прыватнасці, павышэнне тарыфу як такога і ўсталяванне дыферэнцаванай аплаты ў залежнасці ад аб'ёмаў спажывання. Зараз ідзе пошук залатой сярэдзіны.

Асаблівую ўвагу пры ўвядзенні тарыфаў у залежнасці ад аб'ёмаў спажывання электраэнергіі прапануецца надаць найбольш неабароненым пластам насельніцтва, у тым ліку адзінокім грамадзянам, адзінокім пенсіянерам, грамадзянам-ільготнікам, шматдзетным сем'ям, дамам сямейнага тыпу. Маламаёмасныя сем'і, энергаспажыванне якіх перавышае прапанаваныя «льготныя» аб'ёмы, змогуць скарыстацца дзяржаўнай адрасной дапамогай (гл. Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 24 верасня 2009 года № 458, які прадугледжвае комплексную ацэнку бюджэту маламаёмасных грамадзян, з накіраваннем сродкаў адрасной дапамогі, у тым ліку на аплату жыллёва-камунальных паслуг).

Нагадваем, што плануецца ўвесці норму спажывання электраэнергіі на аднаго чалавека — 107 кВт/г, на двух чалавек — гэта яшчэ плюс 30 кВт/г, і гэтак далей на кожнага наступнага члена сям'і. Электраэнергія, якая будзе спажыта звыш гэтай нормы, будзе аплачвацца грамадзянамі па сабекошце.

— Колькі сярэдняя сям'я зараз спажывае электраэнергіі ў месяц?

— Гэта тое ж самае, што казаць аб сярэдняй тэмпературы па бальніцы. Аб'ём спажывання для кожнай сям'і вельмі індывідуальны. Ён вельмі залежыць ад насычанасці жылля электраабсталяваннем. У кагосьці, напрыклад, ёсць бойлер, кавараварка, пральная машына, электрычная духавая шафа, а ў кагосьці электрапрыбораў менш. Так што ўсё залежыць ад матэрыяльнага дастатку і ўкладу жыцця. Напрыклад, возьмем вялікі катэдж за горадам. Там большая асвятляльная нагрузка, калі ёсць цэнтральнае водазабеспячэнне-каналізацыя, то, значыць, маюцца цыркуляцыйныя помпы для падачы вады. Калі гаворка ідзе пра ацяпленне, плюсуем сюды кацёл і зноў жа цыркуляцыйную помпу, для таго, каб перамяшчалася цёплая вада па сістэме ацяплення і г.д.

Што тычыцца ўкладу жыцця, то я, напрыклад, працую з 8 да 18 гадзін, гэта значыць, практычна ўвесь светлавы дзень знаходжуся на працы. Адпаведна, усе справы па хаце раблю ўвечары. Таму ў мяне электраспажыванне будзе крыху вышэй у параўнанні з пенсіянерам, які можа рабіць частку бытавых спраў у дзённы час сутак.

СТАР 2

Грошы

КУРС ДОЛАРА Ў ПАЧАТКУ 2012 ГОДА — BR8-8,5 ТЫС.

ІНФАРМАЦЫЯ пра нібыта запланаваную ў Беларусі дэнамінацыю, распаўсюджаная асобнымі СМІ, з'яўляецца чыстай вады выдумкай. Яе з'яўленне трэба расцэньваць як грубейшую правакацыю. Такое меркаванне БЕЛТА выказала старшыня праўлення Нацыянальнага банка Беларусі Надзея Ермакова.

Кіраўнік Нацбанка запэўніла, што паведамленні пра нібыта запланаваную ў студзені 2012 года дэнамінацыю не маюць пад сабой ніякіх падстаў. Тым больш неверагоднымі яны выглядаюць пасля сённяшняй прэс-канферэнцыі Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі, на якой кіраўнік дзяржавы выразна абазначыў усе асноўныя перспектывы развіцця эканомікі краіны і грашова-крэдытнай палітыкі ў прыватнасці.

Інтэрнэт-рэсурсы, якія размясцілі «эксклюзіўныя» звесткі аб тым, што Беларусь нібыта заказала ў Літве новыя грашовыя купюры, спасылаюцца на нейкую крыніцу ў банкаўскіх колах. «Хутчэй за ўсё, ніякага эксперта і не было. Гэта выдумкі нячыстых на руку, непрафесійных журналістаў», — выказала меркаванне Надзея Ермакова. На яе думку, відавочна, што крыніца, якая паведаміла гэту «навіну», далёкая ад рэальных падзей, што адбываюцца ў Беларусі. Ёй нават не было вядома аб тым, што 23 снежня ўказам Прэзідэнта зацверджаны Асноўныя напрамкі грашова-крэдытнай палітыкі Беларусі на 2012 год.

Раней агучаны прагноз Нацбанка аб сярэднегадавым курсе долара ў наступным годзе ў памеры Br9150 за $1 — гэта песімістычны варыянт, адзначыла Надзея Ермакова. «Сёння курс значна ніжэйшы. І мы ўжо па разліках бачым, што дзесьці ён (долар. — Заўвага БЕЛТА) на ўзроўні Br8 — 8,5 тыс. будзе трымацца першы квартал адназначна, — сказала яна. — Потым усё будзе залежаць ад таго, як у нас будзе складвацца знешнегандлёвае сальда».

На развіццё валютнага рынку ў 2012 годзе будуць уплываць не толькі ўнутраныя, але і знешнія фактары. «Мы не можам быць ізаляваны ад знешняга свету, улічваючы нашу адкрытую эканоміку, — заявіла Надзея Ермакова. — Сусветны фінансавы крызіс будзе прадаўжацца год-два, не менш, пакуль не прыйдзе нейкі спакой, таму ўсё гэта на нас будзе адбівацца».

Адказваючы на пытанне, ці будуць расходвацца золатавалютныя рэзервы на падтрыманне курсу нацыянальнай валюты ў наступным годзе, кіраўнік Нацбанка расказала, што ўмяшанне ў працэсы курсаўтварэння будзе мінімальным. «Мы можам траціць на інтэрвенцыі і выкідваць валюту на валютны рынак толькі ў тым памеры, які ў нас ёсць звыш ЗВР, — сказала яна. — Золатавалютны запас — павінен быць увесь час у запасе, недакранальным. Паказвалі, што золата ўбывае. Яно не ўбывае, мы, наадварот, золата набываем, каб дыверсіфікаваць нашы валютныя рызыкі».

Надзея Ермакова таксама дадала, што кожны беларус павінен сам вырашаць, у якой валюце захоўваць свае ўклады ў наступным годзе. «Раіць — справа няўдзячная, кожны павінен самастойна прымаць рашэнне. Я захоўваю ў беларускіх з-за высокай стаўкі», — рэзюмавала старшыня праўлення Нацбанка.

Кіраўнік Нацбанка адзначыла, што сістэма льготнага крэдытавання жыллёвага будаўніцтва захаваецца, аднак зменяцца катэгорыі грамадзян, якім будуць прадастаўляць льготныя крэдыты. «Стане больш жорсткім падыход, каго крэдытаваць і каму даваць ільготны крэдыт, змяншаецца і сума такіх крэдытаў — яна складзе (у наступным годзе. — Заўвага БЕЛТА) каля Br7 трлн», — расказала Надзея Ермакова.

Паводле яе слоў, у гэтым годзе льготнае крэдытаванне будаўніцтва жылля прадоўжыцца. «Усе тыя крэдытныя дагаворы, якія заключаны, будуць выкананы банкамі, усё будзе закрэдытавана», — рэзюмавала яна.

Як паведамлялася, у Беларусі ў 2012 годзе будзе пабудавана 4,2 млн кв. м жылля, у тым ліку 2,3 млн кв. м — з дзяржпадтрымкай. Чакаецца, што кошт 1 кв. м пры будаўніцтве жылля з дзяржпадтрымкай у наступным годзе складзе Br3,6 млн. Прэтэндаваць на дзяржпадтрымку змогуць у асноўным неабароненыя катэгорыі грамадзян (шматдзетныя сем'і, малазабяспечаныя грамадзяне і тыя, хто доўгі час стаіць у чарзе тых, каму неабходна паляпшэнне жыллёвых умоў). Новыя ўмовы льготнага крэдытавання пры будаўніцтве жылля будуць вызначаны ў бліжэйшы час указам кіраўніка дзяржавы, які ўжо падрыхтаваны і знаходзіцца на разглядзе ў Адміністрацыі Прэзідэнта.

ГРОШЫ Ў АКНО

Калінкавіцкі індывідуальны прадпрымальнік яшчэ ўвосень паабяцаў двум жыхарам Мазыра, што ўстановіць ім новыя вокны ПВХ. Прайшло некалькі месяцаў, і грамадзяне зразумелі, што махляр з грашыма знік. Яны напісалі заяву ў міліцыю. Па той жа схеме «працаваў» яшчэ адзін ашуканец-прадпрымальнік, і зноў з Калінкавіч, які заключыў з аднымі дамову на вокны, з другімі — на мэблю. Узяў каля Br3 млн і адбыў у невядомым напрамку. У прэс-службе УУС Гомельскага аблвыканкама расказалі і пра двух прыватных прадпрымальнікаў з Гомеля, якія «развялі» грамадзян аналагічным чынам.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Павіншуйце
Вашых партнёраў
з Новым годам і Калядамі!
Сэрвіс друку
НАВАГОДНІХ
фірменных ПАШТОВАК
InterPrint.by
офіс (017) 298 41 68
МТС (029) 775 57 18
ООО «ТЦ СНАМІ» УНП 100705382
Мабільныя тэлефоны SNAMI® SNAMI.BY

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, установленыя НБ РБ з 27.12.2011 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	8 380,00	1 чэшская крона	423,85
1 еўра	10 960,00	1 польскі злоты	2 466,34
1 латвійскі лат	15 713,48	1 расійскі рубель	268,00
1 літоўскі літ	3 171,00	1 украінская грыўня	1 044,24

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ

USD	31,2266
10 UAH	38,9117
10000 BYR	37,2632
EUR	40,7632

Надвор'е

У НАВАГОДНЮЮ НОЧ КРЫХУ ПАДМАРОЗІЦЬ, А МЕСЦАМІ НЕВЯЛІКІ СНЕГ

АПОШНІ месяц года стаў для Беларусі не па сезоне анамальна цёплым. Нават 27 снежня прагназуюцца невялікія дажджы, а на большай частцы тэрыторыі краіны — узмацненне ветру парывамі да 15—20 м/с, паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.

Увогуле, у самы цёплы дзень тыдня — у аўторак — будзе мінімальная тэмпература паветра ўначы ад 0 градусаў на ўсходзе і да плюс 7 на захадзе краіны, максімальная ўдзень ажно 6—11 цяпла.

У сераду стане крыху халадней. Будзе пераважна без ападкаў, толькі ўначы па поўдні краіны кароткачасовыя ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. Вецер заходні 5—10 м/с, уначы па паўночным усходзе парывы да 15—20 м/с. Тэмпература паветра на працягу сутак ад мінус 1 да плюс 5 градусаў.

Месцамі невялікія ападкі (мокры снег і дождж) прагназуюцца і ў чацвер. У асобных раёнах туман і слабы галалёд. Уначы і раніцай месцамі на дарогах галалёдзіца. Вецер будзе ўжо паўднёвы і паўднёва-заходні 4—9 м/с, удзень парывамі да 14 м/с. Тэмпература паветра ўначы ад мінус 2 да плюс 3, на ўсходзе да 5 марозу, удзень ад 0 да 5 цяпла.

У пятніцу ўдзень кароткачасовы мокры снег і дождж чакаецца амаль паўсюдна на тэрыторыі Беларусі. Слабы галалёд, на асобных участках дарог галалёдзіца. Тэмпература паветра на працягу сутак ад мінус 3 да плюс 3 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў, у суботу 31 снежня атмасферныя франты прынясуць да нас мокры снег. На дарогах галалёдзіца. Уначы ўжо падмарозіць да 0 — мінус 5 градусаў, удзень будзе каля 0. У навагоднюю ноч месцамі чакаецца кароткачасовы снег. На дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра 1 студзеня на працягу сутак — ад мінус 5 да плюс 2 градусаў. Уначы на святы на поўначы краіны пры праясненнях да 7—9 марозу. У Мінску ў навагоднюю ноч чакаецца мінус 2—4 градусы і невялікі снег.

Сяргей КУРКАЧ.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

КОЛЬКАСЦЬ НАСЕЛЬНІЦТВА БЕЛАРУСІ НА 1 СНЕЖНЯ — 9 МЛН 466 ТЫС. ЧАЛАВЕК

Паводле аператыўных звестак, колькасць насельніцтва Беларусі на 1 снежня 2011 года склала 9 млн 466 тыс. чалавек, паведаміла БЕЛТА прэс-сакратар Нацыянальнага статыстычнага камітэта Алена КАНДРАЦЕНКА.

У параўнанні з 1 студзеня гэтага года жыхароў краіны стала менш на 15,2 тыс. чалавек. Колькасць жыхароў за 11 месяцаў гэтага года павялічылася толькі ў Мінску — з 1 млн 864,1 тыс. чалавек на 1 студзеня да 1 млн 882,7 тыс. чалавек на 1 снежня. У астатніх рэгіёнах рэспублікі колькасць жыхароў за студзень—лістапад зменшылася. У выніку на 1 снежня ў Гомельскай вобласці налічвалася 1 млн 430,2 тыс. чалавек, у Мінскай — 1 млн 404,4 тыс., у Брэсцкай — 1 млн 391,8 тыс., у Віцебскай — 1 млн 214 , 4 тыс., у Магілёўскай — 1 млн 80,7 тыс., у Гродзенскай — 1 млн 61,8 тыс. чалавек.

У Беларусі ў студзені—лістападзе гэтага года нарадзілася 99 тыс. 955 дзяцей — на 963 дзіцяці больш у параўнанні са студзенем—лістападам 2010 года. Агульны каэфіцыент нараджальнасці за 11 месяцаў у цэлым па рэспубліцы склаў 11,5 на 1 тыс. жыхароў (за аналагічны мінулагодні перыяд было 11,4 праміле). Сярод рэгіёнаў краіны самы высокі гэты паказчык традыцыйна ў Брэсцкай вобласці (12,7 праміле), самы нізкі — у Віцебскай вобласці (10,1).

НА ВОЗЕРЫ ВЫРАТАВАЛІ ПЕНСІЯНЕРКУ

Жыхарка вёскі Язна Мёрскага раёна пачула заклікі аб дапамозе, якія даносіліся з мясцовага возера. Патэлефанавала выратавальнікам: тоне чалавек.

Адбылося гэта каля паловы восьмай вечара. На месцы работнікі МНС за 15 метраў ад берага ў трыснягу ўбачылі жанчыну, якая прасіла дапамогі. Трэба сказаць, што глыбіня вадаёма ў гэтым месцы складала паўтара метра, лёду не было. Скарыстаўшы спецыяльны касцюм і выратавальную вяроўку, жанчыну выцягнулі з вады. Пасля агляду работнікамі хуткай медыцынскай дапамогі пацярпелая з дыягназам «агульнае пераахаладжэнне» была дастаўлена ў бальніцу Дзісны. Стан яе быў сярэдняй цяжкасці. Выратаваная была пенсіянеркай, яна пражывае ў вёсцы Язна. Прычыны знаходжання жанчыны на вадаёме высвятляюцца.

ЕЛКІ — ПАД АХОВУ!

Лясгасамі краіны ўзмоцнена ахова ляснога фонду ад незаконнага высякання дрэў. На дарогах каля лясных масіваў разам з ДАІ арганізаваныя 323 кантрольныя пасты.

Як паведамілі ў прэс-службе Міністэрства лясной гаспадаркі, рэгулярна праводзяцца рэйдавыя мерапрыемствы. За мінулы тыдзень дзяржаўнай лясной аховай праведзена 319 такіх рэйдаў, за незаконную высечку дрэў да адказнасці прыцягнута 13 парушальнікаў. На іх складзены адміністрацыйныя пратаколы.

Сяргей РАСОЛЬКА.

НАГУЛЯЎСЯ І ЗАСНУЎ...

Слесар ЖКГ з Лунінца так нагуляўся ў більярд, што заснуў каля більярднага стала ў бары «Міраж». Пакуль хлопец спаў, яго кішэні нехта «пачысціў» — выцягнуў 515 долараў.

Следча-аператыўная група прыехала з сабакам, які і вывеў міліцыянераў на злодзея — беспрацоўнага з Лунінца.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

НІ ПРАВОЎ, НІ ВІЗЫ, НІ ГРОШАЙ

У Пінску 43-гадовая кабета «прадавала» пасведчанні на кіраванне аўтамабілем, шэнгенскія візы. Прынамсі, яна давала запаўняць анкеты, брала грошы, а потым знікала. У яе махлярскія сеткі трапілі як мінімум пяцёра аматараў атрымаць правы без навучання і візы без клопату. Жанчыне перадалі больш за 10 мільёнаў рублёў. Калі адзін з пацярпелых звярнуўся ў міліцыю, махлярку затрымалі. Для аператыўнікаў яна аказалася старой знаёмай: тройчы была асуджана за падобныя махінацыі.

Яна СВЕТАВА.

АБАКРАЛА ДЗІЦЯ

З кватэры гамяльчанкі раптам зніклі рэчы, прызначаныя для немаўляці: канверт для нованароджанага, бутэлечка для дзіцячага харчавання, прадукты, мыла, пялюшкі і іншае. Як высветліла міліцыя, 21-гадовая грамадзянка, якая звярнулася ў міліцыю, на працягу папярэдняга дня ўжывала спіртныя напоі разам з 33-гадовай раней судзімай «сяброўкай». Менавіта тая і скрала дзіцячыя рэчы.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ВЫПІЛІ...

Прадпрымальнік з Гродна жыве ў кватэры сястры ў доме па вул. 40 гадоў Кастрычніка, што ў Івацэвічах.

47-гадовы мужчына кінуўся ў міліцыю, калі не знайшоў 25 тыс. долараў, якія трымаў у кватэры. Аператыўная група правяла следства і выйшла на 36-гадовую беспрацоўную, якая выпівала разам з прадпрымальнікам і ўкрала тыя долары. Жанчыну затрымалі.

Сымон СВІСТУНОВІЧ, Яна СВЕТАВА.

МАШЫНА «ЎЛЯЦЕЛА» Ў СЦЯНУ КРАМЫ

Такое здарэнне адбылося праз некалькі хвілін пасля апоўначы ў Бабруйску.

Як потым высветлілася, кіроўца аўтамабіля «Фальксваген-Пасат» не справіўся з кіраваннем, машына з'ехала з праезнай часткі і ў «лоб» сутыкнулася са сцяной крамы «ОМА». У выніку здарэння заціснутымі на пярэдніх сядзеннях аказаліся кіроўца і пасажыр. Абодва — жыхары горада. Вызваляць іх з салона давялося выратавальнікам. Мужчыны з траўмамі рознай ступені цяжкасці былі шпіталізаваны ў Бабруйскую цэнтральную бальніцу. У аўтамабілі знаходзіліся яшчэ два пасажыры, якія здолелі самастойна выбрацца з салона. Будынак крамы атрымаў нязначныя пашкоджанні.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Навіны Беларусі і замежжа ў рэжыме on-line на сайце «Звязды» — www.zviazda.by

ОБЪЯВЛЕНИЕ ОБ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГАХ

Наименование (описание) имущества и его стоимость	Лот № 1. Компрессор М 155-1 стоимостью 602 000 рублей. Лот № 2. Стенд для испытания форсунок М-106 стоимостью 2 114 000 рублей. Лот № 3. Пульсар сварочный полуавтомат VOLTMEISTER 200 стоимостью 658 000 рублей. Лот № 4. Стенд для балансировки колес ЛС1-1 стоимостью 10 918 000 рублей. Лот № 5. Установка для диагностики и ультразвуковой очистки форсунок CNC 602A стоимостью 6 104 000 рублей.
Собственник (владелец) имущества	ЧУП «Туринг-Авто» УНП 390455409
Местонахождение (адрес) имущества	г.п. Шарковщина, ул. Красная Горка, 30
Место (адрес), дата и время проведения торгов	Интернет-портал хозяйственных судов Республики Беларусь http://court.by/sales/ с 9 часов 00 минут 23.01.2012 г. по 18 часов 00 минут 01.02.2012 г.
Справочная информация об организаторе торгов	Хозяйственный суд Витебской области 210101, г. Витебск, ул. «Правды», д. 32, каб. 321, http://vitebsk.court.by/ Судебный исполнитель Зуев Михаил Евгеньевич, тел./факс (80212) 49 13 43, (8 044) 734 93 00, старший судебный исполнитель Бородулин Алексей Александрович, тел. (80212) 49 13 40 (8044) 746 73 00.
Условия и порядок проведения торгов	Лицо, желающее принять участие в электронных торгах, в течение 15 дней со дня, следующего за днем размещения публичного извещения об электронных торгах на интернет-портале хозяйственных судов Республики Беларусь, обязано пройти регистрацию. Для регистрации на сайте лицо знакомится с порядком проведения торгов, дает подписку об отсутствии препятствий для участия в торгах в соответствии со статьей 384 ХПК, перечисляет задаток в размере 10 % от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет хозяйственного суда Витебской области № 3642903000023 в 201 филиале ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Витебск, код 259, УНН 300007670, не позднее 10.01.2012 г. и заполняет заявление. Более подробную информацию можно получить на сайте ВХС http://court.by/ vitebsk/divestiture/, http://court.by/sales/.

Чытацкая рада «Звязды»

21 СНЕЖНЯ была змешчана анкета для чытачоў. Мы прапанавалі адказаць на шэраг пытанняў, папрасілі выказаць заўвагі і парады — каб у новым, 2012 годзе, «Звязда» стала яшчэ больш цікавай, надзённай, запатрабаванай.

На адрас газеты ўжо пачалі паступаць меркаванні чытачоў. Ніводнае з іх не застанецца па-за ўвагай рэдакцыі.

«ВЫПІСАЎ ГАЗЕТУ І НА НАСТУПНЫ ГОД»

Без перапынкаў з'яўляюся падпісчыкам і чытачом «Звязды». Выпісаў яе і на наступны год. Калі раней працаваў у мядзельскай раённай газеце «Нарачанская зара», з'яўляўся грамадскім карэспандэнтам, дасылаў у «Звязду» фотаздымкі, інфармацыю з жыцця раёна.

Цяпер мне 87 гадоў, і я, на жаль, не магу бываць у розных мясцінах...

Што хацелася б, каб на старонках «Звязды» друкавалася: міжнародныя агляды; фельетоны; куток сатыры і гумару (на канкрэтныя падзеі і асоб); агляды раённых і гарадскіх газет; каб у раёнах, як і раней, былі грамадскія карэспандэнты; рубрыка «Пісьмы чытачоў».

Пажадана: менш змяшчаць інфармацыі пра забойствы, пажары, аварыі і інш.; называць (пасля суда) імя злачынцы, каб пра яго ведалі знаёмыя, землякі, — можа, тады іншыя падумалі б, ці варта ісці на злачынства; «Самоуправление» замяніць на «Самакіраванне».

Блізіцца Новы год. Жадаю ўсім супрацоўнікам і чытачам «Звязды», іх родным і сябрам выдатнага здароўя, шчасця, радасці, бадзёрасці, поспехаў ва ўсіх справах, сямейнай згоды, аўтарытэту ў чытачоў.

Няхай і надалей «Звязда» будзе папулярнай і жаданай і ў горадзе, і ў вёсцы, у многіх сем'ях.

Прапаную, каб у летнія месяцы калектыў «Звязды» зрабіў падарожжа ў адно з маляўнічых мясцін Беларусі — на Нарачанскія азёры. У час падарожжа шмат цікавага можа расказаць звяздовец Леанід Лахманенка, які калісьці працаваў у рэдакцыі мядзельскай раённай газеты. Экскурсаводы Нарачанскага нацыянальнага парку валодаюць багатымі звесткамі пра наш азёрны край!

Міхаіл ЧАРНЯЎСКІ.

СТЫПЕНДЫІ ПРЭЗІДЭНТА БЕЛАРУСІ НА 2012 ГОД НАЗНАЧАНЫ 92 ТАЛЕНАВІТЫМ МАЛАДЫМ ВУЧОНЫМ

Адпаведнае распараджэнне падпісаў кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка.

Сярод лаўрэатаў 7 дактароў навук, 59 кандыдатаў навук, 26 маладых вучоных без ступені. У іх ліку 24 прадстаўнікі тэхнічных навук, 19 — медыцынскіх навук, 35 — прыродазнаўчых навук і 14 прадстаўнікоў гуманітарных навук.

У групу стыпендыятаў уключаны перспектыўныя даследчыкі, якія праявілі сябе як актыўныя ўдзельнікі шэрагу важных навуковых праектаў і атрымалі вынікі, маючыя істотнае навуковае і практычнае значэнне.

Напрыклад, па выніках даследаванняў Наталлі Каноплі ў клінічную практыку лячэбных устаноў Саюзнай дзяржавы ўкаранёны новы шматкампанентны метад лячэння злаякаснай пухліны мозгу ў дзяцей, які павышае іх выжывальнасць на 22 працэнты.

Вынікі даследавання Дзмітрыя Шалковага выкарыстоўваюцца ў праграме па пошуку новых часціц у пратон-пратонных сутыкненнях на Вялікім адронным калайдары (ЦЕРН, Жэнева, Швейцарыя).

Распрацаваны Яўгенам Баранышыным бескантактны метад вызначэння памеру часціц сажы выкарыстаны пры стварэнні прамысловай устаноўкі па вытворчасці тэхнічнага вугляроду (кошт кантракта — $1,5 млн).

У адпаведнасці з даручэннем кіраўніка дзяржавы ацэнка дасягненняў таленавітых маладых вучоных і іх укладу ў сацыяльна-эканамічнае развіццё краіны праведзена па адзіных крытэрыях незалежна ад наяўнасці ў іх вучоных ступеняў. Для ўсіх стыпендыятаў устаноўлены аднолькавы памер узнагароды — Br2 млн у месяц.

Падпісанне гэтага распараджэння з'яўляецца сведчаннем пастаяннай падтрымкі маладых вучоных з боку дзяржавы.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

«КНІЖКІ Ў ШТОНІКАХ»: дзяцінства з кніжкай — шчаслівае дзяцінства

ЧАМУ СУЧАСНЫЯ ДЗЕЦІ не цягнуцца да кнігі? Як прывіць дзіцяці любоў да чытання? Што трэба зрабіць, каб зносіны з мастацкай літаратурай ператварыліся ў жыццёвую патрэбу для падрастаючага пакалення? Якімі кніжкамі можна зацікавіць сучасных дзяцей і падлеткаў? Адказ на гэтыя пытанні паспрабуюць знайсці ўдзельнікі першай у Беларусі выставы-кірмашу дзіцячай літаратуры «Кніжкі ў штонiках», якая адкрываецца сёння ў сталічным Палацы мастацтваў.

Асноўная задача, якую ставяць перад сабой арганізатары выставы, гэта прыцягненне шырокай увагі грамадскасці да дзіцячай кнігі, менавіта таму ў мерапрыемствах форуму будуць задзейнічаны педагогі і дзіцячыя псіхолагі, пісьменнікі і работнікі бібліятэк, мастакі і артысты. Літаральна кожны дзень (а выстава будзе доўжыцца да 5 студзеня ўключна) яе наведнікаў чакаюць літаратурныя «вячоркі» з дзіцячымі пісьменнікамі. Супрацоўнікі бібліятэк падзеляцца сваім досведам прывабліванння дзяцей і падлеткаў да кнігі.

На 2 студзеня запланавана правядзенне семінара па прапагандзе беларускай літаратуры «Чытаючыя дзеці — чытаючая нацыя», а 4 студзеня пройдзе факультатыў для бацькоў «Чытайце дзецям кнігі, а не натацыі...»

Мастакі-ілюстратары правядуць у рамках выставы майстар-класы па маляванні на шарах і выразанні з паперы, навучаць, як маляваць карыкатуры і рабіць калажы. На спецыяльнай гульнявой пляцоўцы малыя змогуць паўдзельнічаць у роспісе папяровых дамкоў. Акрамя таго, увазе дзяцей і іх бацькоў будуць прадстаўлены тэатральныя, лялечныя і калядныя прадстаўленні. Усяго ў праграме выставы-кірмашу запланавана каля 40 мерапрыемстваў.

Але самым галоўным гаспадаром на выставе будзе, несумненна, кніга. Яе экспазіцыю складзе прадукцыя як беларускіх, так і расійскіх выдавецтваў. Актыўны ўдзел возьмуць рэдакцыі дзіцячых часопісаў і газет, кнігагандлёвыя арганізацыі і пісьменніцкія аб'яднанні. Найбуйнейшымі экспанентамі выступаюць ААТ «Белкніга» і выдавецтва Беларускага Экзархата, якія прадставяць самы шырокі выбар дзіцячай літаратуры. У наведнікаў будзе магчымасць не проста пазнаёміцца з навінкамі беларускіх і вядучых расійскіх выдавецтваў, але і набыць іх па мінімальным кошце. Таксама на выставе будуць прадстаўлены і дыскі з апошнімі версіямі навучальных і развіццёвых гульняў і праграм.

Першая ў Беларусі спецыялізаваная выстава-кірмаш «Кніжкі ў штонiках» арганізавана пры падтрымцы Мінгарвыканкама і Міністэрства інфармацыі. Напярэдадні адкрыцця выставы журналіст «Звязды» задала некалькі пытанняў **начальніку ўпраўлення выдавецкай дзейнасці і кніжнага гандлю Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь Алене ПАЎЛАВАЙ.**

— Алена Савельеўна, наколькі прыбытковы ці, наадварот, стратны сёння для беларускіх выдавецтваў выпуск дзіцячай літаратуры? І якімі накладамі выходзяць дзіцячыя кнігі?

— У 2010 годзе беларускімі выдавецтвамі было выпушчана больш як 1150 найменняў літаратуры для дзяцей і падлеткаў агульным накладам 8 мільёнаў асобнікаў. Зразумела, пасля зніжэння чытацкага попыту на кнігу знізіліся і наклады. Прычым гэтая тэндэнцыя прасочваецца не толькі ў Беларусі, але і ў нашых суседзяў — у Расіі і ва Украіне. Зараз сярэдні наклад дзіцячых кніг вагаецца ад адной да трох тысяч асобнікаў. А пры невялікіх накладах і кошт кнігі выходзіць значна вышэйшы. Менавіта таму выпуск дзіцячай літаратуры, асабліва беларускамоўнай, праблематычны без дзяржаўнай падтрымкі. Для прыкладу, датацыі на выпуск дзіцячай літаратуры на беларускай мове даходзяць да 70 працэнтаў ад яе сабекошту. Увогуле план сацыяльна значнай літаратуры, якая выпускаецца з дзяржаўнай падтрымкай, напалову складаецца з мастацкіх, даведачных, пазнавальных кніг для дзяцей і юнацтва.

Выпускам дзіцячай літаратуры на беларускай мове вельмі паспяхова займаюцца выдавецтва «Мастацкая літаратура» і рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Літаратура і Мастацтва». У «ЛіМа» палова плана — гэта выпуск дзіцячай літаратуры. Актыўна займаецца выпускам літаратуры для дзяцей і Мінская фабрыка каляровага друку, а таксама выдавецтва Беларускага Экзархата. Прадукцыя фабрыкі каляровага друку хоць і рускамоўная, тым не менш гэта творы беларускіх пісьменнікаў. З прыватных выдавецтваў хацелася б адзначыць «Кніжны дом», «Харвест» і «Сказ». Апошняе выдавецтва спецыялізуецца на выпуску маленькіх кніжачак для самых юных чытачоў.

— Пэўны час таму бацькі скардзіліся на дэфіцыт айчыннай навукова-пазнавальнай літаратуры для дзяцей, бо цэны на аналагічную расійскую прадукцыю моцна «кусаліся»...

— Гэта і сапраўды быў істотны прабел у рабоце нашых кнігавыдаўцоў, але сітуацыя пачала пакрысе выпраўляцца. У прыватнасці, выдавецтвы «Беларуская энцыклапедыя», «Мастацкая літаратура», «ЛіМ», «Народная асвета» пачалі выпускаць цудоўныя серыі пазнавальнай літаратуры для дзяцей, прычым на беларускай мове: «Усім пра ўсё», «Чытаем разам», «Зямля мая» і гэтак далей. Яны запатрабаваныя чытачом, іх заўсёды чакаюць у кнігарнях і бібліятэках. Мы пастаянна нацэльваем беларускія выдавецтвы: трэба выдаваць больш літаратуры для дзяцей, больш увагі надаваць яе мастацкаму афармленню. Не трэба вынаходзіць веласіпед — дастаткова зайсці ў кніжную краму і паглядзець, як шырока прадстаўлена там прадукцыя расійскіх выдавецтваў. Якія цікавыя дзіцячыя энцыклапедыі прапануюцца пакупнікам! Ёсць і яшчэ адна праблема — дэфіцыт аўтараў, якія могуць пісаць для дзяцей. Таму дзіцячай літаратуры востра патрабуюцца новыя імёны...

Надзея НІКАЛАЕВА.

Час работы выставы:

27—30 снежня, 2—4 студзеня —	*з 10.00 да 19.00*
31 снежня і 5 студзеня —	*з 10.00 да 15.00*
1 студзеня —	выхадны дзень.

ГАРЭЛА САНІТАРНАЯ БОЙНЯ

Раніцай у нядзелю загарэўся будынак санітарнай бойні ПУП «Жлобінская птушкафабрыка», прызначаны для ліквідацыі хворай птушкі. Як паведамілі ў прэс-службе Гомельскага абласнога ўпраўлення МНС, полымя ахапіла шыферны дах цаглянай пабудовы, здадзенай у 1960 годзе. На момант узнікнення пажару персаналу не было. У выніку агнём знішчаны шыферны дах і часткова — столевае перакрыцце. Паўгадзіны спатрэбілася выратавальнікам, каб затушыць полымя. Найбольш верагоднай прычынай яны называюць кароткае замыканне.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

НОРМЫ НА ЭЛЕКТРАЭНЕРГІЮ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Ці будзе ўлічвацца ў нормах спажывання электраэнергіі тое, што частка кватэр у жылым сектары абсталяваная электраплітамі?

— Вядома, існуе розніца ў электраспажыванні, якая залежыць ад выкарыстання электраплітаў. Цяпер гэта ўлічваецца ў тарыфе: для такіх кватэр усталяваны меншы тарыф. Было б лагічна ўвесці для такіх кватэр і большую норму.

— Тры гады таму ў краіне была ўведзена дыферэнцаваная аплата за электраэнергію ў залежнасці ад часу сутак. Наколькі яна «працуе»?

— Пераход на дыферэнцаваныя тарыфы магчымы пры наяўнасці электроннага прыбора ўліку, які фіксуе час і аб'ём спажывання электраэнергіі за пэўны перыяд. На працягу апошніх 6-7 гадоў такімі лічыльнікамі аснашчалася новае жыллё. Таксама кожны можа набыць такі прыбор індывідуальна і ўсталяваць з дапамогай спецыялістаў энергазабяспечвальнай арганізацыі. Усяго аднафазнымі электроннымі прыборамі на сёння абсталявана каля 9% кватэр (індывідуальных дамоў).

Калі ў 2010 годзе доля кампенсацыі насельніцтвам кошту жыллёва-камунальных паслуг складала 30%, то па стане на 1 снежня гэтага года — усяго 22,2%. Бюджэт 2012 года звярстаны такім чынам, каб узровень кампенсацыі кошту паслуг ЖКГ насельніцтвам да канца года складаў не менш за 35%.

БУДЗЬ У КУРСЕ

Тарыф, рублёў за 1 кВт/г

Электраэнергія ў жылых дамах (кватэрах), абсталяваных электраплітамі:	
1) аднастаўчны тарыф	202,6
2) дыферэнцаваны тарыф па часовых перыядах:	
мінімальных нагрузак (з 22.00 да 17.00)	141,8
максімальных нагрузак (з 17.00 да 22.00)	405,2
Электраэнергія ў жылых дамах (кватэрах), абсталяваных газавымі плітамі:	
1) аднастаўчны тарыф	238,5
2) дыферэнцаваны тарыф па часовых перыядах:	
мінімальных нагрузак (з 22.00 да 17.00)	167,0
максімальных нагрузак (з 17.00 да 22.00)	477,0

— Колькі каштуе электронны прыбор уліку электраэнергіі і наколькі хутка ён акупляецца?

— Кошт яго складае ў сярэднім каля 500 тысяч бел. руб. Мы ацэньваем, што калі сям'я з 4-5 чалавек спажывае ад 400 кВт за месяц і вышэй, то гэты прыбор уліку можа акупіцца на працягу года-двух.

Святлана БУСЬКО.

Спорт-тайм

«Дынама» ўсухую абыграла лідара КХЛ

Сталічнае «Дынама» працягвае хатнюю серыю ў чэмпіянаце КХЛ. Мінчане разгромілі, прычым усухую, лідара сёлетняга турніра піцерскі СКА. Упершыню ў сезоне гэтаму клубу не ўдалося закінуць супернiку ніводнай шайбы.

У кожным перыядзе дынамаўцы закідвалі супернiку па адной шайбе. На 17-й хвіліне матча лік адкрыў абаронца Яраслаў Обшут. На 24-й хвіліне Аляксандр Паўловіч падвоіў перавагу мінчан — 2:0. А пераможная кропка была пастаўлена ў канцы трэцяга перыяду, калі піцерцы замянілі варатара на шостага палявога гульца — 3:0.

Трэнер СКА Мілаш Ржыга не прызвычаіўся прайграваць:

— У «Дынама» практычна не было добрых момантаў, мы самі сабе забілі два галы. Нашы гульцы стваралі небяспечныя сітуацыі, аднак не рэалізоўвалі іх. То штанга замест гола, то Арцюхін не гатовы...

А вось Марэк Сікора быў задаволены:

— Супраць лідара КХЛ амаль не трэба настройвацца. Я задаволены. Апошнім часам па ходу матча выдзяляюцца то чэхі, то канадцы, але сёння мы гулялі як адна каманда. Дзякуй гульцам, гэта выдатны падарунак на Каляды. Сёння на арэне была адметная атмасфера, мяркую, Мілашу таксама спадабалася гуляць.

Герасіменя і Селімаў — лепшыя

У 53-ці раз «Спартыўная панарама» падвяла вынікі апытання на званне лепшага спартсмена і спартсменкі 2011 года. Сёлета ў ім удзельнічала рэкордная колькасць спартыўных журналістаў — 138. Самае дзіўнае, што першыя шэсць пазіцый аказаліся за прадстаўніцамі прыгожай паловы чалавецтва, найбольшую суму балаў з якіх набрала плыўчыха Аляксандра Герасіменя. На чэмпіянаце свету ў Шанхаі яна стварыла сапраўдную сенсацыю, выйграўшы самую прэстыжную дыстанцыю — 100 метраў вольным стылем. Трапіўшы ў фінал з горшым, восьмым вынікам і стартаваўшы па 8-й, нязручнай дарожцы, Аляксандра паказала залатыя секунды — 53, 45!

Другое месца заняла цяжкаатлетка Настасся Новікава, якая ўпершыню ў кар'еры выйграла чэмпіянат свету. Тройку лідараў замкнула Дар'я Домрачава, якая выйграла серабро чэмпіянату свету ў мас-старце. Чацвёртым нумарам журналісты назвалі тэнісістку Вікторыю Азаранку. На пятым радку размясцілася велагоншчыца Вольга Панарына, якая на чэмпіянаце свету выйграла гіт на 500 метраў. Шостае месца аддадзена каралеве акадэмічнага веславання Кацярыне Карстэн, якая выйграла серабро чэмпіянату свету. Беларускі барэц грэка-рымскага стыля Алім Селімаў на чэмпіянаце свету заваяваў золата і стаў лепшым спартсменам 2011 г. Побач з ім размясціўся барэц-вольнік Аляксей Шамараў, які на тым жа чэмпіянаце свету стаў чэмпіёнам у прэстыжнай вагавай катэгорыі — да 120 кг. Дзявятую суму ў апытанні заняў тэнісіст Максім Мірны, а замкнула дзясятку лёгкаатлетка Надзея Астапчук, якая ў штурханні ядра на сёлетнім чэмпіянаце свету заваявала сярэбраны медаль.

Алена АЎЧЫННІКАВА.

Крымінал, здарэнні

НАЧНАЯ ПАЕЗДКА Ў КРАМУ

У Бабруйску 26 снежня, пяццю хвілінамі пазней поўначы, 36-гадовы гараджанін на аўтамабілі «Фальксваген Пасат» на вуліцы Арлоўскага не выбраў бяспечную хуткасць руху, не справіўся з кіраваннем і ўехаў... у будынак крамы. Вадзіцель і тры яго пасажыры атрымалі траўмы рознай ступені цяжару.

Увогуле за святочныя выхадныя дні на дарогах Магілёўскай вобласці адбыліся ДТЗ, у якіх два чалавекі загінулі і яшчэ некалькі атрымалі траўмы. Як паведаміла Магілёўская ДАІ, 25 снежня ўвечары ў Кіраўскім раёне 21-гадовы вадзіцель на «Аўдзі-6» паблізу вёскі Букіна пайшоў на абгон «МАЗа» і наехаў на 89-гадовую жанчыну, якая пераходзіла ў той момант дарогу. Бабулю ад удару выкінула на прычэп «МАЗа», і яна памерла на месцы.

Уначы 26 снежня ў Асіповіцкім раёне аўтобус, якім кіраваў 44-гадовы жыхар Украіны, наехаў на 33-гадовага веласіпедыста. Вясковец ехаў на веласіпедзе па паласе руху аўтобуса ў сустрэчным кірунку, і ў выніку сутыкнення атрымаў смяротную траўму. У гэтым і папярэднім выпадку ні пешаход, ні веласіпедыст не мелі флікераў.

У Шклоўскім раёне ўвечары 24 снежня аўтамабіль збіў пешахода. У вёсцы Новыя Чамаданы «Форд Эскорт» наехаў на мужчыну, які стаяў ля краю дарогі, і яго з траўмамі даставілі ў раённую бальніцу. А за рулём аўтамабіля знаходзіўся, як высветлілася, 23-гадовы шкловец, які быў раней пазбаўлены вадзіцельскага пасведчання.

Ілона ІВАНОВА.

«ЗМЕНА» ЦАНОЮ Ў ЖЫЦЦЁ

У бытоўцы ПМК-26 «Палессежылбуда», якая знаходзілася ў паўночным мікрараёне Брэста, ноччу ўспыхнуў пажар.

Дым убачыў вартаўнік, ён выклікаў МНС. Пасля таго, як выратавальнікі ўтаймавалі полымя, былі знойдзены абгарэлыя целы двух рабочых. Пазней высветлілася, што будаўнікі, аднаму з якіх крыху за 20, другому — трохі за 30, напярэдадні атрымалі зарплату, прыхапілі пасля работы спіртное і накіраваліся ў бытавы вагончык. Дома яны папярэдзілі, што застаюцца на «начную змену». Далейшыя дэталі інцыдэнту высвятляе следства. У абаіх засталіся малыя дзеці. Заведзена крымінальная справа.

Яна СВЕТАВА.

ЗАЗЯВАЎСЯ І...

На чыгуначнай станцыі Аранчыцы 61-гадовы жыхар Мінска зазяваўся і трапіў пад хуткі цягнік «Парыж—Масква». Пенсіянер загінуў.

КАЛІ ЛЁД ТОНКІ

Беспрацоўны з Івацэвічаў пайшоў на возера Аброўскае лавіць рыбу. Лёду практычна яшчэ няма, але 47-гадовага мужчыну пацягнула на зімовую рыбалку, і тонкі лёд не вытрымаў. Чалавек утапіўся.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Минский городской центр недвижимости

Извещение о проведении 09.01.2012 повторного открытого аукциона (торгов) по продаже имущества ОАО «Минский фарфоровый завод»

Предмет торгов (наименование (назначение) и характеристики продаваемого имущества)	Производственный корпус № 3 (производственное помещение) общей площадью 3230,8 кв.м, инвентарный номер 500/D-707995487
Местонахождение предмета торгов	г. Минск, ул. Кропоткина, 91, пом. 2
Собственник (продавец)	ОАО «Минский фарфоровый завод», ул. Кропоткина, 91, 220030, г. Минск
Организатор аукциона	УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к.10, 220030, г. Минск
Начальная цена предмета торгов без НДС	4 336 155 000 белорусских рублей
Сумма задатка	433 615 500 белорусских рублей

Торги проводятся в соответствии с порядком проведения аукциона по продаже имущества ОАО «Минский фарфоровый завод», утвержденным организатором аукциона. К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявку на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона; копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица, а также при необходимости иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет № 3012104971019 в региональной дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, получатель – УП «Минский городской центр недвижимости», УНП 190398583 в срок по 05.01.2012 включительно до 13.00.

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый предмет торгов. Наивысшая цена фиксируется в протоколе о результатах аукциона и не включает НДС. Минимальная величина первого шага составляет пять процентов начальной цены предмета торгов.

В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)», возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется победителем торгов (покупателем).

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение 7 рабочих дней с даты проведения аукциона.

Аукцион состоится **09 января 2012 года в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Документы на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с **28.12.2011 по 04.01.2012** в рабочее время (обед с 13.00 до 14.00), а также **05.01.2012** с 9.00 до 13.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. Документы, поданные после указанного срока, не рассматриваются.

Телефоны для справок:
(017) 227 48 36 – УП «Минский городской центр недвижимости»;
(029) 386 39 40 – ОАО «Минский фарфоровый завод».

ДЛЯ СВЕДЕНИЯ КРЕДИТОРОВ

ОАО «Приднепровье» проводит уменьшение Уставного фонда в связи с аннулированием акций в размере 14940 штук в соответствии с действующим законодательством. Новый размер Уставного фонда составляет 46442 штуки акций на сумму 55730400 рублей.

Претензии принимаются в срок до 23 января 2012 года.

УНП 400315195

Управляющий в производстве по делу о банкротстве ОДО «Террастройпроект-плюс» г. Мозырь проводит торги по продаже недвижимого имущества

№ лота	Наименование объекта	Характеристика объекта	Оценочная стоимость (руб.)	Стартовая цена (руб.)	Сумма залога (руб.)
1.	Здание контрольно-пропускного пункта 1968 года постройки	Одноэтажное, кирпичное, ж/б фундамент, общая площадь 219 м.кв., площадь земельного участка 0,051 га	142 500 000	142 500 000	14 000 000

Организатор торгов: управляющий.

Торги проводятся в форме открытого аукциона без условий.

Сумма залога: до 10% от начальной цены на р/с № 3012410630013 в «Приорбанк» ОАО ЦБУ 401 г. Мозырь, БИК 153001749, получатель ОДО «Террастройпроект-плюс», УНП 490322936.

Победителем торгов признается участник, предложивший наибольшую цену покупки.

В случае признания торгов несостоявшимися в связи с подачей заявления на участие только одним участником, возможна продажа предмета торгов этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Форма, порядок оплаты: одноразовый безналичный платеж на расчетный счет продавца.

Документы, предоставляемые для участия в торгах: заявление на участие, копии платежных документов, подтверждающих внесение залога, копию устава, доверенность представителю юридического лица, паспорт физическому лицу.

Торги состоятся **2 февраля 2012 года** в 12.00 по адресу: Гомельская область, г. Мозырь, пер. 1-ый Интернациональный, д. 27.

Заявки принимаются до 12.00 **1 февраля 2012 года** по адресу: Гомельская область, г. Мозырь, пер. 1-ый Интернациональный, д. 27.

Справки по телефону: 8 029 663 84 96.

ПРОФЕССОРСКО-КОНСУЛЬТАЦИОННЫЙ ЦЕНТР

учреждения образования "Белорусский государственный медицинский университет" оказывает медицинские услуги на платной основе гражданам Республики Беларусь и иностранным гражданам.

Консультации проводит профессорско-преподавательский состав университета - высококвалифицированные врачи высшей и первой категорий по следующим специальностям:

- акушерство и гинекология;
- дерматология и венерология;
- детская хирургия;
- инфекционные болезни;
- кардиология;
- неврология и нейрохирургия;
- онкология;
- оториноларингология;
- офтальмология;
- педиатрия;
- психиатрия и психотерапия;
- ревматология;
- терапия;
- травматология и ортопедия;
- урология, андрология;
- физиотерапия;
- фтизиатрия;
- функциональная диагностика;
- хирургия;
- челюстно-лицевая хирургия;
- эндокринология.

Консультации проходят на клинических базах университета по адресам: г. Минск, ул. Есенина, 21, и ул. Семашко, 10.

Предварительная запись по телефонам:

МТС +37529-700-90-70,
+37529-700-90-80;
Velcom +37544-500-90-70
+37544-500-90-80

с 9:00 до 20:00,

Л.№02040/4633, 25.04.2007-30.04.2012 Минздравом РБ

КПУП «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) ИЗВЕЩАЕТ О СНЯТИИ ЛОТА № 3 ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА, проводимого 30 декабря 2011 года – Продавец: Открытое акционерное общество «Мозырьдрев»

Станок ленточный MG-6500 (инв. № 6107)	72 816 000	**Начальная цена продажи с НДС, бел. руб., 102 096 000**	**Задаток с НДС, бел. руб., 10 000 000**
Станок заточной MG 225-50 С-3 (инв. № 6108)	24 672 000		
Приспособление разводное (разводка зубьев ленточных пил) (инв. № 6109)	4 608 000		

по решению ОАО «Мозырьдрев»

Дополнительная информация по телефонам организатора аукциона: 8 (0232) 74 17 34, 74 89 64 и на сайте gomeloblreklama.by

Прэс-рэліз

Новы інтэрактыўны партал Usebelarusy.by: ВЫВУЧАЕМ, ВАНДРУЕМ, ПІШАМ ПРА БЕЛАРУСЬ І БЕЛАРУСАЎ РАЗАМ!

20 снежня адкрыўся інтэрактыўны партал Usebelarusy.by.

Гэта першы ўсебеларускі партал, аўтарам якога можа стаць кожны. Партал створаны ў межах праекта «Дакраніся да вытокаў» і з'яўляецца партнёрскім для шэрагу грамадскіх аб'яднанняў, ведамасных структур, прыватных кампаній. ААТ «Бабушкіна крынка» выступае галоўным карпаратыўным партнёрам партала.



Usebelarusy.by стаў платформай для аб'яднання публіцыстычнай, краязнаўчай, навукова-папулярнай інфармацыі пра Беларусь і беларусаў. Гэтая інфармацыя сёння шырока прадстаўлена ў шматлікіх разрозненых праектах: навукова-папулярных выданнях, у сродках масавай інфармацыі, на мноства інтэрнэт-сайтах, якія з'яўляюцца распаўсюджанай ініцыятывай, афіцыйных сайтах. На новым партале можна будзе знайсці самыя цікавыя матэрыялы, тое, аб чым пішуць самі беларусы і аб беларусах: паходжанне беларусаў, беларускі фальклор, беларускія традыцыі, міфы, абрады, легенды, біяграфіі і інфармацыю аб гістарычных падзеях і вядомых людзях, гістарычных мясцінах, турыстычных аб'ектах, прыродзе, культуры і сучасных культурных падзеях.

Usebelarusy.by — жывы арганізм. На гэтым web-рэсурсе мы, беларусы, будзем разам ствараць кантэнт у рэжыме online. Самае важнае, што адрознівае партал, — гэта яго інтэрактыўнасць. Ён створаны па методыцы сацыяльнага маркетынгу ўцягвання. Гэта значыць, што кожны ахвотнік можа стаць яго сааўтарам. Ва ўсім свеце актыўна развіваецца такая форма народнай журналістыкі.

Кожны з вас ужо можа даслаць рэдактару свае гісторыі аб продках і сучасніках, маляўнічых мясцінах, аповеды, фота, відэа, музыку, песні, вершы, прысвечаныя Беларусі.

Інфармацыя на сайце будзе прадстаўлена на першым этапе на беларускай мове. У будучыні сайт плануе прадставіць старонкі на рускай, англійскай і іншых мовах.

У вас ёсць магчымасць прыняць удзел у віктарыне «Карта памяці. Прайдзі тэст, Беларусь!» і зразумець, ці досыць мы ведаем пра нашы вытокі.

Развіццё ідэі праекта, яго каардынацыя ажыццяўляецца кампаніяй Satio.

Давайце разам пісаць пра Беларусь і беларусаў. Давайце адкрыем нас свету.

Usebelarusy.by — СТВОРАНЫ ДЛЯ НАС І ПРА НАС

УНП 190438641.

Краіна моцная рэгіёнамі: Пінскі раён

«НЯГЛЕДЗЯЧЫ НА ПРАБЛЕМЫ, У НАС ПРАКТЫЧНА Ў КОЖНАЙ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРЦЫ НЕШТА БУДУЕЦЦА»

Аб тым, што гэта за праблемы, карэспандэнту «Звязды» распавёў старшыня Пінскага райвыканкама Валерый РАБКАВЕЦ

— Валерый Васільевіч, Пінскаму раёну пашчасціла трапіць у дзяржпраграму развіцця Прыпяцкага Палесся на 2010—2015 гады. Але, напэўна, я ведаю, радасць была нядоўгай?..

— Можна сказаць і так. Фінансаванне гэтай праграмы сёння прыпынена па ўсіх накірунках. І гэты факт нас вельмі хвалюе. Справа ў тым, што на сродкі, прадугледжаныя дзяржаўнай праграмай, у раёне распачата будаўніцтва 10 малочнатаварных фермаў. 8 з іх гатовы на 80%: яшчэ крыху — і яны пачнуць даваць грашовую аддачу. Але, на жаль, вось ужо больш як тры месяцы мы не можам разлічыцца з будаўнічымі арганізацыямі. Толькі па гэтых праектах маем запазычанасць каля 50 млрд. Сур'ёзныя даўгі вісяць і за работы, выкананыя на аб'ектах сацыяльнай сферы — у школах, дамах культуры і г.д.

— Вы хочаце сказаць, што нічога не застаецца, як звярнуць распачатае будаўніцтва?

— Мы не можам дапусціць гэтага, не маем права спыніць будаўніцтва распачатых аб'ектаў. Інакш іх у момант расцягнуць — і плакалі, як гаворыцца, укладзеныя мільярды. Будаўнічыя арганізацыі раёна разумеюць гэта. І нават нягледзячы на тое, што ўзровень зарплаты ў будаўнічым комплексе сур'ёзна ўпаў і выплачваюць яе будаўнікам апошнім часам са спазненнем, працягваюць працаваць. Практычна ў кожнай сельскай гаспадарцы ў нас нешта будуецца. Мы за гэта ім вельмі ўдзячныя. І спадзяёмся, што на вышэйшым узроўні будзе прынята разумнае рашэнне.

— А колькі ўсяго грошай паспелі ўкласці ў развіццё раёна з моманту прыняцця праграмы?

— Мы дастаткова актыўна будавалі аб'екты, выконвалі работы па развіцці сацыяльнай сферы. За 11 месяцаў асвоілі каля 317 млрд. Што амаль у два разы перавышае планы, якія былі перад намі пастаўлены. А зараз, атрымліваецца, апынуліся своеасаблівымі заложнікамі сітуацыі. Яшчэ ў сакавіку адправілі свае прапановы па змяненні праграмы развіцця Прыпяцкага Палесся, але да гэтага дня Указ не прыняты... Не ведаю, на якім узроўні гэта тармозіцца, але, безумоўна, не на раённым.

— А што можаце сказаць пра меліяраваныя землі? Ці плануецца ў свеце апошніх падзей уразаць фінансаванне на іх аднаўленне і выкарыстанне?

— Сёлета аб'ёмы фінансавання на гэтыя мэты былі зменшаны, але нязначна. Як будзе далей, невядома. Ад нас тут таксама мала што залежыць. Скажу адно: эканоміць на меліярацыі Палесся недапушчальна. Калі не будзе нармальна працаваць сістэма каналаў, насосных станцый, то пра якія ўраджаі можа ісці гаворка? Мы сёлета мелі непрыемны прыклад. Гаспадарка «Валішча», што на мяжы Іванцэвіцкага раёна, не змагла ўбраць збожжа. Бо ў сувязі з дажджамі ўзровень вады падняўся настолькі, што тэхніка проста не заехала на поле. Вось вам яскравы доказ таго, наколькі важная на Палессі меліярацыя.

— Валерый Васільевіч, як вядома, Піншчына — сельскагаспадарчы рэгіён. Што зроблена ў апошні час для паляпшэння ўзроўню жыцця на вёсцы?

— Пінскі раён — адзін з буйных раёнаў рэспублікі. Але, тым не менш, мы паспелі пабудаваць толькі 11 аграгарадкоў. Гэта столькі ж, колькі і ў меншых па тэрыторыі суседніх Ганцавіцкім, Ляхавіцкім і Жабінкаўскім раёнах. Планавалі за кошт праграмы развіцця Прыпяцкага Палесся гэта адставанне кампенсаваць. Але, як я ўжо казаў, фінансаванне прыпынена.

— Скажыце, а наколькі актыўна развіваецца бізнэс у аграгарадках?

— Што тычыцца бізнэсу, то ён актыўна развіваецца ў прыгарадах, буйных населеных пунктах накшталт Лагішына, Пінкавічаў. Там, дзе ёсць высокакваліфікаваная працоўная сіла, інфраструктура, дзе побач аўтамабільная траса праходзіць або чыгунка. У тых жа аграгарадках, якія знаходзяцца на адлегласці ад горада, з прадпрымальніцтвам даволі сур'ёзная праблема. І не таму, што ўлады ставяць палкі ў колы, не. Наадварот, мы ідзём насустрач: практычна дарам, за базавую велічыню, аддаём пустуючыя будынкі. Але прадпрымальныя людзі прыводзяць свае небеспадстаўныя аргументы — арганізоўваць вытворчасць за 40 кіламетраў ад горада нерэнтабельна.

— Наколькі вытворчыя прадпрыемствы раёна зацікаўлены ў замежных інвестыцыях?

— Мы не ўпускаем замежных інвестараў з поля зроку. Але акцэнт робім на сваіх мясцовых бізнэсменах. Гэта звязана, у першую чаргу, з тым, што прыязджых людзей вельмі складана прывязаць да канкрэтнага месца. Іх цікавіць выключна прыбытак.

На тэрыторыі раёна знаходзяцца такія асноўныя холдынгі, як «Пінскдрэў», «Дэметра», «ЭкаМілк» і «Медтэхніка». Іх узначальваюць дастойныя людзі — усе яны выхадцы з гэтай зямлі, на якой стараюцца пакінуць і свой след. Яны актыўна ідуць з раённымі ўладамі на супрацоўніцтва, укладаюць грошы ў развіццё раёна: будуюць тут базы адпачынку, аказваюць спонсарскую дапамогу дзіцячым садкам, школам. Я перакананы, што іншаземец, якога нічога тут не трымае, сказаў бы, што яму гэта не трэба.

— Не будзем заглядваць далёка наперад. Якім вы, Валерый Васільевіч, бачыце развіццё раёна ў 2012 годзе?

— Галоўны гонар Піншчыны — гэта, несумненна, людзі. Ад працалюбства і прадпрымальнасці якіх і залежаць высокія эканамічныя паказчыкі раёна. Таму мне б вельмі хацелася, каб сельскі жыхар у нас жыў заўтра лепш, чым жыве сёння. Каб у кожнай вёсачцы раёна людзі імкнуліся заставацца працаваць і нараджаць дзетак. А для гэтага трэба павышаць зарплату і ў цэлым узровень жыцця вясковага насельніцтва. Працягваць будаваць аграгарадкі, адкрываць крамы, кавярні, праводзіць капітальны рамонт бальніц, школ, дзіцячых садкоў, рамантаваць дарогі, пракладаць каналізацыю, праводзіць газ. Па меры магчымасці робім і будзем працягваць гэта рабіць.

Надзея ДРЫЛА.



Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

«Арыентуем прадпрыемствы раёна на імпартазамяшчэнне»

У той час, як у цэлым па краіне імпарт перавышае экспарт, Піншчына сёлета змагла забяспечыць станоўчае сальда знешняга гандлю. У гэтым вялікая заслуга прадпрыемстваў раёна, якія актывізавалі работу па імпартазамяшчэнні. Пра шляхі эканоміі валютных сродкаў і нарошчвання экспарту размаўляем з намеснікам старшыні Пінскага райвыканкама па эканоміцы і фінансах Ігарам БРЫЛЕВІЧАМ.

Так, калі раней, да прыкладу, даільныя ўстаноўкі завозіліся з-за мяжы, то зараз вытворцы сельскагаспадарчага абсталявання «Дэметра» і «ЭкаМілк» забяспечваюць імі практычна ўсю рэспубліку. У агульным аб'ёме вытворчасці гэтых прадпрыемстваў імпартазамяшчэнне набліжаецца да 80 %.

— Яшчэ адзін накірунак імпартазамяшчэння, які мы ў раёне падтрымліваем і развіваем, — гэта садаводства, — распавядае Ігар Максімавіч. — Не сакрэт, што на рынку, асабліва ў міжсезонне, вельмі шмат імпартных яблык. І гэта не таму, што яны ў нас вырошчваюцца ў недастатковай колькасці, а таму, што мы іх не ўмеем захоўваць. Зараз у раёне тры дастатковa буйныя фермерскія гаспадаркі, якія спецыялізуюцца на садаводстве. Сёлета адна з іх самастойна, без дзяржаўнай падтрымкі пабудавала сучаснае сховішча. Гэта дазволіць фермеру скласці канкурэнцыю прывазным яблыкам на айчынным рынку.

У якасці прыкладу імпартазамяшчэння можна прывесці і Пінскі вінаробны завод. Гэта першае прадпрыемства ў рэспубліцы, якое занялося вінаградарствам на прамысловай аснове.

Што тычыцца экспарту, то асноўным экспарцёрам на Піншчыне з'яўляецца зверагаспадарка. Расшырэнне вытворчых магутнасцяў гэтай гаспадаркі, якое адбудзецца ў наступным годзе, дазволіць як мінімум у два разы павялічыць аб'ём экспарту. Праграма развіцця Прыпяцкага Палесся прадугледжвае і праект пашырэння пасадачных плошчаў журавін і буякоў ААТ «Палескія журавіны». Праўда, выдзяляць альбо не запланаваныя на гэтыя мэты сродкі, пакуль невядома.

— Запатрабаваны ў плане экспарту паслуг і рэспубліканскі санаторый «Ясельда» для ветэранаў вайны і працы і інвалідаў, — дадаў Ігар Брылевіч. — Я ўпэўнены: калі б гэта прадпрыемства вывелі з сацыяльнага статуса (што ў нашай дзяржаве быць не можа), то гэтае выдатнае для адпачынку месца, без сумненняў, акупляла б само сябе.

Раён, паводле слоў Ігара Максімавіча, не жыве сённяшнім днём. Вядзецца актыўная распрацоўка новых прыбытковых праектаў.

У прыватнасці, у планах арганізаваць новую вытворчасць па вырабе камбікармоў і дабавак да камбікармоў, якія сёння завозяцца з Польшчы. Таксама распрацаваны праект арганізацыі на Пінскім вінаробным заводзе вытворчасці каньякоў.

— Разглядаем таксама пытанне і павелічэння аб'ёмаў вытворчасці на Гарадзішчанскай мэблевай фабрыцы, — кажа намеснік старшыні райвыканкама. — З гэтым разлікам ужо пачалі будаваць паблізу чыгункі лагістычны цэнтр па адгрузцы мэблі на экспарт.

Грандыёзныя дасягненні і планы і ў рыбгаса «Палессе». Летась пасля сур'ёзнай рэканструкцыі сажалак рыбгас упершыню пачаў адгружаць таварнага адборнага карпа на экспарт у Расію і Прыбалтыку.

— Я не чакаў, што расяне будуць у нас набываць карпа, бо маюць дастатковую колькасць сваёй такой рыбы, — прызнаўся Ігар Максімавіч. — Але, тым не менш, наш карп за мяжой карыстаецца павышаным попытам. Акрамя таго, у гэтым годзе завяршылі рэканструкцыю цэха перапрацоўкі. Сёння рыбгас можа вырабляць з рыбы наборы для юшкі, філе, катлеты, палачкі, фарш і інш.

У планах — пабудаваць замкнутае водазабеспячэнне па вытворчасці рыб асятровых парод. Асноўная прадукцыя, на якую рабілі стаўку падчас распрацоўкі праекта, — гэта чорная ікра, якая, сапраўды, зможа даваць раёну значную экспартную выручку.

— Нават дагавор ужо быў заключаны з ізраільскай фірмай, — распавядае Ігар Брылевіч. — Але мы зноў такі сутыкнуліся з недахопам фінансаў у сувязі з прыпыненнем праграмы развіцця Прыпяцкага Палесся. Цяпер вымушаны шукаць іншыя шляхі рэалізацыі гэтага праекта.

Надзея ДРЫЛА.

ПАШПАРТ ПІНСКАГА РАЁНА

Размешчаны на поўдні Брэсцкай вобласці. Мяжуе з Лунінецкім, Столінскім, Іванаўскім, Іванцэвіцкім, Ганцавіцкім і Зарэчнянскім (Украіна) раёнамі. На плошчы Пінскі раён займае другое месца ў рэспубліцы. Ён адміністрацыйна падзелены на 1 пасялковы і 24 сельскія Саветы, у склад якіх уваходзіць 181 населены пункт. Насельніцтва раёна складае 50,1 тысячы чалавек.

Глеба сельскагаспадарчых угоддзяў у асноўным дзярнова-падзолістая і тарфяна-балотная. 14 % зямель знаходзіцца пад балотамі, 27,4 % — пад былымі балотамі, асушанымі ў 1967-77 гадах. Што датычыцца карысных выкапняў, то гэта торф, сыравіна для цэглы, мел і будаўнічы пясок. З мінеральных глеб пераважаюць супясчаныя, суглінкавыя і пясчаныя. Па тэрыторыі раёна працякае 19 рэк, Днепра-Бугскі і Агінскі каналы. Таксама тут 8 азёр. Лясы пераважна хвойныя і займаюць 32 % тэрыторыі раёна.

Па тэрыторыі раёна праходзяць чыгунка Брэст—Пінск—Калінкавічы, аўтамабільныя дарогі Брэст—Гомель, Брэст—Пінск—Лунінец, Іванцэвічы—Лагішын—Пінск—Столін, Ганцавічы—Пінск. Сярод выдатных мясцін Піншчыны — народны музей Аляксандра Блока ў вёсцы Лапаціна, музей Яўгеніі Янішчыц і музей «Сядзіба палешука XIX стагоддзя» ў Парэччы, музей Якуба Коласа ў Пінкавічах.

ПЕДАГОГІ ЁСЦЬ — ВУЧНЯЎ МАЛА

Той факт, што ў вёсцы зачыняюцца школы, ужо нікога не здзіўляе. Сітуацыя прыкладна аднолькавая па ўсёй краіне. Здараецца, што ў нейкай базавай школе на аднаго вучня прыпадае адзін настаўнік.

У мінулым месяцы пісаў, што ў вёсцы Сваятычы Ляхавіцкага раёна ўзнікла праблема — недахоп вучняў у мясцовай школе. Калі я наведаў Піншчыну, то ўбачыў, што і там сітуацыя ў некаторых вясковых школах не лепшая. І тут галоўнае, як праблема вырашаецца.

Пачнём з кадравага пытання. У раёне 82 навучальныя ўстановы, у якіх працуе 1302 педагогі. З іх у сістэме школьнай адукацыі — 988 чалавек, з якіх амаль 86 працэнтаў маюць вышэйшую адукацыю, і колькасць такіх настаўнікаў павялічваецца. Павышаецца і кваліфікацыя педагогаў: доля настаўнікаў з вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыяй вырасла з 13 працэнтаў у 2006 годзе да амаль 18 працэнтаў у 2011 годзе.

Начальнік аддзела адукацыі Валянціна БЯГЕБА.

А як складваецца сітуацыя з маладымі спецыялістамі? З 2007 года па сёлетні ў раён прыехала 145 выпускнікоў, прычым не з'явіўся на працу 41 спецыяліст. Галоўнымі прычынамі тут з'яўляецца перапраразмеркаванне маладых спецыялістаў у іншыя раёны, служба ў войску, паступленне ў іншыя навучальныя ўстановы. Вакантныя месцы, што адкрываюцца ў сістэме адукацыі раёна, запаўняюць спецыялісты, якія ўладкоўваюцца на працу самастойна, а таксама пенсіянеры. Пасля адпрацоўкі абавязковага тэрміну ў раёне засталіся працаваць 116 маладых педагогаў. Адзначу, што ў параўнанні з іншымі структурамі (напрыклад, сельскай гаспадаркай), дзе цякучасць маладых спецыялістаў дасягае 70 працэнтаў, сітуацыю ў аддзеле адукацыі раёна можна лічыць нармальнай. Лепш затрымліваюцца ў школах ураджэнцы раёна, тыя, хто вярнуўся на працу ў родныя мясціны.

Безумоўна, на бягучасць кадраў уплываюць розныя фактары — напрыклад, адсутнасць жылля. Ды і зарплата накладвае свой адбітак на сітуацыю. Памер сярэдняга заробку ў сістэме адукацыі сёлета склаў 1094,8 тысячы, а ў педагогаў — 1364,1 тысячы рублёў. У адным раёне дырэктар базавай школы паведаміла, што прыходзіцца трымаць бычкоў і апрацоўваць гектар зямлі, каб дапамагаць дзецям-студэнтам. Такая наша рэчаіснасць.

189 педагогаў, якія падпарадкоўваюцца Пінскаму раённаму аддзелу адукацыі, жывуць у горадзе, а працуюць на вёсцы. Я не лічу, што гэта нейкая асаблівасць. І з іншых гарадоў і райцэнтраў вобласці настаўнікі ездзяць на працу ў вясковыя школы. Тут не важна дзе педагог жыве, а важна, наколькі ён кваліфікаваны. Напрыклад, з тых 189 педагогаў амаль 27 працэнтаў маюць вышэйшую кваліфікацыйную катэгорыю.

Калі з педагогамі сітуацыя больш ці менш стабільная, то з вучнямі праблема.

У Пінскім раёне самая нізкая па вобласці сярэдняя напаўняльнасць класаў — прыкладна 10 вучняў. А сёлета прыйшлося закрыць дзве базавыя школы.

— А што адбываецца з вучнямі і педагогамі пасля закрыцця школы? — пытаюся ў **начальніка аддзела адукацыі Пінскага райвыканкама Валянціны БЯГЕБА.**

— Базавыя школы па вёсках прыходзіцца закрываць. У гэтым годзе зачынілі дзверы Дубойская і Грыўковіцкая базавыя школы. Сумна, але, калі ў школе на 10 педагогаў прыпадае 14 вучняў, іншага выйсця няма. Школы закрываюцца, але педагогі не застаюцца без працы. Напрыклад, настаўнікі вышэйназваных школ ужо ў маі ведалі, дзе ў верасні будуць працаваць.

— А калі педагог мае жыллё, як яму пераехаць на новае месца працы?

— Тыя, хто застаўся, ездзяць на працу ў суседнюю школу разам з вучнямі. Дарэчы, падвозку вучняў і дашкольнікаў забяспечваюць 26 аўтобусаў. Падкрэсліваю, што працягласць усіх маршрутаў, па якіх кожны дзень праязджаюць аўтобусы з вучнямі, больш за 3,5 тысячы кіламетраў. Ажыццяўляецца падвоз 893 вучняў, гэта амаль пятая частка ад усёй колькасці навучэнцаў раёна. І ва ўстановы дашкольнай адукацыі падвозяцца 540 дзяцей. Зыходзячы з гэтага, у раёне ўзнікла неабходнасць павелічэння колькасці транспарту для падвозу, трэба не дапускаць зрыву падвозу з-за пазапланавага рамонту аўтобусаў.

— А што з будынкамі школ? Вокны дошкамі забілі...

— Калі закрываецца школа, то ліквідуецца юрыдычная асоба, а збудаванне школы выстаўляецца на аўкцыён. Вось адну школу прадаём за 40 мільёнаў рублёў, другую ўзяў у арэнду прадпрымальнік, а іншую прыходзіцца разбіраць. Дзейнічаем, зыходзячы з рэальнай сітуацыі.

— Валянціна Канстанцінаўна, існуе праблема з харчаваннем дзяцей. Каб дзеці атрымлівалі паўнавартаснае харчаванне, неабходна павялічыць яго кошт. Як у вашым раёне складваецца сітуацыя?

— Сёння павялічыўся кошт сыравіны для прыгатавання ежы, і таму стала праблематычна ў межах устаноўленых грашовых нормаў прыгатаваць для вучня абед, але пры гэтым вытрымаць рэкамендацыйны аб'ём страў. Безумоўна, праблема існуе, і адным са шляхоў зняцця яе вастрыні з'яўляецца прыцягненне ўстаноў адукацыі для нарыхтоўкі сельгаспрадукцыі. Але толькі гэтым захадам праблему не вырашыць. Неабходна павялічыць грашовыя нормы расходаў на харчаванне.

— Я ведаю, што ў многіх школах і дзіцячых садках бацькі даплачваюць грошы на абеды сваіх дзяцей. Але не ўсе бацькі на гэта ідуць.

— Такая праблема ёсць. Здараецца, што нехта не хоча даплачваць.

— І што тады? Дзеці селі абедаць, і раптам аднаму з іх не далі соку?

— Да такога, думаю, не даходзіць, бо выхавацель падзеліць той сок на ўсіх. Так ці інакш, знойдзе выйсце са становішча. Тут галоўнае — правесці працу з бацькамі. Яны даплачваюць за харчаванне свайго дзіцяці.

— Існуе яшчэ адна праблема — гэта калі бацькоў пазбаўляюць бацькоўскіх правоў. Якая сітуацыя ў раёне з сацыяльна праблемнымі сем'ямі?

— Дзецям з праблемных сем'яў выдзяляюцца грошы на набыццё школьных прылад, спартыўна-вучнёўскай формы, для аздараўлення. Сёлета 122 праблемныя сям'і атрымалі дапамогу на 26,7 мільёна рублёў. У раёне пражывае 156 абавязаных асоб, але з іх за 9 месяцаў 2011 года ўдалося атрымаць толькі 49 працэнтаў ад устаноўленага кампенсавання. У некаторых СВК абавязаныя асобы, якія злоўжываюць алкаголем, кадзіруюцца за кошт прадпрыемства. А больш за 14 працэнтаў абавязаных асоб неаднаразова праходзілі курс лячэння ад алкаголю, знаходзіліся ў ЛПП.

Разам з тым, неабходна адзначыць, што ў апошнія гады зніжаецца колькасць асоб, пазбаўленых бацькоўскіх правоў. Калі ў 2008 годзе іх было 26, то ў 2009-м — 17, у 2010-м — 14, а сёлета толькі 7 такіх бацькоў. 37 дзяцей знаходзяцца ў 19 прыёмных сем'ях, 61 дзіця — у апякунскіх. А ў двух дзіцячых дамах сямейнага тыпу (у вёсках Малатковічы і Юзэфіны) выхоўваецца 17 дзяцей.

Ёсць у раённым аддзеле адукацыі і свае напрацоўкі. Напрыклад, колькасць выпускнікоў сярэдніх школ, якія працягваюць вучыцца далей, сёлета дасягнула 96 працэнтаў. Была б для іх затым праца. (Колькі ад бацькоў даводзіцца чуць нараканняў: маўляў, дзіця вучылася, вучылася, а працу па спецыяльнасці знайсці нельга.)

Мала закончыць сярэднюю школу, каледж ці ўніверсітэт. Галоўнае — знайсці апору ў жыцці, а гэта не заўсёды ўдаецца.

Сымон СВІСТУНОВІЧ. Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

«МЫ ЛЮБІМ НАШЫХ ПАЦЫЕНТАЎ — ВОСЬ ЯНЫ ДА НАС І ВЯРТАЮЦЦА»

ПАЖЫЛЫЯ людзі, каб аднавіць сілы і паправіць здароўе, з задавальненнем едуць у вёску Почапава. Менавіта там, за 10 кіламетраў ад Пінска, у акружэнні калматых елак, стройных бярозак ды векавых дубоў месціцца рэспубліканскі санаторый для ветэранаў вайны, працы і інвалідаў «Ясельда». Чыстае паветра палескіх балот, штучныя вадаёмы і маляўнічыя рака Піна непадалёку ад дагледжаных карпусоў — такое адчуванне, нібыта сама прырода стварыла ў гэтым куточку спрыяльныя ўмовы для адпачынку і аздараўлення.

Індывідуальны падыход да кожнага пацыента

Санаторый «Ясельда» спецыялізуецца на лячэнні захворванняў апорна-рухальнага апарату і страўнікава-кішачнага тракта. Але людзі ва ўзросце, як вядома, акрамя асноўных, маюць яшчэ і цэлы букет спадарожных балячак. Гэта праблемы сардэчна-сасудзістай сістэмы, органаў дыхання, сасудаў, эндакрыннай і нервовай сістэмы...

— Лячэнне сваіх пацыентаў, сярэдні ўзрост якіх 70 гадоў, пачынаем з ультрагукавой і функцыянальнай дыягностыкі, — кажа **галоўны ўрач санаторыя Міхаіл КОЛБ**. — Толькі пасля выяўлення захворванняў унутраных органаў урач-тэрапеўт можа прызначыць хвораму комплекснае кваліфікаванае лячэнне.

— Мы любім сваіх пацыентаў, працэдуры прызначаем кожнаму ў індывідуальным парадку з улікам усіх супрацьпаказанняў, — дадае **намеснік галоўнага ўрача па медыцынскай частцы Святлана БАРАЎКОВА,** — таму яны і едуць да нас паляпшаць сваё здароўе. Той, хто прыехаў аднойчы, як правіла, вяртаецца яшчэ раз.

За год у санаторыі «Ясельда» праходзіць лячэнне 3 200 чалавек.

Метады фізічнай рэабілітацыі, якія прымяняюцца ў «Ясельдзе», па шчырасці, здзіўляюць сваёй разнастайнасцю. З ахвотай пацыенты прымаюць лячэбныя жамчужныя, хвойныя, араматычныя, шкіпінарныя, хларыдна-натрыевыя ванны, а таксама падводны, цыркулярны і ўзыходзячы душы, душ Шарко.

— Ёсць у нашай водалячэбніцы таксама арыгінальная сухая вуглякіслая ванна «Рэабокс», — расказвае і паказвае Міхаіл Іпалітавіч. — Гэтая лячэбная ўстаноўка садзейнічае паляпшэнню кіслароднага абмену ў тканках і павышае ўтрыманне вуглякіслага газу ў крыві пацыентаў.

Не так даўно з'явілася ў санаторыі і новая механізаваная гразелячэбніца. Гаючыя сапрапелевыя гразі прывозяць у Почапава з возера Дзікае Гродзенскай вобласці і прымяняюць у тым ліку ў спалучэнні з парафінам і гальванізацыяй (электрагразелячэнне. — **Н.Д.**).

Шырока прымяняюцца для комплекснага лячэння ручны, вакуумны і электрастатычны віды масажу. Паказалі нам таксама масажную кушэтку і крэсла з інфрачырвоным падагрэвам і пультам для выбару вызначанага віду масажу.

— Для лячэння захворванняў страўнікава-кішачнага тракта, — працягвае сваю экскурсію Міхаіл Колб, — мы распрацавалі і паспяхова прымяняем методыку кропельных клізмаў і мікраклізмаў з адварамі рамонкі, календулы. Акрамя таго, на апараце для маніторнай ачысткі кішэчніка праводзіцца яго прамываннe.

Галоўны ўрач санаторыя «Ясельда» Міхаіл КОЛБ і намеснік галоўнага ўрача па медыцынскай частцы Святлана БАРАЎКОВА.

Наведалі мы і кабінеты для лячэння спадарожных захворванняў. Так, у прыватнасці, галакомплекс (альбо саляны пакой) выкарыстоўваецца для лячэння і рэабілітацыі хворых бранхіяльнай астмай, у пасляаперацыйным перыядзе, для прафілактыкі інфекцыйных захворванняў, аздараўлення дыхальных шляхоў, скуры і валасоў, псіхаэмацыянальнай разгрузкі. Лячэнне вянозных і лімфатычных захворванняў сасудаў ніжніх канечнасцяў ажыццяўляецца на нямецкім апараце «Лімфамат». Выдатны эфект аказвае на сасуды і дарожка з марскіх каменьчыкаў з падагрэвам. Гэта ўласная распрацоўка спецыялістаў санаторыя, адобраная Міністэрствам аховы здароўя.

Шырока прымяняецца ў комплексным лячэнні, паводле слоў галоўнага ўрача, таксама лячэбная саўна, індывідуальная міні-саўна «Кедравая бочка», кантрасныя ванны. Праводзяцца індывідуальныя заняткі з хворымі на трэнажорах, бегавых дарожках. Усе пацыенты могуць запісацца на кансультацыю да ўрача-фізіятэрапеўта, неўролага, псіхатэрапеўта.

Пакуль мы хадзілі па кабінетах, звярнула ўвагу на шырокія ліфты і адсутнасць высокіх парогаў.

— У нас створана безбар'ернае асяроддзе для людзей з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі, — тлумачыць Святлана Бараўкова. — Тэрыторыя санаторыя абсталявана пандусамі, жылыя і лячэбныя корпусы злучаны паміж сабой пераходамі, таму пацыенты-калясачнікі маюць доступ у любы жылы пакой, у любы кабінет на любы від лячэння. Больш за тое, увесь перыяд знаходжання іх суправаджае кваліфікаваны супрацоўнік.

Тэрыторыя санаторыя абсталявана пандусамі, жылыя і лячэбныя корпусы злучаны паміж сабой пераходамі, таму пацыенты-калясачнікі маюць доступ у любы жылы пакой, у любы кабінет на любы від лячэння.

Малебны пакойчык і танцавальная зала карыстаюцца папулярнасцю

Гасцей санаторыя, перакананыя на свае вочы, чакаюць не толькі высокаэфектыўнае лячэнне, але і прыемны адпачынак. Ахвотныя могуць наведаць бібліятэку, залу псіхалагічнай разгрузкі, пагуляць у шашкі, шахматы, більярд, настольны тэніс. На тэрыторыі санаторыя ёсць нават тэнісны корт. У прасторнай актавай зале перыядычна арганізоўваюцца гутаркі на тэму здароўя, сумесныя прагляды мастацкіх фільмаў. У жылых жа корпусах можна назіраць з густам абстаўленыя двухмесныя і аднамесныя нумары з санвузлом, душавой і тэлевізарам.

— Санаторый «Ясельда» ўваходзіць у сістэму Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Беларусі. Таму кожны заезд мы трымаем 150 ложкаў для Цэнтра па аздараўленні, які, у сваю чаргу, размяркоўвае сацыяльныя пуцёўкі паміж беларускімі ветэранамі вайны, працы і інвалідамі, — распавядае Міхаіл Колб. — Часам асобныя пацыенты не ладзяць паміж сабой, таму, каб захаваць «здаровую» атмасферу ў санаторыі, нам даводзіцца іх рассяляць.

Для гэтых мэт у распараджэнні кіраўніцтва ёсць некалькі вольных ложкаў. Тыя ж з іх, якія застаюцца незапатрабаванымі, прапануюць усім ахвотным (як правіла, расіянам) за поўны кошт. Атрыманы ж прыбытак ідзе на развіццё санаторыя.

— Асаблівай папулярнасцю сярод нашых пацыентаў карыстаюцца вечары адпачынку, якія ладзяцца на летняй танцавальнай пляцоўцы альбо ў зале з сучаснай светлагукавой апаратурай, а таксама экскурсіі па старажытным Пінску, — дадае Міхаіл Іпалітавіч. — Ёсць у санаторыі і спецыяльны пакойчык, дзе любы ахвотны можа памаліцца, паразмаўляць з Богам. Цэнтральнае месца ў ім займае іканастас, выразаны з дрэва адным з былых пацыентаў.

Напрыканцы экскурсіі па карпусах Міхаіл Колб паказаў нам месца, дзе ўжо вядзецца будоўля басейна.

— Мы ўдзячны Міністэрству працы і сацыяльнай абароны за тое, што практычна штогод згодна з інвестыцыйнай праграмай нам выдзяляюцца сродкі на развіццё санаторыя. Менавіта дзякуючы гэтай падтрымцы мы ў бліжэйшы час зможам дабудаваць басейн з рознымі воднымі пушкамі, гідрамасажам, дзе плануем праводзіць лячэбную фізкультуру.

Таксама ў планах кіраўніцтва рэканструкцыя будынка 1908 года, які захаваўся на тэрыторыі санаторыя. Там плануецца размясціць бар і тры VIP-нумары.

Надзея ДРЫЛА.
Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

Зала псіхалагічнай разгрузкі.

ДЗЕЦІ З ЦАЦКАМІ ГУЛЯЮЦЬ...

Юныя маракі.

НАД уваходам у сад-яслі № 4, што ў Пінску, вісіць шыльда з назвай «Матрошка». Прыйшлася даспадобы драўляная, аляпавата расфарбаваная лялька, у якую ўстаўлены з дзясятак такіх жа лялек-блізнят. Не знайшлося, атрымліваецца, свайго прыгожага палескага слова, але гэта наша агульная бяда. А ў самім садку — дзеці, выхавальніцы і многа цацак.

Загадчык садка-ясляў № 4 Алена МАХНАВЕЦ.

Сад-яслі № 4, хоць і пабудаваны ў горадзе, але знаходзіцца на балансе раённага аддзела адукацыі. Тут 177 гарадскіх дзяцей і толькі 63 — з вёсак. Гэтую ўстанову можна лічыць адной з лепшых у Пінскім раёне. Сюды прыязджаюць удзельнікі абласнога семінара, сад перамагае ў конкурсах, а гэта значыць, што «чацвёртаму» ў раёне надаецца асаблівая ўвага.

— Калектыў у нас стабільны, укамплектаваны выхавацелямі, педагогамі і медперсаналам, — кажа **загадчык садка Алена Махнавец**.

— Няўжо няма праблем?

— Ад праблем не схаваешся. Вось у адным пакоі ўпала тэмпература, нейкія недапрацоўкі ў праекце выявіліся. Абяцалі ў бліжэйшы час усё прывесці ў парадак. У асноўным жа праблемы вырашаюцца. Ёсць некалькі груп дзяцей, у якіх назіраюцца моўныя адхіленні ад нормы. З такімі дзецьмі займаюцца спецыялісты, і ў школу малыя ідуць з правільным вымаўленнем.

— Алена Міхайлаўна, бацькам грошы даводзіцца ўносіць? Ці не ўзнікаюць тут нейкія непаразуменні?

— У садку працуе апякунскі савет, у які ўваходзяць тыя ж бацькі дзяцей — адзін чалавек ад кожнай групы. Савет і вырашае, што набыць, якая сума ўносіцца. Адна маці неяк падняла шум: маўляў, я грошы дала, а куды яны падзеліся? У апякунскім савеце ўсё растлумачылі, паказалі дакументы. Вось і цацкі на бацькоўскія грошы купілі.

— А якая сітуацыя з харчаваннем? Напрыклад, у школах ёсць пэўная праблема — недахоп грошай.

— За харчаванне дзяцей 40 працэнтаў плацяць іх бацькі. Недахоп грошай адчуваецца таксама.

Сад-яслі № 4 можна лічыць паказальным, а ў раёне працуюць яшчэ 32 дашкольныя ўстановы, у якіх норма расходаў на харчаванне ў дзень на адно дзіця складае: ад 1 да 2 гадоў — 4850 руб., ад 3 да 6 гадоў — 5930 руб. — а гэта толькі 62-63 працэнты ад нормы. Для малодшай групы неабходна — 7290 руб, а для старэйшай — 9520 рублёў. Вось бацькі і даплачваюць розніцу. І гэта пры тым, што кожны год праводзіцца тэндар па выбары пастаўшчыкоў прадуктаў. Галоўным крытэрыем пры адборы з'яўляецца якасць і кошт прадукцыі.

У параўнанні з мінулым годам сёлета прыток дзяцей у дашкольныя ўстановы павялічыўся амаль на 3 працэнты, але ў цэлым напаўняльнасць садкоў па раёне нізкая, і ў апошнія гады павелічэнне колькасці дзяцей дашкольнага ўзросту назіраецца, найперш, у вёсках, якія прылягаюць да Пінска. Таму і запланавана будаваць сад-яслі ў вёсках Галева і Пінкавічы...

Тлумачыцца гэта тым, што ў вёсках, якія знаходзяцца побач з горадам, адбываецца амаладжэнне насельніцтва. Можна жыць на вёсцы, а працаваць у горадзе. Акрамя гэтага, сёння бацькі не спяшаюцца аддаваць дзяцей у сад-яслі. Маці да трох гадоў можа глядзець дзіця і атрымліваць грашовую дапамогу. Хоць нейкую, бо ў савецкі час плацілі толькі за два пасляродавыя месяцы.

Існуе праблема і з медыцынскім персаналам. Цяжка бывае знайсці медсястру, якая працавала б у садку на 0,25 ці 0,5 стаўкі. Праблема гэтая з'яўляецца тыповай для ўсёй вобласці — недахоп медперсаналу адчуваецца ва ўсіх раёнах Брэстчыны.

...Знаходзячыся ў дзіцячым садку № 4, заходзіў у розныя групы і ўсюды бачыў адну і тую ж карціну: дзеці з цацкамі гуляюць. Малыя жывуць у сваім прыдуманым свеце, і ім няма ніякай справы да ўсіх гэтых праблем. Іх павінны вырашаць дарослыя.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.
Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

Пінскі раён.

Выхавальніца Наталля АКСЮТЧЫК і намеснік загадчыка па асноўнай дзейнасці Наталля РЫЖКАВЕЦ з малодшай групай «Вясёлка».

«Палескія журавіны» — прадукт высокай якасці

ААТ «Палескія журавіны» спецыялізуецца на вырошчванні журавін буйнаплодных і буякоў высакарослых. Акрамя таго, займаецца нарыхтоўкай дзікарослых ягад і грыбоў. У асноўным гэта чарніцы, журавіны балотныя, баравікі, лісічкі. Прадукцыя рэалізоўваецца оптам і ў розніцу ў свежым і свежамарожаным выглядзе, як унутры рэспублікі, так і за яе межамі.

Дырэктар ААТ «Палескія журавіны» Васіль ЛЯГУСКІ.

ЛАХВАЧЫ — так на Палессі называюць буякі (ці дурніцы, што адно і тое ж).

ЖУРАВІНАВЫ РАЙ

Журавінавы соус да англійскай індычкі

Самая буйная ў Еўропе плантацыя журавін буйнаплодных размяшчаецца пад вёскай Селішча і складае на сёння 84,5 га. На чэках, колькасць якіх з кожным годам павялічваецца, вырошчваецца 8 найбольш распаўсюджаных сартоў каралевы балот: «Стывенс», «Мак-фарлін», «Сірлз», «Бэн-Лір», «Ранні чорны», «Пілігрым», «Кроўлі» і «Ховес».

— Упершыню сарты карыснай для здароўя ягады прывезлі на Палессе з Амерыкі 25 гадоў таму, — распавядае **дырэктар ААТ «Палескія журавіны» Васіль ЛЯГУСКІ, які ўзначальвае гаспадарку з 1992 года.** — Прайшоў час, і журавіны, якія выраслі на беларускай зямлі, ужо на роўных канкурыруюць з ЗША і Канадай на еўрапейскіх рынках. І гэта пры тым, што вопыт амерыканцаў у гэтай сферы складае больш за 170 гадоў.

На палескіх плантацыях журавіны ўбіраюць пераважна механічным спосабам. Адгароджаныя ўчасткі палёў — «чэкі» — заліваюць вадой і запускаюць на іх трактары са спецыяльнымі насадкамі. Праўда, механізацыя механізацыяй, але з любога правіла ёсць выключэнне.

— Так, англійская фірма штогод замаўляе ў нас перад Новым годам больш за 40 тон ягад для прыгатавання традыцыйнага соусу да смажанай індычкі, — кажа Васіль Рыгоравіч. — Ягады для жыхароў туманнага Альбіёна, згодна з кантрактам, павінны быць сабраныя ўручную. Праца складаная, але акупляецца спаўна: бо пакупнік заўсёды дае добрую цану ў валюце.

Паласавацца палескімі журавінамі могуць не толькі англічане. У сваіх гандлёвых кантактах прадпрыемства не замыкаецца. Працуе і з Расіяй, Нідэрландамі, Італіяй, Галандыяй, Румыніяй, Польшчай, Германіяй, Латвіяй, Літвой, Швецыяй, Казахстанам. Якасную прадукцыю «Палескіх журавін», што не можа не радаваць, можна набыць і на прылаўках беларускіх крам, бо на экспарт ідзе толькі крыху больш за 50 % прадукцыі.

Сушаныя буякі — выдатная альтэрнатыва прывазным разынкам

Акрамя журавін, неблагі прыбытак прыносяць і буякі, саджанцы якіх увезены з Польшчы ў 1997 годзе. Сёння на плантацыях плошчай амаль 70 гектараў палешукі вырошчваюць больш як 50 сартоў гэтай ягады: што ні рад — то іншы сорт. Прычым кілаграм буякоў, вырашчаных на беларускай зямлі, на Камароўскім рынку каштуе ў 8 разоў танней, чым той жа кілаграм, але прывазных з Новай Зеландыі.

Рэкордны ўраджай журавін у гаспадарцы — 30 тон з гектара.

Плённа супрацоўнічаюць «Палескія журавіны» і з вучонымі рэспубліканскага Інстытута аховы раслін і Цэнтральнага батанічнага сада Акадэміі навук.

— Там ёсць вельмі добрыя спецыялісты, разам з якімі мы займаемся распрацоўкай новых відаў тавараў з журавін, буякоў, іншых ягад і грыбоў, — адзначае Васіль Лягускі. — Рэцэптура новай прадукцыі запатрабавана айчыннымі перапрацоўшчыкамі. У прыватнасці, нічога больш смачнага я не спрабаваў, як жэле з буякоў ды журавін у шакаладзе. Карыстаюцца папулярнасцю і журавіны ў какосавай стружцы ды цукровай пудры. І ў далейшым нашы намаганні будуць накіраваны на імпартазамяшчэнне. У прыватнасці, у 2013 годзе паспрабуем пабудаваць міні-цэх па перапрацоўцы ягад. На мой погляд, сушаныя журавіны ды буякі, — выдатная альтэрнатыва імпартным разынкам. Акрамя таго, з ягад, якія мы вырошчваем, можна вырабляць сок.

Таксама зараз на прадпрыемстве, каб мінімізаваць залежнасць ад прыроды, прапрацоўваецца пытанне набыцця перасоўнай градабойнай устаноўкі. Апошняя здольная з дапамогай спецыяльных рэагентаў ператварыць атмасферны лёд ў цёплы дожджык над часткай вытворчых плошчаў. Увагу садаводаў прыцягнула бельгійская мадэль. Каштуе яна да 170 тысяч еўра, але цалкам можа акупіцца ўжо праз год.

У сезон-2011 «Палескія журавіны» сабралі больш як 300 тон журавін. Гэта адзінае прадпрыемства ў Беларусі такога прамысловага маштабу.

ЖУРАВІНЫ БУЙНАПЛОДНЫЯ (дыяметр ягады дасягае 2,5 сантыметра) змяшчаюць вялікую колькасць пекцінавых рэчываў, здольных вывадзіць з арганізма радыенукліды і злучэнні цяжкіх металаў.

УНП 200497792

ПІНСКАЯ НОРКА — НАЙЛЕПШАЯ АБНОЎКА

У футрах з высакаякаснай пінскай пушніны фарсяць модніцы ў розных кутках планеты

Сёлета прыватнаму ўнітарнаму прадпрыемству «Пінская зверагаспадарка Белкаапсаюза», што месціцца ў аграгарадку Малоткавічы, споўнілася 55 гадоў. Практычна ўвесь гэты час адданыя сваёй справе мясцовыя звераводы гадуюць норак, шкуркі якіх прыносяць дзяржаве немалы валютны прыбытак.

Дырэктар Пінскай зверагаспадаркі Васіль МАКАРЭВІЧ.

БЕЛАЕ ФУТРА Ў МОДЗЕ

Штогод палескія вытворцы рэалізуюць больш як 150 тысяч шкурак норак. З іх на ўнутраны рынак — для патрэб адзінага Віцебскага футравага камбіната — прыпадае ўсяго толькі 10 % прадукцыі. Астатнія шкуркі палешукі адпраўляюць на экспарт. З рукамі і нагамі размятаюць іх на сезонных пушніна-футравых аўкцыёнах, куды з'язджаюцца перапрацоўшчыкі з усяго свету. Асноўныя пакупнікі пінскай пушніны — Расія, Германія, Грэцыя, Турцыя і Кітай. Аднак пакупнік пакупніку не роўны. Калі кітайскія кушняры працуюць пераважна са шкуркамі даўгашэрсных норак, то еўрапейскія аддаюць перавагу караткашэрснай прадукцыі, якой у палешукоў пакуль няшмат.

— Караткашэрсныя норкі скандынаўскага тыпу ў нас сёння складаюць усяго 25% пагалоўя, — распавядае **дырэктар Пінскай зверагаспадаркі Васіль МАКАРЭВІЧ.** — Але на гэтым спыняцца не збіраемся: у бліжэйшы час плануем нарасціць пагалоўе «скандынавак», прычым розных колеравых груп, да 60 %.

Работа ў гэтым кірунку ідзе поўным ходам. Нядаўна Васіль Яўгенавіч вярнуўся з Польшчы, дзе вырашаў з партнёрамі пытанне аб закупцы трох тысяч караткашэрсных звяркоў колераў «рэгал» і «паламіна».

— У апошнія гады самай запатрабаванай на аўкцыёнах была пушніна белага колеру, якой у сілу розных прычын не жадаюць займацца нашы калегі, — адзначае суразмоўца. — Гэта можна патлумачыць тым, што белая норка патрабуе ідэальных умоў утрымання. Прынамсі, калі ў клетцы недзе ўзнікне ржаўчынка, то футра пацямнее і будзе лічыцца дэфектным. Разам з тым, белую норку можна прадаць на 40 % даражэй, чым пушніну іншага колеру.

Норкавае футра не толькі прыгожае, але і практычнае і зносаўстойлівае. Яно можа праслужыць 10, а то і больш гадоў пры ўмове, што шкуркі правільна выраблены, а выраб граматна захоўваецца.

ЧЫМ «СКАНДЫНАЎКА» ЛЕПШАЯ ЗА «ЕЎРАПЕЙКУ»?

— Калі ўсходнееўрапейскія даўгашэрсныя норкі і да ежы, і да ўмоў утрымання не вельмі пераборлівыя, — тлумачыць Васіль Макарэвіч, — то звяркі караткашэрснай скандынаўскай пароды патрабуюць да сябе асаблівай увагі: і рацыён ім падавай больш разнастайны, і жыллё больш цёплае. Але ў выніку пры продажы пушніны гэтыя выдаткі акупляюцца спаўна: футра «скандынавак» у заморскіх куцюр'е каштуе на 20% даражэй той «вопраткі», якую носяць «еўрапейкі».

***

Некаторыя звераводы пагналіся за нажывай і цалкам пераключыліся на гадоўлю караткашэрсных норак. Але толькі не Пінская зверагаспадарка, якая, дарэчы, мае статус племянной.

— Мы не кідаемся ў крайнасці, а ідзём больш рацыянальным шляхам, — распавядае Васіль Макарэвіч. — Пароду даўгашэрсных норак, якія гадуем яшчэ з савецкіх часоў, працягваем захоўваць у чысціні. Бо разумеем, што мода — спадарыня непастаянная: сёння ў фаворы караткашэрсныя, заўтра, хто ведае, можа, будуць даўгашэрсныя. Мы хочам мець і «еўрапеек», і «скандынавак», каб не быць падуладнымі модзе, а мець магчымасць у любы момант вар'іраваць колькасць тых ці іншых парод у залежнасці ад сітуацыі на рынку.

У Пінскай зверагаспадарцы разводзяць норак 6 расфарбовак: цёмна-карычневых, пастэль, сапфір, паламіна, сканблэк, сканбраўн. У бліжэйшы час чакаецца завоз норак яшчэ двух колераў: рэгал і паламіна.

СЦК («стандартна цёмна-карычневы») — норка цёмна-карычневага колеру, якая карыстаецца найбольшай папулярнасцю на айчынным рынку футра. Яе насычаны карычневы колер нагадвае колер цёмнага шакаладу і пакідае адчуванне цеплыні і ўтульнасці.

Пастэль — самае светлае адценне карычневай норкі.

Сапфір — гэта скандынаўская норка шэра-блакітнага адцення. Выбар тых жанчын, якія імкнуцца стварыць сабе вобраз ззяючай, халоднай прыгажосці.

Сканблэк — назва натуральнага колеру чорнай скандынаўскай норкі. За асаблівы бляск і пералівы пад промнямі святла гэтае футра часам называюць «чорным брыльянтам».

Сканбраўн — карычневая скандынаўская норка.

Рэгал — белая норка.

Паламіна (шэра-бэжавы «тапаз») — бэжавае адценне белай норкі.

Зверавод Ірына ЖАДЗІНЕЦ.

Асноўнымі заканадаўцамі моды на пушніну з'яўляюцца датчане, занятыя ў гэтым бізнэсе больш за сто гадоў. Яны вырабляюць штогод каля 14 мільёнаў адзінак пушніны. Для параўнання, зверагаспадаркі Беларусі — 700—800 тысяч адзінак.

БЛОЧНЫЯ ШЭДЫ ДАЗВОЛЯЦЬ У ТРЫ РАЗЫ ПАВЯЛІЧЫЦЬ ВЫТВОРЧАСЦЬ

Па дарозе на прадпрыемства мы заехалі ў суседнія Стахавічы, дзе ва ўсю кіпіць будаўніцтва новай фермы па дацкай тэхналогіі. Новы ўчастак разлічаны на 28 тысяч месцаў, што дазволіць штогод атрымліваць да 80 тысяч галоў маладняку норкі.

— Плануем туды пасадзіць скандынаўскіх норак розных расфарбовак ужо ў ліпені, — распавядае дырэктар гаспадаркі. — Новыя блочныя шэды дазволяць нам на трэць павялічыць вытворчасць. Так што ў выйгрышы застануцца ўсе: і еўрапейскія мадэльеры, і іх кліенты, ну і, зразумела, мы.

За перспектывы, якія адкрыліся перад прадпрыемствам, дырэктар удзячны кіраўніцтву, дзякуючы якому з'явілася ў краіне дзяржаўная праграма развіцця Прыпяцкага Палесся. У рамках гэтай праграмы Пінскай зверагаспадарцы будзе выдзелена 17,1 мільярда рублёў у якасці льготных крэдытаў. Гэтыя сродкі плануецца накіраваць як на будаўніцтва новай фермы, так і на мадэрнізацыю шэдаў і закупку новага абсталявання, бо за 55 гадоў работы свае асноўныя фонды прадпрыемства знасіла да 90-100 %.

— Што тычыцца абсталявання, то для новай фермы мы ўжо закупілі кармараздатчыкі-мінкамацікі, — распавядае Васіль Яўгенавіч. — Гэтыя сучасныя машыны ў аўтаматычным рэжыме будуць карміць і паіць норак, што істотна аблегчыць нагрузку на работнікаў.

Пры павелічэнні пагалоўя аўтаматычная раздача кармоў проста неабходная рэч, бо норкі спажываюць корм у неверагодных колькасцях: у дзень расходуецца 55-60 тон галоўным чынам мяса-рыбнай прадукцыі. Але на ежы гэтых звяркоў эканоміць недапушчальна, бо правільнае збалансаванае кармленне — як вядома, залог высокага прыплоду і якаснай, канкурэнтаздольнай на сусветных рынках пушніны.

УНП 200111658

ШЭДЫ — шэрагі клетак з кармушкамі для норак, накрытыя зверху дахам. Даўжыня аднаго шэда можа дасягаць ста метраў. На кожнага зверавода прыпадае да пяці шэдаў: амаль тры тысячы звяркоў.

Зверавод Ганна СІДАРОВІЧ.



ПАК першая акумулятарная кампанія

«ДЭМЕТРА» Таварыства з абмежаванай адказнасцю

СТАЎКА НА ЯКАСЦЬ І ПРЫМАЛЬНУЮ ЦАНУ

ТАА «Дэметра» супрацоўнічае з самымі буйнымі жывёлагадоўчымі комплексамі краіны. Нашымі заказчыкамі з'яўляюцца: РА «Белаграсэрвіс» (філіял «Аграпрамкамплект»), РУСП «СГУ «Віхра» Мсціслаўскага раёна, ААТ «Белавежскі» Камянецкага раёна, свінакомплекс «Усходні» Баранавіцкага, але гэта не значыць, што «Дэметра» не працуе з меншымі гаспадаркамі ці нават асобнымі фермерамі.

ТАА «ДЭМЕТРА» з'яўляецца галоўным прадпрыемствам гарызантальна-інтэграванага холдынгу «Група кампаній ПАК», які праектуе і ўзводзіць разнапланавыя сельскагаспадарчыя аб'екты і вырабляе высакаякаснае абсталяванне для малочнатаварных фермаў і свінакомплексаў.

Прадпрыемства «Дэметра» выкарыстоўвае ў сваёй вытворчасці самыя перадавыя сучасныя тэхналогіі і супрацоўнічае з самымі вядомымі ў свеце вытворцамі абсталявання для жывёлагадоўчых комплексаў. Але больш падрабязна пра супрацоўніцтва з заходнімі фірмамі размова ў нас пойдзе ніжэй.

Кампанія «Дэметра» толькі на Брэстчыне рэалізавала каля 50 праектаў па рэканструкцыі жывёлагадоўчых комплексаў, а аб'ём продажу толькі за 2010 год склаў каля 14,2 мільёна долараў. Сёння паслугамі фірмы карыстаюцца сотні гаспадарак не толькі ў Беларусі, але і за яе межамі. А ўпершыню «Дэметра» «засвяцілася» ў 1993 годзе, калі пачала пастаўляць запчасткі для сельгастэхнікі.

Але за лепшае будзе паслухаць дырэктара кампаніі «Дэметра» Аляксандра Папка.

— Наш дэвіз: «Ад сістэмы ўтрымання — да павышэння эканамічных паказчыкаў». І наша кампанія рухаецца ў гэтым напрамку.

— Аляксандр Мінавіч, дэвіз у вас выдатны, але як павышаць паказчыкі, калі ў краіне фінансава-эканамічны абвал здарыўся?

— Не скажу, што фінансавы крызіс нас абмінуў. Гэта звязана найперш з тым, што фірма закупляе сыравіну для вытворчасці і за межамі Беларусі. А ў Расіі не хочуць ведаць, што адбываецца з нашым рублём. Калі там 1 тона труб каштавала 1000 долараў да дэвальвацыі беларускага рубля, то і пасля яе неабходна за тону плаціць тую ж тысячу. Адназначна, абаротныя сродкі ўпалі. Але ж за 20 гадоў існавання фірмы мы не раз сустракалі цяжкія і непрыемныя абставіны, якія трэба было пераадольваць.

— І тым не менш «Дэметра» не толькі не здае пазіцый, а набірае абароты. З чым гэта звязана?

— Галоўным чынам з якасцю нашай прадукцыі, якраз на гэта мы і робім стаўку. Для вытворчасці абсталявання мы бяром самыя перадавыя і інавацыйныя ідэі замежных калег і партнёраў. Напрыклад, наша фірма вырабляе разнастайныя агароджы з чорных труб метадам гібкі і зваркі, пасля чаго вырабы праходзяць працэс гарачай ацынкоўкі. Гэта дазваляе ствараць устойлівую антыкаразійную ахову, што максімальна павялічвае тэрмін жыцця абсталявання пры эксплуатацыі. Але не толькі на гэта робіцца стаўка. Кампанія ўзмацняе ціск на расійскі рынак і пастаўляе туды сваю прадукцыю.

Наш дэвіз: «Ад сістэмы ўтрымання — да павышэння эканамічных паказчыкаў». І наша кампанія рухаецца ў гэтым напрамку.

— А што для вашай фірмы расійскі рынак?

— Наша кампанія выпускае святловентыляваныя вільчакі, дойнае, халадзільнае і стойлавае абсталяванне, транспарцёры для прыборкі гною, шторы для фермаў, усяго амаль 400 найменняў прадукцыі. Шэраг нашага абсталявання запатрабаваны і расійскім рынкам, а ён своеасаблівы і даволі актыўна развіваецца. Там узводзяцца жывёлагадоўчыя комплексы за кошт дзяржавы і прыватнага капіталу. Выхад на расійскі рынак даў магчымасць нашаму прадпрыемству дабіцца станоўчага валютнага балансу.

— Хацелася б спыніцца на якасці абсталявання, у чым яна праяўляецца? Напрыклад, даводзіцца чуць, што транспарцёры па выдаленні гною часта становяцца непрыдатнымі. Я не маю на ўвазе ваша абсталяванне. Проста на фермах даволі агрэсіўнае асяроддзе і карозія наносіць вялікую шкоду металу.

— Часта заказчык не жадае мець справу з расійскім ці імпартным абсталяваннем. Першае не дужа якаснае, а другое — дарагое. А наша прадукцыя пры высокай якасці не вельмі дарагая, і таму аддаецца перавага абсталяванню нашай кампаніі. Прывяду два прыклады, якія раскрываюць сакрэты якасці. Калі металічную трубу апусціць у ванну з цынкам, то ацынкоўка адбываецца не толькі зверху, але і ўнутры трубы, што дазваляе стварыць антыкаразійную ахову абсталявання. Такі метад больш эфектыўны і якасны, чым пры гальванізацыі. За межы Беларусі ідзе абсталяванне, якое ацынкована толькі метадам апускання, а ў нашай краіне часам не ўнікаюць у тонкасці вытворчасці, і тут адыгрывае ролю цана прадукцыі. Адносна транспарцёраў для прыборкі фермаў, то хачу адзначыць адзін момант. Раней у нас куплялі толькі круглазвенчаты ланцуг, і затым да яго заказчык прыварваў скрабкі. Рабілася гэта сваімі сіламі, у выніку чаго метал станавіўся мяккім, і неўзабаве на гэтым месцы з'яўлялася эрозія. Сёння круглазвенчаты ланцуг мы пастаўляем толькі са скрабкамі. Дарэчы, гэты ланцуг з'яўляецца самай дарагой дэталлю транспарцёра і яна, тым не меней, вырабляецца ў Пінску. Мы імкнёмся максімальна абмежаваць выкарыстанне імпартных камплектных частак. Вось і ў дэльтаскрэпернай установцы нашай фірмы толькі рэдуктар і сістэма электроннага ўпраўлення імпартныя, а гэта ўсяго 10 працэнтаў ад кошту ўстаноўкі.

Дырэктар Аляксандр ПАПОК.

— Аляксандр Мінавіч, рынак немагчыма ўявіць без канкурэнцыі. Ёсць цяжкасці ў гэтым плане?

— Канкурэнцыя існуе, але абсталяванне, якое мы выпускаем, не архіскладанае, і, як ужо было сказана, мы робім стаўку на якасць і кошт. Мы хочам ведаць, што патрэбна заказчыку і імкнёмся задаволіць яго пажаданні, але ў той жа час фірма адстойвае свае пазіцыі. Заказчык ведае, чаго хоча, але ёсць тэхналагічныя нюансы, якія немагчыма абысці, і тады прыходзіцца настойваць на аптымальным варыянце. Акрамя таго, мы не толькі вырабляем і манціруем абсталяванне, але яно знаходзіцца ў нас на гарантыйным абслугоўванні. Фірма рамантуе абсталяванне і пасля гарантыі. **ТАА «Дэметра» супрацоўнічае з самымі буйнымі жывёлагадоўчымі комплексамі краіны. Нашымі заказчыкамі з'яўляюцца: РА «Белаграсэрвіс» (філіял «Аграпрамкамплект»), РУСП «СГУ «Віхра» Мсціслаўскага раёна, ААТ «Белавежскі» Камянецкага раёна, свінакомплекс «Усходні» Баранавіцкага, але гэта не значыць, што «Дэметра» не працуе з меншымі гаспадаркамі ці нават асобнымі фермерамі.** Прасцей кажучы, канкурэнты нам не пагражаюць.

— Ваша прадпрыемства прыватнае, і яго 13 філіялаў і сэрвісных цэнтраў размешчаны ў розных рэгіёнах Беларусі. А якія адносіны складаюцца з мясцовай уладай?

— У асноўным поўнае разуменне, а калі недзе і ўзнікаюць нестыкоўкі, то імкнёмся іх вырашаць. Мясцовая ўлада ў нас таксама зацікаўлена, бо кампанія стварае рабочыя месцы, плаціць падаткі... Ніякага ціску не адчуваем.

— І напрыканцы нашай размовы некалькі слоў аб праблемах і перспектыве.

— Да нас хацелі прыйсці заходнія інвестары. Польска-дацкая кампанія гатова была ўкласці ў праект 4 мільёны еўра. Райвыканкам нават пад праект зямлю выдзеліў, але інвестараў напалохаў крызіс. Прыехалі, выслухалі і... вырашылі перачакаць. Хацелася б, каб у нас было больш фінансавай стабільнасці. І гэта, бадай што, самая вялікая праблема. А што датычыцца перспектывы, то яна выцякае з дзяржаўнай палітыкі, якая праводзіцца ў краіне. Калі ў сельскую гаспадарку ўкараняюцца высокія тэхналогіі, то гэта азначае, што поле дзейнасці для ТАА «Дэметра» будзе. Агульная эканамічная прастора дае нам магчымасць павялічыць пастаўкі сваёй прадукцыі на экспарт. І ўвогуле, пакуль існуе сельская гаспадарка, для нас работа будзе.

Начальнік аддзела продажаў Ігар САМУЙЛІК (злева) з калектывам: эканамістам Ларысай МАСЯЙЧУК, спецыялістамі Дзмітрыем МІХАЛЁВЫМ, Аксанай ГАПОНІК, Андрэем ГАЛАЎКО, Дзянісам СЯДЫХ, начальнікам групы кліенцкага сэрвісу Дзмітрыем МІХАЛЁВЫМ і кладаўшчыком Аляксандрам МІСЮРАМ.

Слесар механазборачных работ Максім ТАРГОНСКІ.

У добрага гаспадара і свінням камфортна

Але каб жывёле жылося камфортна, неабходна не толькі добра яе карміць, а і ствараць адпаведныя ўмовы ўтрымання. Падчас размовы Аляксандр Папок расказаў пра абсталяванне для свінакомплексаў, але мне захацелася паслухаць і спецыяліста па продажы гэтага абсталявання — Віктара Гарбацэвіча.

— Ваша фірма падтрымлівае дзелавыя кантакты з некалькімі дзясяткамі гаспадарак на тэрыторыі Беларусі. Шэраг буйных свінакомплексаў з'яўляецца вашымі заказчыкамі. Атрымаць прэстыжны, а гэта значыць і выгадны заказ можна, але ж існуюць нейкія правілы гульні, якія неабходна выканаць.

— Правілы даволі простыя — неабходна выйграць тэндар. Абысці канкурэнтаў і прапанаваць заказчыку тое, чаго няма ў іншых.

— Відавочна, і канкурыруючыя фірмы вырабляюць для свінакомплексаў абсталяванне, якое не дужа адрозніваецца ад вашага. Тады ў чым сакрэт?

— Імкнёмся прапанаваць прадукцыю высокай якасці па прымальнай цане. І ўвогуле, мы прапануем за тыя ж грошы цэлы шэраг мерапрыемстваў па адаптацыі і ажыццяўленні амаль любога індывідуальнага пажадання кліента ў канкрэтным выпадку, а таксама займаемся постгарантыйным абслугоўваннем любога свінагадоўчага комплексу па-за рамкамі выкананых работ. Стараемся як мага глыбей унікнуць у праблемы свінагадоўлі, таму нашы спецыялісты кожны год праходзяць навучанне ў лепшых вытворцаў сельскагаспадарчага абсталявання па ўсёй Еўропе.

— Адносна цаны. Цана мае мяжу, і ёю немагчыма бясконца маніпуляваць. За кошт чаго ўдаецца падтрымліваць прымальную для заказчыка цану?

— Варыянты ёсць. Вось адзін з іх. Вядзём пастаянны пошук пастаўшчыкоў, якія могуць зрабіць максімальныя зніжкі на сваю прадукцыю, у каго невысокія нацэнкі. Выбар ёсць, такіх пастаўшчыкоў сёння можна знайсці нават у Польшчы. У нашай фірме эфектыўна функцыяную сэрвісная служба, гарантыя. Акрамя гэтага, мы пастаўляем абсталяванне, якое звязана паміж сабой трохфазным цыклам — гэта абсталяванне для апаросу, ад'ёму і адкорму.

— Усе станкі для свінагадоўлі вашай вытворчасці?

— У асноўным нашай, але працуем у кантакце і з іншымі беларускімі вытворцамі.

— Абсталяванне на ферме ўстанавілі — і ніякіх праблем?

— Многае залежыць ад таго, у чые рукі яно трапляе. Калі ў гаспадарскія, то служыць «вечна». Але мы стараемся не канфліктаваць і ідзём на ўступкі. Калі нешта здарылася, то рамантуем на працягу 24 гадзін. Людзі ўсё разумеюць, і непаразуменняў няма. Важна не толькі прадаць, а яшчэ каб у заказчыка да фірмы быў давер.

На вытворчым участку Валерый ДУБЯНЕЦКІ.

У аддзеле канструктараў-тэхнолагаў: Сяргей КАРОЛЬ, Ігар НЕЧЫПАРЧУК, Валерый СЫЦЬКО, Віктар ХАРАШКОЎ, Таццяна САРОКІНА, Аляксей КАНАВАЛАЎ і Андрэй ГУЗАРЭВІЧ.

На ТАА «Дэметра» асаблівую ўвагу надаюць развіццю і ўкараненню на фермах ветэрынарнага забеспячэння жывёлы. З гэтай нагоды шэраг работнікаў фірмы прайшоў навучэнне ў іншых краінах і значна павысіў сваю кваліфікацыю ў гэтай галіне. Супрацоўнікі кампаніі часта бываюць на розных міжнародных выстаўках. Знаёмяцца там з новым абсталяваннем, а гэта дае магчымасць прааналізаваць магчымасць выпуску сваімі сіламі імпартазамяняльных камплектуючых і вырабаў.

Цеснае супрацоўніцтва і кааперацыя кампаніі «Дэметра» з заходнімі фірмамі дазваляе быць у курсе ўсіх навукова-тэхнічных напрацовак у сваёй галіне, дае магчымасць развіваць і пашыраць асартымент прадукцыі, прапаноўваць сваім заказчыкам такія паслугі, як узвядзенне жывёлагадоўчых комплексаў «пад ключ» і задаволіць, у адпаведнасці з вызначанымі тэхнічнымі нормамі і стандартамі, усе патрэбы заказчыка.

ТАА «Дэметра» здольная выканаць самы шырокі дыяпазон будаўніча-мантажных работ, устанавіць самае сучаснае абсталяванне і весці гарантыйнае абслугоўванне жывёлагадоўчых аб'ектаў.

На тых комплексах, якія аснашчаны абсталяваннем ТАА «Дэметра», для жывёлы ствараецца мікраклімат, які забяспечвае найлепшыя ўмовы для яе ўтрымання.

А гэта звязана з тым, што кампанія ўзяла за аснову нямецкі стандарт кіравання вытворчымі працэсамі, і сумесна з партнёрамі праводзіцца работа па ўкараненні рэгламентаў іх кантролю, аптымізацыі тэхналогіі, бесперапыннага кантролю якасці на кожным этапе вытворча-тэхналагічнага ланцужка.

Супрацоўніцтва з такой кампаніяй гарантуе прадпрыемствам хуткую эканамічную аддачу.

Кіраўніцтва ТАА «Дэметра» віншуе сваіх заказчыкаў, а таксама чытачоў газеты «Звязда» з надыходзячым Новым годам.

Выкарыстоўваючы перадавыя сусветныя тэхналогіі і вопыт

У эканамічна-развітых краінах Захаду аграпрамысловы комплекс развіваецца такімі бурнымі тэмпамі, што нашым спецыялістам у сферы сельскай гаспадаркі не трэба займацца вынаходствам «веласіпеда», а пажадана, найперш, выкарыстоўваць сучасныя напрацоўкі і тэхналогіі, ужо праверэныя часам.

Якраз такім шляхам і пайшлі супрацоўнікі кампаніі «Дэметра». Ужываючы самыя перадавыя заходнія тэхналогіі і вопыт, удаецца ствараць абсталяванне, якое аптымальна адпавядае запатрабаванням заказчыка ў суадносінах цана — якасць.

Цесныя кантакты ў ТАА «Дэметра» наладзіліся з вядомай нямецкай кампаніяй «Вестфалія», якая пастаўляе даільнае абсталяванне і электронныя блокі ўпраўлення, «Дэметра» вырабляе каркасныя канструкцыі. Таксама супрацоўнікі ТАА «Дэметра» даволі эфектыўна выкарыстоўваюць тэхналогіі і напрацоўкі замежных партнёраў, каб ўкараніць іх у сваіх праектах.

ТАА «Дэметра» здольная выканаць самы шырокі дыяпазон будаўніча-мантажных работ, устанавіць самае сучаснае абсталяванне і весці гарантыйнае абслугоўванне жывёлагадоўчых аб'ектаў.

Вось прадпрыемства асвоіла выпуск паілак з падагрэвам. Тут не магу ўстрымацца ад усмешкі. Калі гэта ў нашых калгасах і саўгасах падагравалі ваду, каб напаіць жывёлу? І вось бачым, што прагрэс дайшоў і да нас. Асноўную канструкцыю паілкі спецыялісты кампаніі ўзялі ў вядомай нямецкай фірмы Suevia. А затым у сваіх цэхах вырабілі ванну паілкі, іншыя металічныя дэталі і прыйшлі да высновы, што далей не трэба мудрыць, а неабходна клапан падачы вады і награвальны элемент набываць у замежных пастаўшчыкоў. У выніку разлікаў стала зразумела, што заказчык ад гэтага толькі выйграе. Кошт вырабаў значна знізіўся ў параўнанні з імпартнымі аналагамі, а тэхнічныя характарыстыкі захаваліся.

Тыя камплектуючыя, якія ТАА «Дэметра» можа вырабіць само, выпускае самастойна, а калі ёсць неабходнасць, то заказы размяшчаюцца на іншых прадпрыемствах краіны. Шэраг агрэгатаў і камплектных частак закупляецца за мяжой. Гэта дае магчымасць кампаніі манеўраваць і працаваць больш мабільна.

«Дэметра» пачала выпускаць станкі для ветэрынарнай апрацоўкі капытоў жывёлы, але такое абсталяванне даволі дарагое. Спецыялісты кампаніі, пазнаёміўшыся з разнастайнымі ўзорамі заходніх станкоў, стварылі некалькі сваіх вырабаў — аналагаў перадавых сусветных фірмаў. Абсталяванне практычна не ўступае замежнаму і гэта пры тым, што аказалася ўдвая таннейшым.

На ТАА «Дэметра» асаблівую ўвагу надаюць развіццю і ўкараненню на фермах ветэрынарнага забеспячэння жывёлы. З гэтай нагоды шэраг работнікаў фірмы прайшоў навучэнне ў іншых краінах і значна павысіў сваю кваліфікацыю ў гэтай галіне. Супрацоўнікі кампаніі часта бываюць на розных міжнародных выстаўках. Знаёмяцца там з новым абсталяваннем, а гэта дае магчымасць прааналізаваць магчымасць выпуску сваімі сіламі імпартазамяняльных камплектуючых і вырабаў.

НАШЫ КААРДЫНАТЫ:
Рэспубліка Беларусь,
225710, г. Пінск,
Праезд Каліноўскага, д. 2
Тэл.: (0165) 37 14 01,
37 14 10, 37 17 43
E-mail: info@1ak.by
УНП 200112098

«БЕЛМЕДПАСТАЎКА» — «ХУТКАЯ ДАПАМОГА» ДЛЯ РЭСПУБЛІКІ

Генеральны дырэктар Станіслаў НАРЫВОНЧЫК.

Цэнтральны офіс ЗАТ «Белмедпастаўка», якое ўяўляе сабой холдынг спецыялізаваных прадпрыемстваў, знаходзіцца ў прыгарадзе Пінска. Гэтая кампанія — не толькі буйнейшы імпарцёр медыцынскага абсталявання і матэрыялаў вядучых сусветных вытворцаў у Беларусі. За даволі кароткі час яна зарэкамендавала сябе і як высокарэнтабельнае вытворчае прадпрыемства, гадавы абарот якога — 12 млн долараў. Адсюль і добрая зарплата, што робіць фірму адной з самых запатрабаваных на рынку працы ў рэгіёне беларускага Палесся.

МЕДТЕХНИКА ПИНСК

Як усё пачыналася?

А пачыналася ўсё з дэфіцыту стаматалагічных матэрыялаў у 80-х. І пінскай паліклініцы, у якой 15 гадоў адпрацаваў зубным тэхнікам сённяшні **генеральны дырэктар галаўнога прадпрыемства ЗАТ «Белмедпастаўка» Станіслаў НАРЫВОНЧЫК**, нічога не заставалася, як прастойваць без працы. Гэта крызісная сітуацыя і падштурхнула Станіслава Міхайлавіча да думкі пра ўласны бізнэс. Ён пачаў ездзіць за мяжу і прывозіць адтуль дэфіцытныя на радзіме матэрыялы для вырабу каронак, лячэння зубоў. Спачатку выключна для патрэб медыцынскіх устаноў Піншчыны. Праз нейкі час за таварам у Пінкавічы пачалі прыязджаць з усёй рэспублікі. Так у 1988 годзе і ўзнікла пінская «Мэдтэхніка» — першая ў былым Савецкім Саюзе прыватная фірма.

— Прывозілі з-за мяжы не толькі стаматалагічныя матэрыялы, але і медыцынскую мэблю, — распавядае Станіслаў Міхайлавіч. — Як зараз памятаю, вязём мы 100 шафаў з Днепрапятроўска, а я і думаю сабе, «што ж гэта мы паветра возім? Самі ж не лыкам шытыя, можам рабіць не горшыя».

Так па ініцыятыве прадпрымальнага бізнэсмена «Медтэхніка» набыла завод, які спецыялізуецца на металаапрацоўцы, і стварыла сумеснае беларуска-нямецкае прадпрыемства СЗАТ «Белмедматэрыялы».

Так група кампаній у сваім развіцці прайшла шлях ад прыватнага кааператыву да акцыянернага таварыства, ад аптовых паставак стаматалагічнага абсталявання — да вытворчасці медыцынскай мэблі і абсталявання.

Старшы менеджар Анатоль МЕМЕХ на складзе стаматалагічных матэрыялаў.

Якасць без кампрамісаў!

Сёння СЗАТ «Белмедматэрыялы» мае ў сваім асартыменце больш за 100 найменняў медыцынскай мэблі і вырабаў медыцынскага прызначэння. Гэта розныя мадэлі шафаў, паліц, тумбаў, столікаў, кушэтак, банкетак, крэслаў, медыцынскіх падставак, растамераў, штатываў і г.д. Вырабляюцца яны з чорнага металу з прымяненнем высакаякаснага палімернага пакрыцця.

— Зараз паступова пераходзім на нержавейную сталь, — адзначае Станіслаў Міхайлавіч. — Вырабы з нержавейкі, зразумела, будуць у два разы даражэйшымі, але і праслужаць нашмат даўжэй, чым фарбаваныя парашковым метадам. У любым выпадку ў пакупніка павінен быць выбар.

— А што скажаце пра якасць прадукцыі?

— Ведаеце, мы ніколі не ідзём на кампраміс у пытаннях якасці нашай прадукцыі. Прывозім праверануюю часам фурнітуру для будучых вырабаў з Германіі, Італіі, Аўстрыі і іншых краін Еўрасаюза. Пры гэтым пастаянна пашыраем не толькі асартымент прадукцыі, але і колькасць. Калі яшчэ два гады таму мы выраблялі і прадавалі медыцынскай мэблі і абсталявання на 300 млн у месяц, то зараз — на 1,5 млрд.

— А дзе рэалізуецца ваша прадукцыя?

— 30 % ад агульнай колькасці прадукцыі экспартуем у Расію. Астатнія 70 % рэалізуюцца ў Беларусі. Мы актыўна ўдзельнічаем у тэндарах па пастаўцы нашай прадукцыі ў буйнейшыя айчынныя медыцынскія ўстановы.

— Наколькі яна даступная па кошце?

— Раз попыт перавышае прапанову — значыць, дастаткова даступная. Прынамсі на снежань маецца заявак на 1,8 млрд, мы ж паспяваем задаволіць толькі крыху больш як 60 % з іх. І гэта пры тым, што, каб больш паспець, давялося часова арганізаваць працу рабочых у дзве змены.

— А як зніжаеце сабекошт прадукцыі?

— Каб павысіць прадукцыйнасць, для вырабу мэблі набылі новыя бельгійскія станкі. Не так даўно ў нас з'явілася і новая печка для афарбоўкі, якую плануем устанавіць на заводзе. Пакуль што даводзіцца вазіць дэталі, каб іх пафарбаваць і сабраць, за 15 кіламетраў у Пінкавічы. Канвеерная вытворчасць на 10 % зменшыць сабекошт прадукцыі.

Еўрапейскія ноу-хау прыедуць у Пінкавічы

З асартыментам прадукцыі, якую вырабляе СЗАТ «Белмедматэрыялы», пакуль што можна пазнаёміцца толькі на сайце ў інтэрнэце ды ў спецыяльным каталогу. Але пасля таго, як завершыцца будаўніцтва новага вытворчага будынка ў Пінкавічах, цэлы другі паверх плануецца адвесці пад дэмантрацыйную залу. Ёсць у Станіслава Нарывончыка і яшчэ адна выдатная ідэя агульнарэспубліканскага маштабу:

— У Еўропе пастаянна выпускаюцца ноў-хаў медыцынскага прызначэння, — распавядае дырэктар галаўнога прадпрыемства. — Наша кампанія мае багатыя і трывалыя сувязі з замежнымі фірмамі-вытворцамі, таму ўжо ў гэтым месяцы мы запрасілі спецыялістаў з Чэхіі і Швейцарыі, якія расказалі і паказалі галоўным урачам абласцей, як прымяняць новы свяцільнік для медыцынскіх аперацый. У наступным годзе падобныя пазнавальныя ўзаемавыгадныя сустрэчы, якія, перакананы, будуць спрыяць развіццю медыцыны ў нашай краіне, плануем ладзіць штомесяц.

На складзе стаматалагічных расходных матэрыялаў, які мы наведалі, дырэктар паказаў упакоўку са шпрыцамі са светлавым пламбіровачным матэрыялам. Каштуе такая ўпакоўка нямецкай вытворчасці 100 еўра. Беларусі ж штогод патрэбна такіх матэрыялаў больш як на 70-80 млн еўра.

— У Еўропе і ЗША ёсць некалькі заводаў, якія вырабляюць хімічнае рэчыва для светлавой пломбы, — кажа Станіслаў Нарывончык. — А таксама ёсць фірмы, якія з прымяненнем уласных тэхналогій атрымліваюць з гэтага рэчыва канчатковы прадукт, які расфасоўваюць і ўпакоўваюць у сваю тару. Дык вось нямецкія спецыялісты згадзіліся падзяліцца вопытам, абучыць нашых людзей тэхналогіі вырабу пламбіровачнага матэрыялу з гатовых кампанентаў. Наладжванне такой вытворчасці дазволіць дзяржаве не толькі ўкараніць навейшыя тэхналогіі, але і зэканоміць бюджэтныя сродкі, прыцягнуць значныя інвестыцыі, стварыць новыя працоўныя месцы.

«Патрабаванні рынку, пажаданні кліентаў, а таксама ўласнае імя — наш арыенцір»

— Мы, без перабольшвання, «хуткая дапамога» для рэспублікі, — кажа Станіслаў Нарывончык. — Усе неабходныя расходныя медыцынскія матэрыялы, якія мы завозім з Еўропы, заўсёды можна знайсці ў нас на складзе. Акрамя таго, маем уласны грузавы і пасажырскі аўтатранспарт, што дазваляе арганізаваць дастаўку ў любы населены пункт Беларусі. Разам з тым, у прадпрыемства існуюць праблемы ва ўзаемаадносінах з дзяржаўнымі праваахоўнымі органамі, якія неабгрунтавана перашкаджаюць паступальнаму руху наперад, адпужваюць інвестараў. Хацелася б праз вашу газету звярнуць увагу уладаў на гэту праблему.

Напрыканцы размовы я паспрабавала даведацца ў Станіслава Міхайлавіча сакрэт поспеху. На што пачула адказ, якім адназначна павінна кіравацца кожнае прадпрыемства.

— Толькі добрасумленнае выкананне сваіх партнёрскіх абавязкаў, пастаянная ўвага да якасці прадукцыі, актыўнае выкарыстанне новых тэхналогій і доўгатэрміновае планаванне дазволілі нашым прадпрыемствам заняць **лідзіруючае месца на беларускім рынку** медтэхнікі. У сваім развіцці мы абапіраемся на пажаданні кліентаў, а таксама — на ўласнае імя.

УНП 190867933

Адзін з лепшых работнікаў механазборачнага цэха Мікалай ВЕРАБЕЙ.

ТЭХНІЧНАМУ ВІНАГРАДУ Ў БЕЛАРУСІ БЫЦЬ!

Дырэктар Віктар КАНАНЧУК.

ААТ «Пінскі вінаробны завод» — адзінае прадпрыемства ў рэспубліцы, дзе рызыкнулі заняцца тэхнічнымі сартамі вінаграду ў прамысловых маштабах

На ўчастку кандытарскіх вырабаў.

«За вінаградарствам — будучыня нашага завода»

Нетрадыцыйнай для беларускай зямлі культурай займаюцца ў пасёлку Садовым з 2003 года.

— Гэта дарагі бізнэс, — сцвярджае дырэктар ААТ «Пінскі вінаробны завод» Віктар КАНАНЧУК. — Але мы разумеем, што менавіта за вінаградарствам будучыня нашага прадпрыемства. Тым больш што ўкладзеныя грошы спаўна акупяцца пасля, калі нам ужо не трэба будзе вазіць сыравіну для сваёй прадукцыі з-за мяжы.

На землях прысядзібнай гаспадаркі маецца вінаграднік плошчай 30 гектараў, 8 з іх ужо сёння даюць ураджай. **Да 2015 года плошчы вінаграднікаў плануецца давесці да 180 гектараў. На гэтыя мэты заводу, згодна з рэспубліканскай праграмай пладаводства, агародніцтва і бульбаводства на 2011-15 гады, прадугледжана фінансаванне.**

— Пінскі ж райвыканкам, у сваю чаргу, ужо выдзеліў зямлю пад прыдатныя для нашых кліматычных умоў сарты вінаграду, якія паспяваюць выспяваць і даюць патрэбную цукрыстасць і кіслотнасць, — дадаў Віктар Віктаравіч. — Мы не можам на вялікіх плошчах дапускаць бессістэмную пасадку, таму спыніліся на 10 сартах: пяці белых і пяці чырвоных. А вось, дарэчы, і наш галоўны вінаградар.

Аграном завода Чэслаў Ліманоўскі вырошчвае вінаград на сваім прысядзібным участку з 1985 года. Раней, пакуль ён не прыйшоў да заключэння, што ў Беларусі можна займацца вінаградарствам і на прамысловым узроўні, гэта было на ўзроўні хобі.

— Тэхнічны вінаград вырошчваецца і паўночней, напрыклад, у Швецыі, — распавядае аграном. — Хочацца спытаць, а чым мы горшыя? Праўда, у Беларусі няма падрыхтаваных кадраў, таму даводзіцца браць дзяўчат і вучыць іх усім аперацыям па доглядзе вінаграду з нуля. Акрамя таго, нестае ў нашай краіне і гадавальнікаў, дзе б можна было атрымаць пасадачны матэрыял. Але мы знайшлі выйсце з гэтай сітуацыі: самі сабе вырошчваем саджанцы патрэбных сартоў.

Зразумела, што асноўны упор на Пінскім вінаробным заводзе робіцца на тэхнічныя сарты. Але сталовымі тут таксама не грэбуюць: на тэрыторыі завода ёсць цяпліца на 10 сотак. У перыяд выспявання і збору ягад сталовы вінаград рэалізуецца насельніцтву праз гандлёвыя сеткі.

Аграном Чэслаў ЛІМАНЧУК дасканала ведае, як найлепш вырасціць вінаградную лазу, прытрымліваючыся тэхналогіі абрэзкі вінаграду. Маладыя працаўніцы Кацярына АНДРАЙЧУК і Таццяна ЛАЗНЮХА ўпэўнены: ёсць чаму павучыцца ў Майстра.

Дасягненні завода

На працягу апошніх трох гадоў алкагольная і кандытарская прадукцыя завода штогод ганаруецца званнем лаўрэата конкурсу «Лепшыя тавары Рэспублікі Беларусь». У скарбонцы прадпрыемства, акрамя таго, маецца кубак Гран-пры, 11 залатых, 11 срэбных і 6 бронзавых медалёў, заваяваных на міжнародных конкурсах.

Начальнік сельскагаспадарчага ўчастка Віктар ГАЛЯК.

«Пінскія яблыкі нарасхват»

Набірае вытворчыя магутнасці на землях прысядзібнай гаспадаркі і ўласны прамысловы яблыневы сад плошчай 24 гектары, а таксама пасадкі чарнаплоднай рабіны і чорных парэчак.

— У планах завода пашыраць усе насаджэнні, — кажа **начальнік сельгасучастка Віктар ГАЛЯК.** — Так, у прыватнасці, да 2020 года плануем давесці плошчы яблыневага саду да 200 га. Вырошчваем яблыкі дэсертных, пераважна беларускіх, сартоў. Таварныя свежыя яблыкі ідуць на продаж. Яны карыстаюцца попытам у насельніцтва. Пра гэта сведчыць тое, што на сённяшні дзень мы прадалі ўсе яблыкі — 51 тону — дарэшты. Такім чынам прымаем удзел і ў праграме імпартазамяшчэння.

Займаюцца на заводзе і вытворчасцю канцэнтраваных сокаў, якія ідуць на экспарт, а таксама разліўным квасам.

— На прадпрыемстве выкарыстоўваюцца самыя перадавыя тэхналогіі перапрацоўкі сыравіны, — расказвае і паказвае Віктар Кананчук. — Так, сокі вырабляем з чэрвеня па кастрычнік на вакуум-выпарной устаноўцы «Нагема», прадукцыйнасцю 1100 кілаграмаў соку ў гадзіну. Што тычыцца квасу, то ў летні перыяд гэты кірунак таксама надзвычай перспектыўны. Таму плануем яго развіваць і надалей. З гэтай мэтай закупілі 18 новых бочак, таксама разглядаем магчымасць вырабу бутыляванага квасу.

Начальнік кандытарскага ўчастка Марыя ДАБРЫНЕЦ.

У сезон-2011 рэалізавана рэкордная колькасць квасу хлебнага, бястарнага — 262 тысячы літраў.

Майстар вытворчага ўчастка Марыя АСАДЧАЯ і начальнік гэтага ўчастка Аліна МАЦУКЕВІЧ.

Сучасная ўпакоўка павялічыла тэрміны захоўвання

Сёння кандытарская прадукцыя, паводле слоў дырэктара вінаробнага завода, займае ўсяго толькі 5% ад агульнага аб'ёму вытворчасці. Праўда, у хуткім часе плануецца павялічыць вытворчыя аб'ёмы ласункаў, тым больш што ў экспартных пастаўках зацікаўлены за мяжой, у прыватнасці, у Расіі.

У кандытарскім цэху пад Пінскам вырабляецца некалькі тыпаў кандытарскіх вырабаў. Па-першае, тры віды натуральных малочных цукерак накшталт кароўкі: «Мілка», «Мілка духмяная» і «Мілка з какавай». Па-другое, тры разнавіднасці ірысу з характэрным прыемным смакам уваранага малака: «Школьны», «Дзіцячы» і «Прыма». Прадаецца ён, як і 9 найменняў усходніх ласункаў «Лукум», на вагу, а таксама ў яркай сучаснай упакоўцы. Чацвёрты від прадукцыі — жэлейны мармелад «Калейдаскоп» пірамідальнай, авальнай і круглай формы фасуецца ў поліпрапіленавую плёнку масай нета 100 грамаў.

— Працуем у асноўным на айчыннай сыравіне, — распавядае **начальнік кандытарскага ўчастка Марыя ДАБРЫНЕЦ.** — З імпартных інгрэдыентаў выкарыстоўваем толькі какава-парашок і арахіс. Наша прадукцыя не змяшчае кансервантаў і карыстаецца попытам па ўсёй рэспубліцы. І мы, шчыра прызнацца, не паспяваем яго задавальняць. Бо ў нас пакуль што ў асноўным ручная праца, а ў цэху працуе 36 чалавек.

Паводле слоў Марыі Дабрынец, у дырэктара Пінскага вінаробнага завода на кандытарскі ўчастак грандыёзныя планы. Збіраецца яго механізаваць. Так, нядаўна набылі новую фасавачную машыну. У бліжэйшы час набудуць і яшчэ адну машыну, чэшскую ўпаковачную, якая будзе паштучна загортваць цукеркі. Што тычыцца ўпакоўкі, то іх год таму ўкаранілі на ўсе віды кандытарскіх вырабаў. Што, у сваю чаргу, і дазволіла павялічыць тэрміны захоўвання, а значыць, і рэалізацыі прадукцыі ад 25 дзён да трох месяцаў.

Пінскі вінаробны завод займае каля 30 % у аб'ёме паступлення ў раённы бюджэт.

УНП 200110728
Матэрыялы спецвыпуску падрыхтавалі Надзея ДРЫЛА
Сымон СВІСТУНОВІЧ,
Алена ДАЎЖАНОК.
Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ і з архіваў прадпрыемстваў.

На фоне вакуумна-выпарнога станка в.а. майстра ўчастка Наталля ЦЯРЭШКА.

ПРАЗМЕРНАЕ ЎЖЫВАННЕ АЛКАГОЛЮ ШКОДЗІЦЬ ЗДАРОЎЮ

Сітуацыю даследуе карэспандэнт

«ЧОРТАВА КОЛА»

Калі ўзнікае абсурдная сітуацыя, то пажадана патушыць яе на самым пачатку, а інакш усе, хто ўцягваецца ў працэс, становяцца заложнікамі абсурду. Нешта падобнае і здарылася ў Ляхавіцкім раёне.

Дэпутат У. Майсюк над скаргамі І. Дыдышкі.

Калі зайшоў у кабінет старшыні райсавета Яўгена Юрлевіча, то ўбачыў там дэпутата Нацыянальнага сходу Уладзіміра Майсюка, які сядзеў за сталом над паперамі. А папер тых сабралася аж 7 аб'ёмістых папак. Адкуль яны з'явіліся?

Пенсіянер з вёскі Ліпск, якая знаходзіцца ў палескай зоне раёна, Іван Дыдышка прад'явіў прэтэнзіі суседцы Ніне Гапановіч, якая на сваім участку рассыпала, на думку Івана Пятровіча, празмерную колькасць мінеральных угнаенняў, ад чаго вада ў яго калодзежы сапсавалася. Даказваючы сваю праўду, Іван Пятровіч дайшоў да Вярхоўнага Суда, але на ўсіх узроўнях суд яго не падтрымаў.

Толькі ў 2010 годзе І. Дыдышка 8 разоў звяртаўся пісьмова ў Брэсцкі аблвыканкам, двойчы — у Адміністрацыю Прэзідэнта і ва ўсе ўладныя структуры: Савет Міністраў, Камітэт дзяржкантролю, пракуратуру... Дакументы з вышэйстаячай інстанцыі ідуць у раён, і вось на адным дакументе я прачытаў змест звароту: «Заяўнік некалькі гадоў пражывае без вады і сцвярджае, што прадстаўнікі дзяржаўных органаў улады прымяняюць да яго псіхічную і фізічную сілу». Прачытаў і не ведаў, што думаць.

У газетным артыкуле немагчыма падрабязна пераказаць усе перыпетыі «ліпскай справы», таму я спынюся толькі на ключавых момантах.

Узятыя пробы вады сапраўды паказалі наяўнасць нітратаў звыш нормы ў калодзежы І. Дыдышкі, але аналагічная сітуацыя з водою аказалася і ў іншых калодзежах вёскі. Значыць, усё больш складана і не завязана толькі на Н. Гапановіч, якая пасыпала свой агарод мінеральнымі ўгнаеннямі.

ДАВЕДКА. *Большая частка вясковага насельніцтва краіны карыстаецца вадою з прыватных калодзежаў, і вада больш чым у 70 працэнтаў калодзежаў утрымлівае павышаную колькасць нітратаў. А звязана гэта, найперш, з інтэнсіўным земляробствам, жывёлагадоўляй, меліярацыяй, неадпаведнасцю калодзежаў санітарна-гігіенічным нормам... Асабліва складаная сітуацыя на Палессі, дзе грунтовая вада можа залягаць на глыбіні 3 метраў. А гэта значыць, што не толькі мінеральныя ўгнаенні з палёў могуць трапіць у калодзежы, а і жыжка з жывёлагадоўчых фермаў, якую вывозяць на палі, адходы з уласных хлявоў, якія знаходзяцца побач з калодзежамі... Праблема гэтая сусветная. Вунь у краінах Еўрасаюза многія стараюцца купляць гародніну экалагічна чыстую, плацяць за яе ў разы больш і п'юць, найперш, бутыляваную ваду. Пракарміць 7 мільярдаў насельніцтва планеты без выкарыстання мінеральных угнаенняў і хімпрэпаратаў для аховы раслін — нерэальна.*

У калодзежы Івана Дыдышкі пры норме 45мг/дм³ было выяўлена 133 мг/дм³ нітратаў.

Карацей кажучы, Ляхавіцкае прадпрыемства ЖКГ двойчы адпампоўвала ваду з калодзежа І. Дыдышкі. Зрабілі гліняны замок і адмостку наўкол калодзежа, але ачысціць ваду ад нітратаў не ўдалося. Утрыманне іх у вадзе засталося на ўзроўні 54,31мг/дм³. Трэба адзначыць, што заключэнню ДУ «Ляхавіцкі раённы цэнтр гігіены і эпідэміялогіі» Іван Пятровіч не паверыў і, як ён піша, «звярнуліся ў Мінск, аказалася, што наша вада не адпавядае санітарным нормам».

Чытаючы «мінскае заключэнне» ад 29 красавіка 2010 года, я звярнуў увагу, што ваду для аналізу ўзялі «з шахтавага калодзежа ў г. п. Мачулішчы Мінскага раёна». У такім разе прычым тут калодзеж Івана Дыдышкі?

— А я перадаў сваю ваду брату, які жыве ў Мачулішчах, — заявіў Іван Пятровіч. Магчыма, гэта і так, але заключэнне тое не з'яўляецца дакументам, бо ў ім зафіксаваны аналіз вады не з Ліпска.

Ачысціць поўнасцю ваду не ўдалося не таму, што камунальнікі аказаліся слабымі спецыялістамі, а гэта звязана з тым, што ачысціць калодзежную ваду ад нітратаў надзвычай складана. Адпампавалі, а свежая вада, таксама з нітратамі, паступае, як і ва ўсёй вёсцы.

Каб закрыць праблему, вырашана было ў Ліпску пракласці водаправод. Знайшлі некалькі сотняў мільёнаў рублёў, і насупраць хаты Івана Дыдышкі з'явілася калонка. Але і пасля гэтага скаргі працягваліся.

Перадапошні ліст напісаны мітрапаліту Філарэту.

«...чыноўнікі ўсіх чыноў і рангаў забілі інваліда.... знаходжуся на мяжы жыцця і смерці каля трох гадоў без вады», — напісаў пенсіянер і падкрэсліў, між іншым, што грашовы перавод ці грашовай дапамогі ён ад мітрапаліта не прыме, бо з'яўляецца хрысціянінам.

А з Мінскай епархіі адказалі, што «пытанні, выкладзеныя ў звароце, не ўваходзяць у кампетэнцыю Беларускай праваслаўнай царквы». І гэта сапраўды так, бо калі такая праблема існуе, то яе павінна вырашаць свецкая ўлада.

Апошняя скарга была даслана ў Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу. У тым лісце Іван Пятровіч «наехаў» на дэпутата Уладзіміра Майсюка і не выбіраў слоў... Вось і сядзіць Уладзімір Уладзіміравіч над паперамі. Каб адзін чалавек здолеў «накруціць» такую колькасць розных рашэнняў, адказаў і заключэнняў, мне за 17 гадоў працы ў газеце не даводзілася бачыць.

У Ліпск выехала цэлая група спецыялістаў на чале са старшынёй райсавета Я. Юрлевічам і дэпутатам У. Майсюком.

Хата ў І. Дыдышкі, можа, адна з лепшых на вуліцы, і двор у парадку. Пагаварылі з суседкай, якая жыве насупраць.

— Я водаправад правяла ў сваю хату, хоць у мяне і пенсія малая — усяго 600 тысяч, і ўнукі на мне, але пазычыла грошы і заплаціла 800 тысяч, — расказала жанчына.

Націснулі на рычаг калонкі, і вада заструменілася. Якое тут «знаходжанне на мяжы жыцця і смерці без вады»?

Зайшлі ў хату да Івана Дыдышкі. Гаспадар з гаспадыняй былі на кухні і ўжо ведалі, што да іх прыехалі. Сустрэлі насцярожана. Аказалася, што весці спакойна размову не проста: гаспадароў перапаўнялі эмоцыі. Тым не менш, удалося задаць некалькі пытанняў.

— Іван Пятровіч, вы лічыце, што суседка вас пакрыўдзіла, то падалі б у суд і там даказалі б праўду.

— А ўсе суды прадажныя, паглядзіце, што яны пішуць. Да ўлады прыйшлі ўнукі Цанавы *(паплечнік Л. Берыі, узначальваў НКУС Беларусі)*.

— Вы кажаце, што вас палкай біў старшыня сельсавета Буйкевіч, то чаму б не заявіць у міліцыю, не зняць пабоі...

Але тут умяшалася гаспадыня і ўдакладніла:

— Ён не біў. А хацеў пабіць, замахнуўся...

Іван Пятровіч настойваў на сваім.

— А што я магу зрабіць, калі ўсе павязаны.

— У сваіх скаргах вы ганьбіце ўсіх начальнікаў — ад сельсавета да сталіцы. А ці ёсць хоць адзін, каго вы можаце пахваліць?

— Ёсць, Крук (намеснік старшыні райвыканкама па ідэалогіі), ён выслухае, падтрымае...

— Улада кепская, а хто даў вам даглядчыка і плаціць яму 370 тысяч за тое, што прынясе вядро вады? Пры якой уладзе такое было?

— Дзяржава мне дала.

— Добра, няхай дзяржава будзе без улады, але чаго вам яшчэ не хапае? Побач калонка, а вы пішаце, што знаходзіцеся на мяжы жыцця і смерці, бо няма вады.

— Водаправод — гэта збор нечыстотаў, і ваду адтуль не браў і браць не буду.

— Іван Пятровіч, вы дэпутата Майсюка бачылі хоць раз, гаварылі з ім?

— Не.

— А чаму ж у сваім апошнім лісце вы аблілі яго брудам? Хто даў вам права? Паглядзіце, а ён стаіць у вашай хаце.

Праз хвіліну я выйшаў на вуліцу і меў размову з сацыяльным работнікам Таццянай Навікевіч. Жанчына ішла з веласіпедам, на якім ездзіць за 3 кіламетры ад Ліпска да састарэлых.

— Скажыце, а ў вас клопату шмат? Людзі ў гадах, нямоглыя, напэўна, капрызнічаюць?

— Ды не, у мяне іх 7 чалавек. Прынясу вады, дроў, нешта ў краме куплю... Пакуль што ніякіх прэтэнзій не чула.

А Іван Дыдышка напрыканцы размовы заявіў, што не будзе пісаць, калі яму ў хату бясплатна правядуць водаправод, калі знімуць некага там з пасады, папросяць прабачэння... За што?

Праўда, пісаць пасля паслання Мітрапаліту застаецца толькі на неба, бо ўжо ўсе інстанцыі ў межах краіны пройдзены.

Назаўтра я патэлефанаваў у Крывошынскі сельсавет, каб удакладніць прозвішчы, і пачуў, што ўжо некалькі чалавек званіла і абуралася, чаму І. Дыдышку бясплатна будуць праводзіць ваду.

— У мяне пенсія ўдвая меншая, чым у яго, і я таксама хворая, а мне трэба плаціць, — абуралася адна пенсіянерка.

Івану Дыдышку 71 год, і пенсія ў яго па вясковых мерках вялікая — 1186560 рублёў, прычым атрымлівае ён яе па інваліднасці (агульнае захворванне). Жонка інвалідам не з'яўляецца.

Сустрэўся і з кіраўніком Ляхавіцкага райвыканкама Дзмітрыем Бурдуком.

— Дзмітрый Міхайлавіч, чым жа вы прагнявілі Дыдышку з Ліпска, чаму ён на вас слоў не шкадуе і не выбірае?

— А каб толькі на мяне нападаў — на ўсіх. Раніцай раз патэлефанаваў мне, затым другі... А ў мяне народ, я і сказаў, што не магу доўга гаварыць. Ды кожны раз адно і тое ж.

— Усім вядома, што вы чалавек вельмі вытрыманы, але калі жонка Дыдышкі хрысціцца на абразы, крычыць і плача..., то цяжка ўсё гэта чуць.

— Што ж, у такой сітуацыі Бог — суддзя. Я іх не абразіў, але правесці бясплатна водаправод па законе не можам, бо Іван Дыдышка пад ільготы не падпадае.

— Людзі ўжо звоняць у сельсавет і патрабуюць, каб і ім падвялі бясплатна ваду.

— Вось я пра гэта і кажу. Тут ці дзейнічаць па законе, ці праводзіць усім, бо сёння на вёсцы ў кожнай хаце ёсць хворы ці нямоглы.

«Па законе» водаправод і газ праводзяцца за сродкі дзяржбюджэту толькі па вуліцах, а ў хату кожны гаспадар праводзіць за свае грошы. З водаправодам па вёсках склалася неадназначная сітуацыя. Бывае водаправод пракладзены, а людзі да хаты не падводзяць. Навошта плаціць той мільён, калі ваду можна і ў калодзежы ўзяць ці з калонкі? А пра нітраты ніхто не думае... Хоць гэта не значыць, што так павінна быць. Але нас прывучылі, што дзяржава павінна адрамантаваць дах, плот, падвесці ў хату ваду...

Іван Дыдышка піша: «Здзекі з мяне — гэта не што іншае, як праўленне Сталіна».

Іван Пятровіч, калі б было праўленне Сталіна, то вы за любы адзін радок з вашага толькі аднаго пісьма назаўсёды зніклі б з Ліпска. А вы паставілі на дыбкі ўсю краіну, абражаеце ўсіх без разбору, а вам далі даглядчыка, двойчы адпампавалі ваду, дапамагаюць з дровамі...

Аглядальнае кола, якое ёсць у некаторых гарадах, у народзе называецца «чортавым». Калі яно пачало круціцца, то не саскочыш. Так і ў нашым жыцці, запусціць нехта адну скаргу, другую... і такі пойдзе працэс, такое «чортава кола» атрымаецца, што не адна ўстанова не саскочыць, а ўключыцца ў працэс, няхай і абсурдны.

Але ж нехта павінен «вырубіць рубільнік», каб гэтую карусель спыніць.

Абразіла цябе суседка — падавай у суд, пакрыўдзіў нехта іншы — туды ж пішы заяву. Ва ўсім цывілізаваным свеце апошняй інстанцыяй з'яўляецца суд. Ніхто не сцвярджае, што наша судовая сістэма самая-самая — яе неабходна ўдасканальваць. Але калі мы не хочам круціцца ў абсурдным «чортавым коле» — павінны рухацца ў гэтым кірунку.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.
Фота аўтара.
Ляхавіцкі раён.

Прыехалі разбірацца.

Простая мова

ПАКУЛЬ ЗБІРАЎСЯ ЖЫЦЬ...

Насамрэч гэта так: можна бясконца глядзець, як цячэ вада, як гарыць агонь і як нехта працуе. ...Іх, гэтых працуючых, двое (пад вокнамі) — бабуля-пенсіянерка і зусім малады чалавек. Яны ў аднолькавых зеленкаватых куртках і чорных шапках, з аднолькавым інструментам: вялікімі мётламі змятаюць з тратуара снег. Але па-рознаму: за ёй — чысценька-чыста, голыя клетачкі плітак, за ім — што мёў, што не мёў... Што ўласціва (вы кажаце) — мужчынам і жанчынам? Ці... двум пакаленням? Таму, што ўжо сыходзіць, і таму, што на змену ідзе?

Кватэрнае пытанне

Анекдот (адным радком): унук стагадовай бабулі разпісхаваўся і вырашыў сам купіць сабе кватэру.

Чыстая праўда: Лявонаўне не сто — на добрых пятнаццаць меней. Не дзіва, што на нагах, не дзіва, што пры памяці і сама сябе абслугоўвае, дзіва, як сама з сябе смяецца.

Распавядае вось, як купіла новую электразапальнічку для газавай пліты, як праз месяц панесла яе назад у краму, бо тая, з месяц паслужыўшы, зламалася, як сабраўся там цэлы «кансіліум», каб прызнаць, што ў запальнічцы села батарэйка і варта яе памяняць... Гэта лёгка, маўляў, і зрабіць можна тут жа. Адзінае — якую паставіць? Таннейшую — яна гады са два паслужыць, альбо даражэйшую, каб на чатыры хапіла?

Пакупніца, не доўга думаючы, выбрала другую. І назаўтра, відаць, забылася б. Унук нагадаў (ён жанаты, «дзетны», на яго, што важна, кватэра апісана)... Вечарам зайшоў да яе, стаў распытваць пра тое, што яна днём рабіла, дзе была. Прыйшлося расказаць...

Не, той не псіхаваў... Але, як згледзела бабуля, спалохаўся.

І засмуціўся.

Не наступай!

Знаёмая з сіняком. Прычым класічным — пад вокам... Нельга ж не спытаць, адкуль ён.

— Вы не паверыце! — са смехам (і не ў першы раз, відаць) заводзіць жанчына, — гэта ж я панесла вады курам... І як хацела глянуць. Толькі да гнёздаў, а дзверы — бразь — і зачыніліся. Ведама — вецер... Дык я іх граблямі падперла. Яйкі ўзяла, выходжу, а на падпорку ж ужо забылася. І нагой...

Тлумачальны слоўнік піша, што «граблі — гэта сельскагаспадарчая прылада для зграбання сена альбо саломы». І НЕ піша, што гэта ці не адзіная рэч, якая можа... пастаяць за сябе. Ды так, каб запомніў.

І заказаў дзясятаму.

Іншыя часы...

У Антонаўны дзве даты, у адначассе, можна сказаць, — 50 гадоў з дня народзінаў і 30 на адным прадпрыемстве. Цікава ж, як адзначыла.

— Ой, — махае рукамі, — лепш не пытайцеся...

Але ж — распавядае. Ну, што дзяўчаты, каляжанкі яе, як водзіцца, скінуліся — купілі падарунак. Яна — адпаведна — цукерак і шампанскага. А дома спякла пірог...

І ад начальства «ганец» з'явіўся. Праўда, незнаёмы, зусім малады («яны там як пальчаткі мяняюцца»), але ж прамову трымаў. І чын чынам. Казаў, прынамсі, што ў яе працоўнай кніжцы — бездоганны адзнак і толькі адно месца працы; што яна — майстар; што дзякуючы ім, вось такім, прадпрыемства трымаецца і нават, магчыма, будзе... Моцнага здароўя пажадаў, уручыў галінку хрызантэм і канверцік...

Потым, што іх трохі здзівіла, прыняў запрашэнне за стол. І ўжо там, за шампанскім (да слова прыйшлося) выдаў, мусіць, тое, што насамрэч хацеў. Сказаў: цяпер вам, маўляў, пяцьдзясят, гэта ўзрост, а значыць, на іншую працу вас проста не возьмуць. Але ж на вось гэтай «па-нармальнаму» не плацілі ніколі! Дык чаго тут сядзець было? Цэлых 30 гадоў...

— Хацела яму сказаць, — смяецца жанчына, — што прырасла неяк тут — да людзей, да прафесіі... Што ў наш час не модна было з месца на месца лётаць...

Іншыя часы: у іх — не модна сядзець.

Каб...

Сталіца, кавярня. Імяніннік частуе нас рознай смакатой — загадзя замовіў столік...

Суседні, паблізу, займаюць двое — ён і яна, пажылыя, інтэлігентныя...

— Мы ж па кубачку кавы? — удакладняе мужчына, беручы ў афіцыянткі меню. — Ці табе яшчэ нешта ўзяць?

— Магчыма, — шматзначна «спявае» яго спадарожніца і таксама разгортвае папку.

Наступнае, што чуем:

— Пайшлі адсюль...

Загадвае гэта жанчына, відавочна — мужу, брату ці вельмі блізкаму сябру.

Здагадаліся потым чаму: кубачак кавы ў той кавярні каштуе 19 тысяч.

...Яшчэ продкі заўважалі, што «хадзіў бы ў злоце, каб не дзірка ў роце». І «каб не ежка, не адзежка, была б грошай поўна дзежка».

Жывы курылка!

Без блату нейкі час пажылі. І — здавалася — нават будзем. Але ж не — не з нашым шчасцем, відаць, бо...

Крама. Чарга. Без іх мы таксама крыху пажылі... А цяпер во стаім — і ў самым хвасце. Ён доўгі, пакручасты, ён пралягае паўз вітрыны (яны ж халадзільнікі) мяснога аддзела, потым — малочнага.

У ім народу няма — толькі прадавачка.

— Молоко и кефир я купила, — напаўшэптам дакладае яна па мабільным, — сметану тоже. Была у нас, только что — в баночках, по две тысячи с хвостиком... Так что не волнуйся — я побеспокоилась: взяла тебе, себе...

Каму яшчэ — не чуваць. Але ж не мне, не абсалютнай большасці пакупнікоў, якім тыя ж самыя (штодзень патрэбныя!) хлеб, кефір, малако, тварог, смятану і іншае трэба купляць куды даражэй.

Альбо зноўку шукаць блату.

Ім прасцей

Віка не замужам. І не была. Кажа, што сама вінаватая, бо маладая, дурная, заказалася ў жанатага, з перыферыі. Той раз у месяц прыязджаў, кляўся-бажыўся, што развядзецца, зробіць кар'еру («возьме Мінск») і тут распачне ўжо новае жыццё — з ёю. Спала і бачыла... Галоўнае — зблізку ўжо, бо па той службовай лесвіцы ён сапраўды падымаўся!

А «зваліўся» ўміг: няшчасны выпадак на вытворчасці, трое пацярпелых, крымінальная справа, суды... Не да Вікі было... Ды і засталася. Адна... Хоць кавалеры і здараюцца.

Па выхадных, прынамсі, яна да бабулі ездзіць — нешта памыць, папрасаваць, у краму схадзіць. Дык вось, калі надоечы адтуль вярталася, яе сусед запыніў (прыгожы, казала, мужык...), да сябе падазваў (ён — інвалід-калясачнік), «камплімент адвесіў» — сказаў, што калі б быў на нагах і здаровы, то канча з ёй ажаніўся б!

Рада была: цэлы дзень як на крылах лётала, увечары толькі дайшло, што калі б ён быў на нагах і здаровы, то (відавочна ж!) недзе працаваў бы, некуды ездзіў, хадзіў, з некім сустракаўся і таксама ажаніўся б.

Як усе яе аднакласнікі, як усе аднагрупнікі...

І далёка не ўсе аднакласніцы і аднагрупніцы.

Каму добра...

...Яны — бацька, маці, іх дарослы сын і дачка — ужо з мужам і дзіцем — жылі разам. Месца, можна сказаць, хапала, бо ў кватэры былі, хай не вялікія, але ж чатыры пакоі, ладная кухня і ўсе выгоды. Але...

Гаспадар дужа ж любіў выпіць. Зяць канфліктаваў з цешчай (ці наадварот?), нежанаты сын хацеў прыводзіць сябровак...

Усё гэта, як адліжны снег, ляпілася адно на адно. І нарэшце...

І нарэшце, як ні цяжка было, яны раз'ехаліся.

Бацькі цяпер жывуць асобна ад дзяцей, дзеці — ад бацькоў: зяць — ад цешчы (ура!), цешча — ад зяця (ура трохразовае!)...

І толькі кот не разумее нічога: вялікі, стары ён сядзіць у вітальні, глядзіць на ўваходныя дзверы і зрывае голас, раве — прасіцца дамоў, туды, дзе ўсе, каго ён любіў, былі разам.

Сапраўдны палкоўнік!

...Мацвееўна багатырка — ці не сем выданняў выпісвае. У тым ліку — адно замежнае. Што важна — усе чытаюцца (у вёсцы, пры вялікай гаспадарцы!), потым лепшае пускаецца па руках.

Невялічкая нататка з «Литературки» пад рубрыкай «Ведай нашых!»: рэдакцыя вішуе са... 104-м днём народзінаў аднаго са сваіх ветэранаў, паведамляе, што нарадзіўся ён за дзесяць гадоў да рэвалюцыі, ваяваў, узнагароджаны, мае званне палкоўніка, 35 гадоў адпрацаваў у газеце. Ды і цяпер шмат чытае, піша ўспаміны пра мінулы век, каб не адстаць ад часу, асвоіў камп'ютар...

Вось гэта — палкоўнік! Вось гэта — маладзец — ну згадзіцеся!

І ведаць пра яго трэба. Усім. А найболей тым, хто ў свае пяцьдзясят-шэсцьдзясят-семдзесят ужо вырашыў, што жыццё ўжо скончана.

Пакуль збіраўся жыць...

Лістапад. Дзяды і могілкі.

Зрэшты, нам больш прывычнае слова магілкі, бо па-першае, так гаварылі бацькі, а па-другое, гэта цалкам лагічна, бо вось жа магілка (іх, бацькоў), вось — гаротнікадзеда, цёткі і дзядзькі, мамінай сяброўкі і яе дачкі, вось — шаноўнага доктара, настаўніцы... На помніках знаёмыя прозвішчы, прывычныя літары: зверху і злева «ЗП» (чытай «здесь покоится»), справа — «РБ» («раб божий»). Ці...

Толькі цяпер даходзіць, што акурат гэтымі ж дзвюма ўвесь час пазначала радкі Рыгора Барадуліна.

З любімых:

«Пакуль збіраўся жыць,
Жыццё прайшло...»

Гэта пра тых, хто ўжо зрабіў найцяжэйшую справу (гэта значыць, памёр?) і цяпер «здесь покоится?».

Ці пра тых, хто ўсё яшчэ збіраецца — жыць?

Валянціна ДОЎНАР.

Зімуе восень позняя
у скверыку на лаўцы,
Туманы лашчаць мокрую алею.
Шаноўныя зімолагі,
дарадцы-снегазнаўцы,
Дзе вашы абяцаныя завеі?
Шкада, што не тлумачыцца
сучаснаю навукай,
Чаму у снежні снегу не хапае.

Мо Дзед Мароз адкажа —
у шыбу мне пастукае,
А лепш — няхай Снягурка завітае!
Спытаюся, ці верыцца
паненцы у дзівосы,
Што дзеюцца сярод святочнай ночы...
А на алеях снежаньскіх
то дождж, то снег з нябёсаў
І да мяне мая Снягурка крочыць.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИЗОЛИРОВАННЫХ ПОМЕЩЕНИЙ, НАХОДЯЩИХСЯ В СОБСТВЕННОСТИ ЗАО «ВЯСНЯНКА»

№ лота	Наименование объекта, его местонахождение, арендуемая площадь, кв.м	Начальная цена продажи (с учетом НДС), руб.	Сумма задатка, руб.	Характеристика объекта	Условие продажи
1	Изолированные помещения (с инвентарными номерами 700/D – 99094, 700/D – 99093, 700/D – 99091) общей площадью 4 429,8 кв.м, расположенные по адресу: г. Могилев, ул. Ленинская, 91	14 882 400 000	744 120 000	Изолированные помещения расположены в трехэтажном здании 1986 г. постройки: с инвентарным номером 700/D – 99091 площадью 977,8 кв.м – на 1 этаже, с инвентарным номером 700/D – 99093 площадью 1567,1 кв.м – на 2 этаже, с инвентарным номером 700/D – 99094 площадью 1884,9 кв.м – на 3 этаже и тех. этаже. Стены – крупнопанельные; перегородки – гипсобетонные; перекрытия – железобетонные; оконные проемы – двойные, окрашены; дверные проемы – простые. Имеется центральное отопление, электроснабжение, водопровод, канализация, лифт, телефон	Покупатель не использует данные площади для организации швейного производства

Аукцион состоится 27 января 2012 года в 15.00 в зале заседаний Могилевского городского исполнительного комитета по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а. Заявки принимаются ежедневно с 27 декабря 2011 в рабочие дни с 8 до 17 часов по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, каб. 411. **Последний день приема заявок и внесения задатка – «25» января 2012 года**. Заключительная регистрация участников аукциона «27» января 2012 года с 14 до 15 часов.

Аукцион состоится «27» января 2012 года в 15.00 в зале заседаний Могилевского городского исполнительного комитета по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а.

Организатор аукциона: МГУКП «Центр по приватизации», 212030, г. Могилев, ул. Первомайская, 28а.

Продавец: Закрытое акционерное общество «Могилевская швейная фирма «Вяснянка».

Имеется решение об отводе земельного участка.

Для участия в аукционе необходимо в сроки, указанные в извещении, представить в МГУКП «Центр по приватизации» следующие документы:

заявление на участие в аукционе;

подписанное с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон;

копию платежного поручения либо иного документа заверенного банком о перечислении задатка на расчетный счет МГУКП «Центр по приватизации» 3012430089016 Дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Могилевской области, МФО 153001739, УНН 700008710;

индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копию свидетельства о государственной регистрации и его подлинник для его заверения организатором торгов;

юридическим лицом – доверенность, выданную представителем юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии учредительных документов и свидетельства о государственной организации юридического лица и их подлинники для заверения их копий организатором торгов;

иностранным юридическим лицом, иностранной организацией, не являющейся юридическим лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств, иностранным государством и их административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организацией – легализированные в установленном порядке копии учредительных документов, выписка из торгового реестра страны происхождения (выписку должна быть произведена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на русский или белорусский язык;

представителем иностранного инвестора легализированную в установленном порядке нотариально удостоверенными переводами на русский или белорусский язык;

представителем гражданина Республики Беларусь, в том числе индивидуального предпринимателя, – доверенность.

При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане, физические лица (граждане Республики Беларусь и лица без гражданства), постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, представители иностранных инвесторов предъявляют документ, удостоверяющий личность.

Лица, желающие принять участие в аукционе и выполнившие все требования, допускаются к участию в аукционе посредством выдачи билета участника аукциона, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано.

Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену.

В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником аукциона, предмет торгов по решению аукционной комиссии продается этому лицу при его согласии (далее – лицо, приравненное к победителю аукциона) по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

До подписания договора купли-продажи победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3 рабочих дней, не считая дня проведения аукциона, обязан в соответствии со счетом-фактурой возместить организатору аукциона фактические затраты на его организацию и проведение. Договор купли-продажи заключается Продавцом и победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) в течение 10 рабочих дней с даты подписания протокола о результатах аукциона.

Оплата стоимости приобретенного на аукционе предмета торгов осуществляется победителем (лицом, приравненным к победителю) аукциона в белорусских рублях в установленном порядке.

Условия оплаты – разовый платеж.

С объектами можно ознакомиться ежедневно в рабочие дни недели с 8 до 17 часов.

Контактные телефоны: г. Могилев (0222) 22 21 78, 22 00 89.

Дарагая ўнучатая пляменніца Алеся Гаруна і паэтэса **Браніслава ЛАНКОЎСКАЯ-ПРУШЫНСКАЯ**! Дарагая паэтэса **Раіса РАМАНЧУК**! Дарагая **паэтэса Людміла ШУВАЛАВА**! Віншую вас усіх з Новым 2012 годам, з новым шчасцем! І кожную вас з юбілеем у ім! Жадаю шчасця яшчэ раз, здзяйснення ўсіх мар і здароўя, новых твораў!

Міхась МАЛІНОЎСКІ, *г. Баранавічы.*

Віншую **Кацярыну ТУРЫК** з юбілеем! Каб спадарожнікам было здароўе, каб у дзверы не стукалася бяда. Няхай сэрца не ведае ні болю, ні нуды. Няхай весялосць прыносяць родныя і сябры.

Сястра.

Факт

Піратэхніка без дакументаў

Рэйды, якія праводзіць міліцыя ў перадсвяточны час на рынках Гомельшчыны, прыносяць пэўны плён. Так, у Чыгуначным раёне абласнога цэнтра быў выяўлены пакет, дзе знаходзілася звыш 450 адзінак петардаў, уладальнік якіх устанаўліваецца. У прыватным гандлёвым пункце ля аўтамабільнага рынку ажыццяўлялася рэалізацыя піратэхнікі без адпаведных сертыфікатаў і пратаколаў выпрабаванняў. Тут было канфіскавана каля 7200 выбуховых прылад на суму Вг7,3 млн. Амаль на такую ж суму былі канфіскаваны феерверкі ў індывідуальнага прадпрымальніка, які гандлявaў імі ў гандлёвым павільёне па праспекце Касманаўтаў.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Не запомніўся ўрок...

Было каля апоўначы, калі работнікі Гродзенскай абласной інспекцыі аховы жывёльнага і раслiннага свету ў лясным масіве каля адной з вёсак затрымалі трох мужчын-паляўнічых.

Тыя палявалі пры дапамозе аўтамабіля, фары і незарэгістраванай паляўнічай стрэльбы. Як высветлілася, двое з гэтай кампаніі ўжо прыцягваліся да адміністрацыйнай адказнасці за парушэнне правілаў палявання. У лістападзе суд Гродзенскага раёна абодвум прызначыў штраф, пры гэтым аднаго з парушальнікаў пазбавіў права палявання на паўгода, другога — на год. Цяпер затрыманых чакае больш суровае — крымінальнае — пакаранне.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ДЗЯДЫ МАРОЗЫ ПРАГУЛЯЛІСЯ, АЛЕ НА НАДВОР'Е НЕ ПАЎПЛЫВАЛІ

Сталічнае шэсце Дзядоў Марозаў, Снягурак, калядных і іншых казачных і мульцяшных персанажаў сёлета не было гэткім масавым, як у ранейшыя гады (магчыма, з-за ўздзеяння глабальнага пацяплення). Тым не менш прыгожая перадnавагодняя традыцыя не парушылася і прынесла маленькім мінчанам шмат радасці. Сёлета «дзедмарозаўскае» войска, якое складалася з прадстаўнікоў і прадстаўніц усіх сталічных раёнаў, брава пракрочыла ад галоўнай ёлкі на Кастрычніцкай плошчы да ёлкі каля Палаца спорту (раней было наадварот) і засведчыла пра хуткі надыход самага вясёлага і амаль казачнага свята. Падтрымаць калядна-навагодні настрой мінчан імкнуліся таксама майстры агню і нават экзатычны госць з самой Паднябеснай — залаты дракон.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

36,6°

АБАЛОНКІ ТАБЛЕТАК МОГУЦЬ ПРЫВЕСЦІ ДА БЯСПЛОДНАСЦІ

Абалонкі таблетак і капсул адмоўна ўплываюць на рэпрадуктыўную функцыю чалавека. Да такога меркавання прыйшлі заходнія навукоўцы, паведамляюць інфарм-агенцтвы.

Вялікая колькасць лекаў і дабавак маюць у сваім складзе фталаты — злучэнні, якія можна знайсці ў пластыку. Фталаты правакуюць гарманальныя змены і выклікаюць праблемы з боку рэпрадуктыўнай сістэмы.

Навукоўцы, якія выявілі гэты факт, не ведаюць, якім менавіта чынам канцэнтрацыя фталатаў у таблетках адаб'ецца на здароўі. Але адно можна сказаць дакладна: для дзяцей і цяжарных жанчын яны ўяўляюць небяспеку, асабліва калі медыкамент ужываецца рэгулярна. Цалкам выключыць фталаты з прэпаратаў нельга. На ўпакоўцы не пазначаецца іх утрыманне, а распрацоўшчыкі лекаў зацікаўлены ў тым, каб людзі працягвалі піць таблеткі.

Так, даследчыкі выявілі павышаную канцэнтрацыю фталатаў у мачы пацыентаў, якія прымаюць сродкі, што прызначаюцца пры мукавісцыдозе, хранічным запаленні страўнікава-кішачнага тракту. У цяперашні час, да прыкладу, у Штатах ад фармвытворцаў не патрабуюць паказваць на ўпакоўцы, што тут выкарыстаны фталат. А вось аналіз 500—1000 БАДаў і лекаў выявіў: больш за 100 сродкаў змяшчалі дзве формы фталатаў, якія аказваюць згубны ўплыў на рэпрадуктыўную сістэму. У прыватнасці, гаворка ідзе пра дыбутылфталат і дыэтылфталат.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	9.28	16.53	7.25
Віцебск —	9.25	16.35	7.10
Магілёў —	9.18	16.43	7.25
Гомель —	9.06	16.48	7.42
Гродна —	9.42	17.10	7.28
Брэст —	9.34	17.19	7.45

Месяц

Маладзік 24 снежня.
Месяц у сузор'і Вадалея.

Імяніны

Пр. *Калініка, Мікалая, Філімона.*
К. *Жанэты, Максіма, Тодара, Цэзара, Яна.*



Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.



Дзве даты

27 снежня

1836 год — нарадзіўся (г.п. Жалудок, зараз Шчучынскі раён) Валерый Антоній Урублеўскі, адзін з кіраўнікоў паўстання 1863—1864 гадоў на Беларусі, дзеяч міжнароднага рэвалюцыйнага руху. У 1853 годзе скончыў Віленскі дваранскі інстытут, у 1857-м — Пецярбургскі лясны інстытут. У 1861—63 гадах удзельнічаў у стварэнні рэвалюцыйнай арганізацыі ў Гродне, дапамагаў К. Каліноўскаму выпускаць і распаўсюджваць газету «Мужыцкая праўда». У час паўстання — актыўны дзеяч «чырвоных», быў начальнікам штаба інсургентаў, камандуючым паўстанцкімі ўзброенымі сіламі Гродзенскай губерні. У 1864 годзе ў баі быў цяжка паранены, пасля акрыяння эмігрыраваў у Францыю. Там у 1871 годзе ў званні генерала камандаваў паўднёвым фронтам Парыжскай камуны. Пасля яе паражэння завочна быў асуджаны да смерці. Каб пазбегнуць расправы, эміграваў у Лондан, дзе пасябраваў з К. Марксам і Ф. Энгельсам. З восені 1871-га быў членам Генеральнага савета 1-га Інтэрнацыянала, нелегальна прыязджаў у Расію для азнаямлення з народніцкім рэвалюцыйным рухам. Пасля амністыі камунараў вярнуўся ў Францыю. Памёр у 1908 годзе, пахаваны каля сцяны камунараў на парыжскіх могілках Пер-Лашэз.

1929 год — на Усесаюзнай канферэнцыі аграрнікаў-марксістаў Сталін абвясціў пра заканчэнне эпохі НЭПа і пачатак новай эры. Пытанне, па яго словах, стаяла так: «Альбо назад — да капіталізму, альбо наперад — да сацыялізму». На гэтай канферэнцыі Сталін абвясціў лозунг: «Ліквідаваць кулацтва як клас!». Усяго за адзін год у аддаленыя месцы краіны было выслана да трох мільёнаў «кулакоў» з сем'ямі і «падкулачнікамі», частку расстралялі адразу, сотні тысяч адправілі на вынішчэнне ў лагеры. У катэгорыю «падкулачнікаў» залічвалі любога працаўніка, які меў моцную гаспадарку з працы сваёй сям'і.

Цытата дня:

«Калі чалавек ведае меру, ён ведае ўсё».

Томас Карлейль (1795—1881), англійскі публіцыст, гісторык і філосаф.

ДА ЕЛКІ — ПРАЗ КАНТРОЛЬНА-ПРАПУСКНЫ ПУНКТ

19 тысяч супрацоўнікаў органаў унутраных спраў і ваеннаслужачых унутраных войскаў МУС будуць сачыць за грамадскай бяспекай падчас навагодніх і калядных свят.

Паводле звестак упраўлення інфармацыі і грамадскіх сувязяў Міністэрства ўнутраных спраў, у гарадах і буйных населеных пунктах прадугледжана кругласутачная ахова правапарадку на тэрыторыях, дзе ўстаноўлены навагоднія елкі і дзе будуць праводзіцца калядныя і навагоднія кірмашы. Напярэдадні іх агледзяць сапёрна-піратэхнічныя групы ўнутраных войскаў. Месцы масавага святкавання будуць ачэплены мабільнымі турнікетамі з кантрольна-прапускнымі пунктамі для асабістага дагляду з выкарыстаннем ручных і стацыянарных металадэтэктараў. Сюды не будуць дапускацца асобы ў стане ап'янення, з напоямі ў любой тары звыш 0,5 л, са спіртнымі напоямі і іншымі, забароненымі да свабоднага абарачэння прадметамі.

Праводзіцца актыўная работа па выяўленні фактаў незаконнай рэалізацыі піратэхнічных вырабаў, іх канфіскацыя, знішчэнне, а таксама высвятляюцца каналы паступлення ў нашу краіну. Ужо выяўлена звыш 150 выпадкаў нелегальнага абарачэння і выкарыстання піратэхнічных вырабаў, канфіскавана звыш 1 млн адзінак гэтай прадукцыі.

Святлана БАРЫСЕНКА.

Рэпартаж са святочным настроем

НАВАГОДНІЯ ПАДАРУНКІ ПАД ВОДАР... УСХОДНІХ ДУХМЯНАСЦЯЎ

НЯХАЙ бы нарэшце хоць крыху падмарозіла. І нават — няхай бы і сімвалічна — прыснежыла. Каб прырода злітавалася і за некалькі дзён да Новага года ўсё ж зрабіла спробу прывесці ў адпаведнасць надвор'е з каляндарным месяцам. Як бы там ні было, але каб у паветры з'явілася, нарэшце акрэслілася прадчуванне свята. А вось настрой уздымаць — тут толькі на самога сябе спадзявацца трэба.

...Затое як снежны ком — за нейкія лічаныя хвіліны — павялічваўся натоўп перад адкрыццём «Навагодняга кірмашу-2011» у сталічным выставачным цэнтры «Белэкспа» па вуліцы Янкі Купалы, 27. Здаецца, толькі што на ганку было не больш за тузін патэнцыйных наведнікаў, як раптам давялося нават саступіць уніз, каб вызваліць месца для самых нецярплівых, якія імкнуліся загадзя патрапіць бліжэй да ўваходных дзвярэй. Саступіў — і не пашкадаваў. І іншыя павярнуліся, зрабілі некалькі крокаў з прыступак... Пах хвоі! Побач прадаўцы паздымалі ўпакоўку з вялікіх, за два метры, елак і соснаў, і ў ранішнім марозным паветры нарэшце дыхнула святам.

— Колькі каштуюць дрэвы? А асобна галінкі прадаяце? А сасна доўга будзе стаяць, як елка ці не? — пасыпаліся пытанні з усіх бакоў.

Высветлілася, што навагоднія дрэвы такой вышыні прапануюць па цане ад 300 да 400 тысяч. Паўметровае жывое ў кадцы — 80 тысяч. Тут жа пабачыў адмысловую пластыкавую падстаўку-кадку для дрэў. Дыяметр ствала значэння не мае: адным націсканнем рукі спецыяльныя зацiскачкі надзейна замацуюць сасну ці елку. А ў кадку і ваду можна наліваць, каб падоўжыць жыццё дрэву. Кітай, напэўна? Высветлілася, не — мінская вытворчасць! Каштуе параўнальна нядорага — 180 тысяч.

...Гірлянды, мішура, шарыкі для навагодніх дрэў на выставе-кірмашы не выклікаюць асаблівых пачуццяў: звычайны, не самы шыкоўны выбар, ды і цэны практычна такія ж, як і па горадзе. Хочацца — не-ча-га! Вось, напрыклад, арыгінальнае ўпрыгажэнне-сувенір, ручная работа. Сапраўдная бутэлька шампанскага, абгорнутая ў залатую фольгу і дэкараваная ў зімовым стылі шышкамі, галінкамі, сняжынкамі, стужкамі. Паверце, прыгожа.

— А як жа піць з такой бутэлькі? Шкада нават адкаркоўваць будзе? — пытаюся ў майстроў-прадаўцоў.

— А можна і не піць менавіта з гэтай, а купіць у краме звычайную, — слушна заўважаюць тыя. — А нашу пакінуць у якасці ўпрыгажэння. Ці вельмі акуратна адкаркаваць, выпіць шампанскае за святочным сталом, а потым уставіць у рыльца бутэлькі свечку і запаліць яе — атрымаецца вельмі прыгожы падсвечнік.

Цана пытання — 150 тысяч рублёў. Прыкладна за такую ж суму можна набыць навагоднюю ёлачку сантыметраў на 40 з... пафарбаванага ў чырвоны колер пер'я. Глядзіцца такая навагодняя «краcуня» незвычайна. Дарэчы, з якіх толькі натуральных матэрыялаў не вырабляюць навагоднія дрэўцы нашы майстры-фларысты!

І з танюткіх сухіх доўгіх галінак, і з аднолькавых невялікіх драўляных кавалачкаў, складзеных «пірамідкай», і з сухога сена, упрыгожанага сапраўднымі, нарэзанымі скрылікамі... апельсінамі! Апошнія выглядаюць, як яркія навагоднія шары. Падобныя вырабы — ад 120-140 тысяч рублёў. Зрэшты, можна знайсці на выставе-кірмашы і зусім недарагія ўпрыгажэнні, напрыклад, пафарбаваныя ў серабрысты ці залацісты колер шышкі сасны. Штучка — дзве тысячы. Упрыгожаная такім чынам ёлка — хоць штучная, хоць натуральная — выглядае вельмі адмыслова. Хто зацікавіўся — дам параду на наступны год. Будзеце летам у лесе, назбірайце добры пакет сасновых (падыходзяць і з елкі, але яны больш крохкія) шышак, прасушыце іх добра, пасадзіце ў тарэц на клей металічную пяцельку. А потым папырскайце фарбай з балончыка. Колер можа быць які заўгодна. За грошы, аддадзеныя за той балончык, атрымаеце такую колькасць зробленых сваімі рукамі ёлачных упрыгажэнняў, што і сабе хопіць, і ў падарункі сябрам і знаёмым.

...А зараз адкрыю «страшэнную» тайну, натуральна, для непаінфармаваных. Тое, што для многіх з'яўляецца выставай «Навагодні кірмаш», для другіх выключна — «Таварамі з Індыі». Пагалоска пра яе (вядома, найперш сярод жанчын) ходзіць цягам года. Так, ужо не першы год тавары з Індыі прадаюцца ў гэты час побач са святочным асартыментам, экспазіцыя іх даволі вялікая, хоць, на мой погляд, і крыху аднастайная.

— Як усё дорага! — усклікае адна кабета сталага веку. А іншая побач моўчкі і з задавальненнем «нырае» ў гэтыя бясконцыя і неабсяжныя «залежы» тканін, адзення, упрыгажэнняў... Дорага — гэта гледзячы што і з чым параўноўваць: з мінулым годам, з цяперашнімі цэнамі, натуральнае са штучным?.. Аднак у любым выпадку ахвотных набыць нешта каларытнае хапае.

— Майце на ўвазе, гэтыя халацікі, па-першае, з віскозы, па-другое, гэта псеўдаіндыйскі стыль, самі яны такога не носяць, — шчыра папярэджваюць нашы дзяўчаты-прадаўцы. — Кароткі каштуе 80 тысяч, доўгі — 100 тысяч рублёў.

Але моладзь, а часам і людзі старэйшага ўзросту мала звяртаюць увагі на такія папярэджанні: танна, быццам бы арыгінальна. Напрыклад, шалікі бяруць не па адным, а па некалькі адразу — па 20-50 тысяч рублёў за штуку. Як той казаў, і сабе, і каму ў падарунак будзе. Шмат наведніц цікавяцца проста ўсходнімі тканінамі, вядома, не абыходзяць стэнды з ювелірнымі ўпрыгажэннямі. Цікавыя драўляныя вырабы — разныя шкатулкі розных памераў, аздобленыя металічнымі ўпрыгажэннямі, вялікія куфры, этажэркі, столікі, падносы... Да прыкладу, сярэдніх памераў шкатулку ў прадаўцоў-індусаў можна набыць за 50-70 тысяч рублёў.

Многія з дзяцінства памятаюць пра чай «са сланом». Напэўна, ён так і застаўся для некаторых самым смачным. Скажам, я дагэтуль памятаю водар кавы з Індыі, дастаць якую некалі было цяжка. Каемся, нават падысці да вітрын са спецыямі, чаем, кавай не атрымалася: велізарная чарга стаяла тут літаральна праз пяць хвілін пасля адкрыцця выставы-кірмашу. Прыкладна такая ж гісторыя была з намі і ў мінулы раз...

...Уся гэта дзея адбываецца пад індыйскую ж музыку, пад водар усходніх духмяных рэчываў, якія тут жа і прадаюцца. Нешта паміж сабой абмяркоўваюць важныя барадатыя індусы ў сваіх нацыянальных галаўных уборах. Людская плынь нясе цябе, здаецца, па-за тваёй воляй... Мільгаюць твары, стракацяць яркія фарбы адзення, казычуць нос нязвыклыя пахі... На нейкі момант ты ўяўляеш сябе пакупніком на далёкім усходнім базары. І толькі зрабіўшы крок за парог выставачнага павільёна, уцягнуўшы поўнымі грудзьмі марознае паветра з водарам хвоі, нібы пакідаеш казку і прачынаешся — ты дома, а праз тыдзень Новы год!

...Ахвотныя калі не купіць нешта для сябе, для родных, а проста акунуцца ў своеасаблівую атмасферу выставы «Навагодні кірмаш» (пра «Тавары з Індыі» прамаўчу) змогуць зрабіць гэта па 31 снежня ўключна (у апошні дзень выстава будзе працаваць да 14 гадзін, ва ўсе іншыя — з 11 да 20 гадзін). Уваход — вольны.

Сяргей РАСОЛЬКА.
Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Усміхнемся

Настаўнік фізкультуры — вучням:

— Як на ўрок, дык формы ў вас няма! А як па раёне хадзіць, дык усё ў «Адзідасе»!

☺

Важнае для сябе і сваёй жонкі адкрыццё зрабіў грамадзянін Іваноў. Ён заўважыў, што праца — жаночага роду, а адпачынак — мужчынскага.

☺

— Лёха, пойдзеш з намі гуляць?

— Не, я за падручнікі сеў!

— Чаго так?

— Ды з'ездзіў да брата на прысягу і вырашыў усе «хвасты» ва «ўніверы» хутчэй здаць.

☺

А Бязрукаў у курсе, што можна адмаўляцца ад роляў?..

☺

У заапарку:

— Тата, глядзі, якая страшная малпа сядзіць!

— Малайчына, сынок, добра, што нагадаў. Бабуля прасіла на абед не спазняцца.

☺

Сёння знаёмства з новымі суседзямі пачынаецца з фразы: «Вы што там, зусім звар'яцелі?»

Усходні гараскоп на тыдзень

Львам лепш не прымаць паспешлівых рашэнняў, а Дзевы павінны быць гатовыя ўзяцца за тэрміновую працу

ВАЕН. У гэтага тыдня шмат неспадзяванак у запасе, і на хвалі шанцавання трэба выбіраць самае карыснае. У аўторак спрэчкі дазваляйце сабе толькі па справе. Ёсць небяспека «спатыкнуцца» на фінансавым пытанні. У суботу ёсць шанц з кімсьці пазнаёміцца.

ЦЯЛЕЦ. Высокія энергіі павялічаць не толькі поспех, але і аварыйнасць. У аўторак хтосьці з партнёраў можа праявіць недарэчную стараннасць. Захоўвайце ў тайне справы, якія нікога, акрамя вас, не датычацца. У чацвер навіны, якія атрымаеце ад начальства або бацькоў, не спяшайцеся прымаць як праграму да дзеяння. Усё яшчэ зменіцца.

БЛІЗНЯТЫ. Пачатак тыдня будзе адзначаны канфліктамі паміж старэйшым і малодшым пакаленнямі. Кагосьці «дастане» начальства, кагосьці — нядбайныя падначаленыя. З серады крызіс перажывуць асабістыя адносіны. Гэты ж час пацешыць новымі знаёмствамі, лёгкім фліртам і іншымі прыемнымі сюрпрызамі.

РАК. Гэты тыдзень — самы дынамічны ў снежні. Вам удасца перарабіць шмат перадnавагодніх спраў, але пакідайце запас часу для неспадзяваных падзей. Энергію расходуйце на хатнія генеральныя прыборкі, але ўстрымлівайцеся ў ацэнках, калі хтосьці менш паваротлівы, чым вы. Маладая прыгожая жанчына можа перайсці вам дарогу.

ЛЕЎ. Да суботы трэба падчысціць усе «хвасты», завяршыць максімальна большую колькасць спраў, падвесці вынікі і прыйсці да канчатковых дамоўленасцяў з партнёрамі. Ключавыя дні тыдня — чацвер і пятніца. Будзьце асцярожныя, нават калі вам неверагодна шанцуе. Шчасце і поспех не там, дзе лёгка, і не там, дзе вы іх чакаеце. Беражыцеся памылковых дыягназаў і паспешлівых рашэнняў.

ДЗЕВА. Да суботы кіньце ўсе сілы на навядзенне парадку. Здайце справы і аплаціце рахункі. Нічога не плануйце на чацвер і пятніцу, займайцеся цякучкай, але будзьце гатовыя ўзяцца за тэрміновую працу. Не паддавайцеся на правакацыі, калі вас паспрабуюць уцягнуць у канфлікт, не ляскайце дзвярамі і не пакідайце апошняе слова за сабой. З суботы выявяцца новыя факты, тлумачэнні, адбудуцца прымірэнні.

ШАЛІ. Вам трэба рыхтавацца да вялікіх змен, навін, сустрэч і адкрыццяў, якія вы зробіце ў дачыненні да некаторых людзей. Нечаканыя перастаноўкі могуць развесці «па розных лагерах» сяброў і калег. Будзьце асабліва ўважлівыя ў аўторак і сераду. Што б ні адбывалася, не спяшайцеся змяняць свае рашэнні і хутка згаджацца на прывабныя рэчы.

СКАРПІЁН. Струмень падзей прыкметна ўшчыльніцца. Вы будзеце выключна запатрабаваныя. Не дайце сябе раззлаваць «тузінінай» па дробязях, калі ў вас і без таго досыць працы. Свае адмовы спакойна аргументуйце. Магчымыя вялікія перажыванні з нагоды фінансаў, затрымкі выплат, расходаў і «неразумных» рашэнняў партнёра. У суботу вас чакаюць цікавыя навіны, сустрэчы, зносіны.

СТРАЛЕЦ. Тыдзень абяцае быць цікавым, але давядзецца ўвесь час быць напагатове, каб на хвалі вялікага шанцавання не спатыкнуцца, не наабяцаць лішняга і не пагадзіцца занадта хутка на тое, што не вельмі і трэба. Можа пашанцаваць у каханні, але вясёлкавыя ілюзіі праз нейкі час лопнуць, як мыльная бурбалка. Чым больш складаныя задачы ставіць жыццё, тым большая верагоднасць, што вы на парозе вялікіх змен і навін. Што атрымаецца лепш за ўсё, дык гэта «разрульванне» праблем.

КАЗЯРОГ. На працягу тыдня вас чакаюць змены, якія перасягнуць усе прагнозы і чаканні. Да канца тыдня карысна падвесці рысу пад справамі адыходзячага года, аформіць і здаць або перадаць, каб расчысціць сабе поле для новых дзеянняў. Чацвер і пятніца адкрыюць вам вочы на расстаноўку сіл у вашым асяроддзі. Па-новаму могуць праявіцца ворагі і сябры. Добра ў такі час прымаць важныя рашэнні.

ВАДАЛЕЙ. Галоўная задача тыдня — утрымацца на дасягнутых пазіцыях, ні з кім не пасварыцца і не захварэць. Давядзецца жыць і працаваць пад вялікім напружаннем і, магчыма, ціскам з боку розных людзей і акалічнасцяў, шмат у чым нечаканых. У сераду каханне зайграе новымі гранямі. У чацвер ёсць вялікая верагоднасць падману, спробы выкарыстаць або падставіць вас.

РЫБЫ. Аспекты гэтага тыдня абудзяць ваш творчы патэнцыял, але прадвесцяць узрушэнні і сваркі ў найбліжэйшым асяроддзі. Узгадняйце планы з тымі, каго яны датычацца. Начальству без неабходнасці на вочы лепш не трапляцца, інакш не абмінуць дадатковай працы. З суботы з'явіцца падстава для больш частых і цікавых кантактаў з сябрамі або калегамі.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, В. ПАЗНЯКОЎ.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: rek@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год. Тыраж 33.380. Індэкс 63850. Зак. № 6156. Нумар падпісаны ў 19.30 26 снежня 2011 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12